Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 252 (28110) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# УСЁ Ў НАС АТРЫМАЕЦЦА!



Маленькія жыхары сталіцы Аліна і Раман ЯСКЕВІЧЫ і Аляксей і Ксенія СЦЕПАНОВІЧЫ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здаецца, зусім нядаўна адзначалі надыход 2015-га, а вось ён ужо прамчаўся, стрыножыў коней і чакае толькі, каб перадаць эстафету маладому 2016-му ды застацца ў гісторыі. А там, у гісторыі (прынамсі нашай краіны) яму знойдзецца вартае месца. Бо быў ён багаты на падзеі ў жыцці Беларусі — і ў плане міжнародных стасункаў, і ва ўнутраных, нашых справах. Быў ён няпросты — крызіс у суседзяў адгукнуўся і ў нас. Але, насычаны падзеямі, праблемамі, пошукамі шляхоў іх вырашэння, 2015-ты насамрэч быў у многім паказальны перш за ўсё для нас саміх. Мы адчулі і асэнсавалі, што жыць у спакойнай краіне — гэта сапраўднае вялікае шчасце; мы ўбачылі, што ўласнай Радзімай, якая годна выглядае на міжнароднай арэне і мае свой адметны голас, які чуюць і да якога прыслухоўваюцца, можна ганарыцца; мы зразумелі, што разам, згуртаваўшыся і падтрымліваючы адзін аднаго, рэальна пераадолець любыя цяжкасці. За гэта трэба сказаць дзякуй няпростаму 2015-му, бо ў ім мы сталі мудрэйшымі і мацнейшымі, навучыліся адрозніваць і цаніць сапраўды важнае ў жыцці.

З гэтым каштоўным набыткам мы сустракаем 2016-ты, які таксама будзе няпростым. Але ж — несумненна — і цікавым, і насычаным новымі падзеямі і ўражаннямі. Будзем гуляць вяселлі, адпраўляць дзяцей у школу, сеяць збожжа, збіраць ураджай. Засынаць з упэўненасцю, што заўтра будзе; прачынацца з перакананасцю, што новы дзень — добры. І ў нас абавязкова ўсё атрымаецца — пражытыя людзьмі сотні, тысячы гадоў сведчаць, што менавіта так бывае з тымі, хто верыць у сябе і сваю зямлю.

А сваім чытачам у новым годзе мы абяцаем, што наперадзе ў нас шмат цікавых сустрэч і шчырых размоў, добрых навін і сумеснай творчасці. Дзякуй, што засталіся разам з намі і ў 2016-м. Няхай для кожнага з вас ён стане годам здароўя, натхнення і добрых набыткаў!

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18569,00 | ▲ |
| Еўра | 20300,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 255,33 | ▼ |
| Укр. грыўня | 775,32 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# САМЫЯ ГАЛОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## У краіне ніколі не будуць эканоміць на маці і дзецях, гарантаваў Прэзідэнт

**Сфера аховы здароўя ў Беларусі служыць прыкладам правільнага рэфармавання і мадэрнізацыі. Пра гэта заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання новага радзільнага дома 5-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.**



Фота БЕЛТА.

Гэты раддом, аснашчаны самым сучасным абсталяваннем, з'яўляецца прыкладам таго, як дзяржава клапоціцца пра будучыню краіны, адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі заўсёды былі добрыя ўрачы і дастойныя ўстановы аховы здароўя, а да гэтага часу ўдалося вырашыць праблему з іх абсталяваннем. Укладанні ў медыцыну далі пазітыўныя вынікі. Так, узровень дзіцячай смяротнасці ў Беларусі за 10 гадоў знізіўся ў 2,5 раза і па выніках гэтага года склаў 3 праміле, за бягучую пяцігодку зарэгістраваны адзін выпадак смерці парадзіхі па акушэрскіх прычынах.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такія станоўчыя вынікі работы — гэта сапраўдная перамога, і даручыў заахвоціць тых, чыімі заслугамі яна дасягнутая. Гэта галоўнае, якімі б важнымі ні былі вытворчыя паказчыкі, лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з абсталяваннем радзільні 5-й гарадской клінічнай бальніцы, пабываў у яе падраздзяленнях, пагутарыў з медыцынскім персаналам і пацыенткамі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Прэзідэнт цёпла павіншаваў жанчын, якія сталі мамамі ў гэтыя перадсвяточныя дні, уручыў ім навагоднія падарункі.

Затым Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні прадстаўнікоў СМІ. Так, кажучы аб сацыяльнай палітыцы дзяржавы, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі і надалей будуць падстаўляць плячо тым, хто мае патрэбу, знаходзіць для іх любыя рэсурсы. Як бы ні было цяжка, у краіне ніколі не будуць эканоміць на маці і дзецях, гарантаваў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне пра самыя важныя падзеі адыходзячага года, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такім стала 70-годдзе Вялікай Перамогі. Менавіта яна служыць падмуркам міралюбівай беларускай палітыкі. На міжнароднай арэне няма іншай дзяржавы, настолькі прыхільнай міру, як Беларусь. Невыпадкова сёлета ў лексіконе сусветнай дыпламатыі з'явіліся такія паняцці, як мінскія мірныя дамоўленасці, хоць, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, беларускі бок не імкнецца перабольшваць сваю ролю ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне.

Перамовы ў Мінску сталі важнай падзеяй, найперш для Украіны, а таксама для Расіі, кантынента ў цэлым. Да ўсяго гэта стала падставай для Захаду прыпыніць антыбеларускія санкцыі. Заходнія палітыкі скарысталіся выпадкам, каб адысці ад канфрантацыі з Беларуссю, выказаў думку кіраўнік дзяржавы.

У час размовы з прэсай Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму рэформаў і чарговы раз перасцярог ад неабдуманых крокаў. Прэзідэнт нагадаў, што на гэтым сённяшнія настойваюць тыя, каму патрэбны развал, мітусня, бязладзіца. «Тады можна і да ўлады прыйсці, тады можна павярнуць краіну ў іншы бок. Гэтага не будзе. Краіна будзе ісці ў тым напрамку, у якім лічаць патрэбным, каб яна ішла, беларускі людзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адказаў таксама на асабістыя пытанні. Напрыклад, журналісты цікавіліся яго хобі — вырошчваннем гародніны і садавіны на тэрыторыі рэзідэнцыі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ён займаецца гэтым не дзеля піяру: большая частка ўраджаю перадаецца затым у дзіцячыя дамы, інтэрнаты для састарэлых.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што напярэдадні Каляд і Новага года ў краіне па традыцыі праходзіць рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Прэзідэнт лічыць важным, што да яе далучыліся не толькі чыноўнікі, але і шмат бізнесменаў, якія наведваюць з падарункамі дзіцячыя дамы, школы, інтэрнаты. Акцыю падтрымала ўся краіна, як і павінна быць у сучаснай дзяржаве, якой не страшныя ніякія крызісы, перакананы Прэзідэнт.

# ХАКЕЙ НА СВЯТА

## Лядовыя дружыны з васьмі краін возьмуць удзел у XII Калядным турніры

**Міжнародныя спаборніцтвы аматараў хакея на прыз Прэзідэнта пройдуць з 4 па 7 студзеня, усе паядынкі гэтым разам адбудуцца на лёдзе мінскай «Чыжоўка-Арэны».**

Каманды з групы А — гэта Беларусь, Славакія, Швейцарыя, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — згуляюць на галоўнай пляцоўцы, а матчы хакеістаў дружын, якія трапілі ў групу B (Расія, Фінляндыя, Германія, Швецыя), пройдуць на малой пляцоўцы.

Згодна з рэгламентам турніру, у заключны дзень, 7 студзеня, каманды, якія занялі ў сваіх групах другія месцы, сустрэнуцца ў матчы за бронзавыя ўзнагароды (пачатак у 13.00), пераможцы будуць змагацца ў вырашальным паядынку за галоўны прыз (пачатак у 19.00). Абодва матчы пройдуць на галоўнай пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны».

Адзначым, што ўсе ахвотныя змогуць наведаць гульні Каляднага хакейнага турніру бясплатна.

У мінулыя гады пераможцам спаборніцтваў восем разоў становілася каманда Прэзідэнта Беларусі (2005, 2006, 2008, 2009, 2010, 2012, 2013, 2014). Тройчы поспех святкавалі хакеісты з Расіі (2007, 2011, 2015). Нагадаем, на леташнім турніры ў вырашальным матчы менавіта расіяне перамаглі гаспадароў з лікам 2:0, бронзавыя ўзнагароды атрымала каманда Фінляндыі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*




■ Нашы дзеці

# АЎТОБУС У ПАДАРУНАК

**У гэтыя пераднавагоднія дні кіраўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, прадстаўнікі бізнесу працягваюць віншаваць дзяцей, якім найбольш патрэбна наша ўвага. Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА наведаў Бягомльскую дапаможную школу-інтэрнат.**



Фота БЕЛТА.

«Галоўная мэта акцыі — падтрымаць дзяцей, — кажа дэпутат. — У нас у асноўным законе краіны напісана, што кожны мае права на шчаслівае дзяцінства, незалежна ад таго, расце ён у роднай сям'і ці ў сілу нейкіх абставін трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю. Наша дзяржава клапоціцца аб грамадзянах і робіць усё для таго, каб дзеці не гублялі веру ў дабро і людзей».

Да выхаванцаў інтэрната таксама прыехалі прадстаўнікі райвыканкама, Беларусбанка, Федэрацыі прафсаюзаў. Малеча атрымала салодкія падарункі, а ў школе цяпер з'явіліся новыя спартыўныя трэнажоры, пральныя машыны і прасы.

Да малых з Цэнтра карэкцыйна-развіваючай адукацыі і рэабілітацыі ў Маладзечне завітаў **намеснік старшыні Вярхоўнага Суда Валерый КАЛІНКОВІЧ.** Трэба сказаць, што судовая сістэма ўжо адзінаццаць гадоў апякуецца над гэтай установай. Сёлета ў цэнтр прывезлі камфортную мэблю. Валерый Калінковіч падзякаваў педагогам, якія займаюцца з асаблівымі дзецьмі.

— Мы ж са свайго боку гатовы аказваць пасільную дапамогу і падтрымку. І не толькі ў Новы год, — запэўніў ён.

**Міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ** павіншаваў выхаванцаў Беразкоўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы (Докшыцкі раён). У падарунак ведамства набыло для ўстановы мікрааўтобус «Газель». «Транспарт дапаможа дзецям быць больш мабільнымі, — адзначыў міністр юстыцыі. — Яны змогуць ездзіць на творчыя конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы, больш актыўна рэалізоўваць свой патэнцыял». Падарункі да свята для малых падрыхтавала і раённая ўлада — дзецям перадалі сертыфікат на набыццё спартыўнага інвентару.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ У прыярытэце

# ПАДТРЫМКА МАЛАДЫХ — І НАДАЛЕЙ

**Апошнім акордам Года моладзі стане першае ў гісторыі абвяшчэнне маладзёжнай сталіцы краіны.**

Як зазначыў у сваім выступленні **першы сакратар БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**, практычна ўсе мерапрыемствы, якія праходзілі сёлета, знойдуць свой працяг і ў будучым годзе. «Падводзячы вынікі, трэба сказаць, што гэта быў год магчымасцяў для маладых, — зазначыў ён. — Дзяржава прадаставіла ўсе ўмовы — калі ласка, стварайце, самарэалізоўвайцеся! І моладзь была вельмі актыўнай, гэта не можа не радаваць. Наша праца, я ўпэўнены, прынясе свае вынікі не толькі цяпер, але і ў будучыні».

Так, конкурс «100 ідэй для Беларусі» ў наступным красавіку пройдзе ў новым фармаце — «100 ідэй для СНД». Як расказала яго каардынатарка, **старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ Алеся ВІННІК**, многія з распрацовак юных вынаходнікаў ужо ўкараняюцца ў нашым жыцці: напрыклад, асфальта-бетоннае пакрыццё, створанае адным з канкурсантаў, выкарыстоўвалася на праспектах Незалежнасці і Дзяржынскага ў сталіцы. Фінансаванне самых перспектыўных распрацовак уключана ў дзяржаўныя праграмы, а іх аўтары штогод будуць атрымліваць сумарна каля 300 мільёнаў рублёў на працяг працы над праектамі.

Год моладзі падышоў да свайго завяршэння, але яшчэ адна інтрыга застаецца нераскрытай. У апошнія дні 2015-га ўпершыню будзе аб'яўлена маладзёжная сталіца Беларусі — налета яна стане цэнтрам самых знакавых маладзёжных мерапрыемстваў. Сярод крытэрыяў — колькасць моладзі, якая пражывае ў горадзе, наяўнасць інфраструктуры, паспяховая рэалізацыя маладзёжных праектаў і ініцыятыў і іншыя. Як распавяла Наталля Пшанічная, званне стане пераходным і будзе прысвойвацца штогод.



**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# НА АХОВЕ ПРАВАПАРАДКУ

## Навагодняя ноч павінна прайсці спакойна

**Асаблівую ўвагу ГУУС Мінгарвыканкама надае забеспячэнню правапарадку пры правядзенні святочных мерапрыемстваў у навагоднюю ноч. Намаганні праваахоўнікаў будуць сканцэнтраваны на месцах масавых гулянняў і на прылеглых да іх тэрыторыях.**

У навагоднюю ноч святочныя масавыя мерапрыемствы пройдуць на 25 розных пляцоўках ва ўсіх раёнах сталіцы. Пры гэтым асноўныя гулянні разгорнуцца каля Палаца спорту і шматфункцыянальнага комплексу «Чыжоўка-Арэна». Плануецца, што тут будуць устаноўлены мабільныя турнікеты, а праход будзе ажыццяўляцца праз кантрольна-прапускныя пункты са звыклай працэдурай асабістага дагляду з выкарыстаннем ручных і стацыянарных металадэтэктараў. Пад пільнай увагай вартавых парадку таксама будзе Востраў мужнасці і смутку, дзе з 1.30 да 1.45 адбудзецца святочны навагодні феерверк. Разам з тым, у выпадках вялікай колькасці людзей, не выключана магчымасць выстаўлення мабільных турнікетаў і на іншых святочных пляцоўках.

Праваахоўнікі нагадваюць, што ў месцы, якія ахоўваюцца, не будуць дапускацца грамадзяне ў стане алкагольнага ап'янення, а таксама будзе забаронена праносіць з сабой спіртныя напоі, піва, іншыя напоі і вадкасці (выключэнне складаюць вада і напіткі ў празрыстай тары аб'ёмам не больш за 0,5 літра). Не пусцяць таксама з прадметамі, якімі можна прычыніць шкоду або цялесныя пашкоджанні навакольным, выбуханебяспечнымі і іншымі рэчывамі і сродкамі, забароненымі да свабоднага доступу, а таксама з жывёламі. Асабліва варта падкрэсліць, што абмежаванні распаўсюджваюцца і на піратэхнічныя вырабы (петарды, ракеты, феерверкі). За незаконнае выкарыстанне піратэхнікі прадугледжана адміністрацыйная адказнасць ад штрафных санкцый да адміністрацыйнага арышту.

У мэтах забеспячэння дарожнай бяспекі на вулічна-дарожнай сетцы, прылеглай да месцаў масавых гулянняў, магчымыя часовыя абмежаванні руху транспарту. Таксама тут інспектары ўзмоцняць кантроль за выкананнем правілаў прыпынку і стаянкі, будуць працаваць эвакуатары.



**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Памятныя манеты

# «ШЛЯХ СКАРЫНЫ», «ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ», «КІТАЙСКІ КАЛЯНДАР» І ІНШЫЯ

## Налета Нацыянальны банк краіны запланаваў выпусціць у абарачэнне 13 найменняў памятных манет

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Нацбанка, стала ўжо традыцыяй выпускаць памятныя манеты, прысвечаныя птушцы года, якую вызначае грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны». У наступным годзе такой птушкай будзе гогаль звычайны. Напярэдадні 2017-га ў працяг серыі «Кітайскі каляндар» будзе выпушчана памятная манета «Год Пеўня».**

У 2017 годзе ў Беларусі будзе шырока адзначацца 500-годдзе выхаду Біблії Францыска Скарыны. Напярэдадні гэтай падзеі Нацыянальны банк працягне выпуск памятных манет серыі «Шлях Скарыны». У 2016 годзе плануецца выпусціць у абарачэнне тры манеты: «Шлях Скарыны. Кракаў», «Шлях Скарыны. Падуя» і «Шлях Скарыны. Венецыя». У 2017 годзе ўбачаць свет памятныя манеты: «Шлях Скарыны. Вільня» і «Шлях Скарыны. Прага».

Таксама налета працягнецца і серыя «Адроджаныя расліны» выпускам памятных манет «Надбароднік бязлісты». Гэтыя манеты выпускаюцца ў межах праекта ПРААН па захаванні і адраджэнні зніклых раслін. Вялікай папулярнасцю карыстаецца серыя памятных манет «Помнікі архітэктуры Беларусі». У рамках гэтай серыі чакаецца выпуск манеты «Троіцкі касцёл са званіцай. Чарнаўчыцы». Троіцкі касцёл — унікальны помнік беларускай архітэктуры позняй готыкі і рэнесансу з выразнымі рысамі абарончага дойлідства Сярэднявечча.

Паводле вынікаў праведзенага ў Нацыянальным банку адкрытага рэспубліканскага конкурсу дзіцячага малюнка «Дзеці малююць манеты», у 2016 годзе адкрыецца новая серыя памятных манет «Свет вачыма дзяцей», у рамках якой на працягу шэрагу гадоў штогод плануецца выпускаць манеты з выкарыстаннем малюнкаў — пераможцаў конкурсу.

Працягнецца серыя памятных манет «Жыцце святых Праваслаўнай Царквы» памятнай манетай «Прападобны Серафім, Сароўскі цудатворца».

З улікам папулярнасці і цікавасці да манет спартыўнай тэматыкі як з боку нашых грамадзян, так і замежных нумізматаў, у пералік на 2016 год уключаны памятныя манеты: «Чэмпіянат свету па біятлоне 2016 года. Осла», «Алімпійскія гульні 2016 года. Веславанне на байдарках і каноэ», «Алімпійскі рух Рэспублікі Беларусь».

У прэс-службе нацыянальнага фінансавага рэгулятара паведамілі, што з першых дзён ліпеня (у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2015 г №450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь») у зварот будуць знаходзіцца манеты наміналамі 1, 2, 5, 10, 20 і 50 капеек і 1 і 2 рублі. У сувязі з гэтым Нацбанк плануе ў 2016 годзе выпусціць у абарачэнне камплекты памятных манет «Мая краіна — Беларусь», якія складаюцца з манет названых наміналаў, але палепшанай якасці чаканкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ На свята — як на працу

# КОЛЬКІ ЗАРАБЛЯЕ ДЗЕД МАРОЗ?

**Пакуль усе святкуюць Новы год у кампаніі сяброў ці тэлевізара і аліўе, яны працуюць у дзве змены. Дзяды Маразы ездзяць па дамах і рэстаранах і віншуюць тых, хто верыць у казку. Працоўны сезон галоўнага навагодняга героя невялікі — літаральна два з паловай тыдні. Але, па нашых падліках, даволі прыбытковы.**

### «ВЯРНІЦЕ САЛІСТА ГУРТА «М-БЭНД»

Сёлета попыт на Дзядоў Маразоў крыху знізіўся.

— У параўнанні з мінулым годам заказаў стала менш на 20 працэнтаў, — падлічвае **Уладзімір СТЭЛЬМАХ, дырэктар парка актыўнага адпачынку.** — Хаця, ведаю, у многіх фірмаў значна ўпалі продажы. Залежыць ад кліенцкай базы. Калі яна напрацавана, плюс добрыя інструменты рэкламы, то сітуацыя стабільная.

Уладзімір прызнаецца, што людзі стараюцца эканоміць. Некаторыя тэлефануюць і адмяняюць заказ, бо знайшлі прапанову, на 10 тысяч таннейшую.

Тое, што запрашаць на свята навагодніх персанажаў не спяшаюцца, пацвярджае і **«Дзед Мароз» Аляксандр ЛАПУНОЎ:**

— Сёлета, калі шчыра, сціпленька. Летась наш графік напалову быў забіты ўжо ў канцы лістапада. Цяпер усе асцярожнічаюць. Некаторыя заказы на карпаратывы адмяняюць.

Новыя правілы адносна ранішнікаў (нагадаем, што, згодна з імі, кандыдатуру Дзеда Мароза трэба ўзгадняць з кіраўніцтвам установы ці апякунскім саветам) таксама адбіліся на папулярнасці паслуг казачнага персанажа. У адным з івент-агенцтваў прызнаюцца, што пасля ўвядзення гэтых патрабаванняў колькасць заказаў у дзіцячыя садкі знізілася ў сярэднім на траціну. Праўда, гэты спад звязаны не толькі з жорсткім цэнзам адміністрацыі. Некаторыя аніматары самі баяцца лезці ў гэтую галіну: маўляў, незразумела, да каго ісці, з кім дамаўляцца.

Большасць заказаў традыцыйна складаюць візіты на дом да дзяцей. Малыя, кажа аніматар Аляксандр, — самая шчырая, але і самая патрабавальная публіка. «Будуць да апошняга разглядаць Дзядулю Мароза, каб лішняга нічога не зрабіў. Ёсць дзеці, да якіх мы пастаянна ходзім. Але былі выпадкі, калі мы ў нейкі год не маглі іх павіншаваць і бацькі выклікалі іншага Дзеда Мароза. Казалі: малыя не паверылі, што той сапраўдны».

Дзеці, адзначаюць аніматары, мяняюцца. Цяперашнія менш вераць у Дзеда Мароза, просяць падарункі іншага ўзроўню. Раней марылі пра звычайную цацку (мядзведзіка, зайчыка, машынку), а сёння чакаюць снегу і перадавых тэхналогій.

— Быў выпадак, калі малое ў два гады хацела планшэт, і бацькі купілі яму, — прыгадвае Уладзімір Стэльмах. — Дораць не проста смартфоны, а дарагія, апошняй мадэлі. І гэта дзецям да шасці гадоў!

**Каб атрымаць сярэднюю заработную плату па рэспубліцы (за лістапад яна склала 6,7 мільёна), аніматару з барадой трэба павіншаваць прыкладна 20 дзяцей. Ці адпрацаваць чатыры карпаратывы.**

Некаторыя просяць нематэрыяльных падарункаў. Хочуць здароўя ў сям'і, каб мама з татам не сварыліся. Бываюць і дзіўныя пажаданні. Так, аніматар Аляксандр, які завёў у сацыяльных сетках старонку Дзеда Мароза, атрымлівае анлайн-ліст з просьбай вярнуць саліста ў гурт «М-Бэнд».

### ПРЫБЫТАК У 25 МІЛЬЁНАЎ



Расцэнкі ў Дзядоў Маразоў наступныя. За выезд на дом да дзяцей і экспрэс-віншаванне (каля 15 хвілін) да 24 снежня аніматары бралі ў сярэднім па 300 тысяч. Хто паспеў заказаць візіт навагодняга персанажа да 30 снежня, плаціў 360-400 тысяч. Сёння, 31-га, паслугі Дзеда Мароза даражэюць літаральна з кожнай гадзінай. Калі да шасці вечара дзядуля можа заехаць на 15 хвілін і павіншаваць ваша дзіця прыкладна за 450 тысяч, то пасля такі госць абыдзецца ўжо ў тысяч 800. Хочаце больш доўгую праграму? Рыхтуйце на 100-200 тысяч больш.

— Усе хочуць экспрэс-віншаванне, — кажа Уладзімір. — Каб Дзед Мароз правёў літаральна дзве гульні, уручыў падарунак і пайшоў. Дзіцяці гэты персанаж у працэнтах 95 цікавы да таго моманту, пакуль ён падарунак не аддаў. Потым ужо бацькі завуць малое, каб хаця б развіталася для прыстойнасці.

Прысутнасць казачнага героя на ранішніку будзе каштаваць прыкладна 700 тысяч рублёў. Выступленне на карпаратыве — амаль у два разы даражэйшае: за паўгадзіны такі вядучы возьме паўтара мільёна.

Колькі ж зарабляе Дзед Мароз за сезон?

— Самі артысты атрымліваюць каля шасці мільёнаў, максімум дзесяць, — адказвае Уладзімір. — Усё залежыць ад абаротаў. Ёсць яшчэ шэраг выдаткаў: паліва, арэнда аўтамабіля, падаткі, рэклама. У многіх артыстаў нічога няма. Закупляеш пад іх асобна касцюм (футра, валёнкі, посах). У сярэднім убор Дзеда Мароза каштуе каля 2,5 мільёна.

А які прыбытак у аніматараў, што працуюць без пасярэднікаў, выключна на сябе? Мы паспрабавалі падлічыць. Сезон у Дзядоў Маразоў пачынаецца з сярэдзіне снежня і доўжыцца да 1 студзеня. Адзінкавыя заказы могуць быць яшчэ 7-8 студзеня. У звычайныя дні акцёры выязджаюць на два-тры віншаванні. У ажыятажныя (гэта 30 і 31 снежня) набіраецца 10-15 заказаў. Пачынаючы з дзевяці раніцы і да самай ночы казачныя героі ездзяць да дзяцей, а пасля 24.00 працуюць на карпаратывах ці гарадскіх пляцоўках. Пры добрым раскладзе за сезон Дзед Мароз можа зарабіць 25 мільёнаў (без уліку выдаткаў). І амаль палову ад гэтай сумы — за апошнія два дні да Новага года.

Каб атрымаць сярэднюю заработную плату па рэспубліцы (за лістапад яна склала 6,7 мільёна), аніматару з барадой трэба павіншаваць прыкладна 20 дзяцей. Ці адпрацаваць чатыры карпаратывы.

Пры такіх перспектывах сярод Дзядоў Маразоў, напэўна, шалёная канкурэнцыя...

— На карпаратывах сапраўды канкурэнцыя вялікая, — прызнаецца Уладзімір Стэльмах. — Усе працуюць праз агенцтвы. А там ёсць свае вядучыя. Чаму б не ўзяць напракат касцюм за 200-300 тысяч і самім выступіць, сэканоміўшы бюджэт мерапрыемства?

Аніматар Аляксандр Лапуноў, наадварот, упэўнены, што заказаў хапае ўсім:

**Сёння, 31-га, паслугі Дзеда Мароза даражэюць літаральна з кожнай гадзінай. Калі да шасці вечара дзядуля можа заехаць на 15 хвілін і павіншаваць ваша дзіця прыкладна за 450 тысяч, то пасля такі госць абыдзецца ўжо ў тысяч 800.**

— Напэўна, каб была жорсткая канкурэнцыя, трэба, каб палова беларусаў стала Дзядамі Маразамі. Мы, хутчэй, калегі. Калі не паспяваеш на заказ, тэлефануеш іншаму акцёру, просіш дапамагчы. І чалавек едзе, працуе па тваім цэнніку, хоць ён можа быць ніжэйшым.

### СЭКАНОМІМ НА СНЯГУРЦЫ

Ці карыстаюцца попытам іншыя казачныя персанажы? У парку актыўнага адпачынку кажуць, што такіх заказаў значна менш. Дадатковы персанаж павялічвае кошт. За Снягурку, напрыклад, прыйдзецца даплаціць 100-150 тысяч.

— Я звычайна працую з напарніцай, — расказвае Аляксандр. — Але людзі цяпер абмежаваны ў бюджэце, таму часам запрашаюць толькі Дзеда Мароза. Хаця, калі прыязджаеш да дзяцей адзін, яны ўсё роўна пытаюцца, дзе Снягурка.

Дзіцячыя пажаданні адносна іншых герояў, адзначаюць у агенцтве з года ў год мяняюцца, паколькі з'яўляюцца новыя мультфільмы. Сёлета асабліва папулярныя персанажы мульцікаў «Халоднае сэрца» і «Маша і Мядзведзь».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ТРЫ АРЭШКІ ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ

**Сяброўка (яна працуе дзіцячым псіхолагам) паскардзілася: адзін з яе падапечных заявіў, што Дзеда Мароза няма. Уяўляеш, кажа, так і сказаў. Гадоў пяць хлопчыку. «Ну не ведаю, — адказваю, — думаю, што існуе. Некалькі гадоў таму ў ліфце на працы разам ехалі. Я папрасіла за бараду патрымацца і загадала жаданне». — «І, вядома, спраўдзілася», — не засумнявалася сяброўка. Ну безумоўна! Не важна, як выглядае Дзед Мароз (наколькі па-рознаму, нават на працягу аднаго дня) і што ён увогуле маскіруецца пад звычайнага пераапранутага чалавека, часам некага добра знаёмага. Галоўнае, што цуд ва ўсёй гэтай святочнай мітусні ёсць. І цуд вельмі ўсім нам неабходны. Як азонавы слой для захавання жыцця на планеце Зямля. Не важна, дзякуючы якому механізму цуды адбываюцца, а мары здзяйсняюцца. Галоўнае, што яны адбываюцца.**

**І жаданні, загаданыя пад Новы год, спраўджваюцца. Пры гэтым іх трэба правільна загадваць. Расіяне з нядаўніх часоў пад бой крамлёўскіх курантаў пішуць свае запаветныя жаданні на паперцы, спальваюць, высыпаюць попел у келіх з шампанскім і выпіваюць гэтае шампанскае. Італьянцы, пакуль гадзіннік б'е дванаццаць разоў, спяшаюцца з'есці 12 вінаградзін, пазбавіўшыся ад вінаградных костачак, і за гэты час стараюцца не забыць, што пажадалі.**

**Ну а падпісчыкі «Звязды»... Некаторыя загадзя тэлефануюць у рэдакцыю і выказваюць свае жаданні. Некаторым журналісты тэлефануюць самі і пытаюцца, чаго яны пажадалі б пад Новы год. Можа здарыцца і так, што жаданні выконваюцца авансам — для будучага падпісчыка «Звязды». Яму яшчэ шмат гадоў расці, але ён ужо ведае, што «Звязда» — такая газета, якая дапамагла ажыццявіць яго мару, — ёсць. Што на яго спадзяюцца, і ў яго, пакуль яшчэ невялікага чалавечка, але будучага, магчыма, вялікага спартсмена, вераць.**

**Пад Новы 2016 год мы вырашылі самі паспрабаваць ажыццявіць тры жаданні сваіх падпісчыкаў. Пра іх мы расказваем на гэтых старонках. Адно, чацвёртае, засталося выказаным, але пакуль не здзейсненым. 19-гадовая дзяўчына з вёскі Красная Слабада Салігорскага раёна пажадала планшэт. За некалькі дзён да Новага года нам не пашанцавала знайсці таго Дзеда Мароза, які гэтае жаданне можа выканаць. Але недзе ён, безумоўна, ёсць. І калі ён чытае гэтыя радкі, то няхай ведае, што яго чакаюць і ў яго вераць. А значыць, жыццё на планеце Зямля працягваецца, а цуды — здараюцца.**

# «ХАЧУ ГУЛЯЦЬ, ЯК РАНАЛДУ»


Фота Надзеі БУЖАН.

**Пяцігадовы Саша Барадулін — адзін з самых маленькіх выхаванцаў школы футбольнага клуба «Мінск». Ён яшчэ ходзіць у дзіцячы садок, але ўжо марыць стаць футбалістам, а таму мяч, які хлопчыку вырашыла падарыць на Новы год «Звязда», прыйшоўся яму даспадобы. Разам з Арцёмам Васільевым, нападаючым «Мінска» і адным з самых таленавітых маладых футбалістаў Беларусі, які на час нашай акцыі стаў Дзедам Марозам, Саша хвілін пятнаццаць ганяў мяч па спартзале, біў па варотах і забіваў галы. І не дзіўна! Хлопчык хоча гуляць, як зорны партугалец Крышціяну Раналду, і стаць нападаючым.**

— Спартсменаў у нашай сям'і няма, — прызнаецца шматдзетная маці Таццяна. — Старэйшыя браты Паша і Міша гуляюць у футбол у вольны час, а Саша адразу захацеў запісацца ў футбольную секцыю. Ён упрошваў мяне ўсё лета: «Мама, адвядзі мяне на футбол!». У выніку пагадзілася. Ён хоць і быў маленькі (хлопчыкаў 2010 года нараджэння набіраць толькі ў наступным годзе), але Валерый Віктаравіч Котаў, трэнер групы падрыхтоўкі, сказаў, што Саша бегае хутка, як гепард, у яго ёсць здольнасці, якія трэба развіваць.

З 2015 года Саша пад кіраўніцтвам Андрэя Доўнара, былога гульца нашай нацыянальнай зборнай, трэніруецца амаль як прафесіянал — чатыры разы на тыдзень і на трэніроўкі прыходзіць адразу пасля дзіцячага садка.

— Напярэдадні Новага года зычу Сашу здароўя, каб вырас у добрага футбаліста, гуляў у класнай камандзе і не трапіў у дрэнную кампанію, — кажа Дзед Мароз Арцём Васільеў. — У мяне футбольны мяч з'явіўся ў самым маленстве. Ён быў маёй любімай цацкай. Амаль ніколі з ім не расставаўся, нават біў дома вазы, што вельмі засмучала маці, але я ўсё роўна ставіў перад сабой табурэткі і стараўся іх абыграць, як футбаліст. Мяч павінен быць дома ў любога хлопчыка, які хоча ў будучыні стаць гульцом. Бо футбаліст без яго, як рабочы без рук. Гэта проста немагчыма.

— Як пацяплее, буду з ім у двары летам гуляць, — прызнаўся сціплы Саша. — Сяброў у мяне хапае.

Калі мы ўжо пакідалі спартыўную залу, Аляксандр Томін, прэс-аташэ ФК «Мінск», сказаў, маўляў, хто ведае, можа, мы толькі што зафіксавалі гістарычную падзею і з хлопца сапраўды вырасце годны футбаліст. Што ж, добрая нагода пагутарыць з ім гадоў так праз 15. А пакуль жадаем табе добрага Новага года, Саша, і няхай усе твае мары здзейсняцца. Як гэта, відаць, адбылося ў Крышціяну.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ЯК «ПРАПІСАЦЬ» У СТАЛІЦЫ ТАДЭВУША КАСЦЮШКУ?

**Наш чытач Уладзімір Валетка з Мінска расказаў, што марыць пра тое, каб адна з вуліц у беларускай сталіцы была перайменаваная ў гонар Тадэвуша Касцюшкі. У сваім лісце ў рэдакцыю ён напісаў: «4-га лютага будзе адзначацца 270 гадоў з дня нараджэння нашага славутага земляка Тадэвуша Касцюшкі. Вельмі хацелася б, каб у Мінску з'явілася вуліца, названая яго імем». Жаданні чытачоў — для нас закон. Таму «Звязда» вырашыла напярэдадні Новага года высветліць, што патрэбна для таго, каб вуліца з новай назвай з'явілася ў Мінску.**

Мы звярнуліся да **кансультанта ўпраўлення геадэзіі і картаграфіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, адказнага сакратара тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Беларусі Ірыны БАРОДЗІЧ.** Яна патлумачыла, што прысваеннем найменняў вуліцам у сталіцы займаецца Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, таму са сваімі пажаданнямі трэба звяртацца туды. Аднак разглядаюцца толькі калектыўныя прапановы: адзін чалавек не можа навязваць меркаванне вялікай колькасці людзей. Таму для таго, каб звярнуцца ў гэтую ўстанову са сваёй ідэяй, давядзецца найперш правесці па гэтым пытанні мясцовы сход або рэферэндум.

Ірына Бародзіч удакладніла, як праводзіцца мясцовы сход. Ён можа адбывацца, напрыклад, у рабочых калектывах. На абмеркаванне пад пратакол выносіцца пытанне, людзі выказваюцца «за» і «супраць», усе галасы ўлічваюцца, аналізуюцца. Збіраюцца подпісы як тых, хто падтрымлівае, так і тых, хто не ўхваляе ідэю. Мясцовы рэферэндум праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам (Выбарчым кодэксам): вызначаецца ініцыятыўная група і г.д. Спецыяліст удакладніла, што такая працэдура дзейнічае як для прысваення новых найменняў, так і для пераназывання.

Таксама трэба ўлічваць, што назва, якая прапануецца, павінна адпавядаць патрабаванням артыкула 16 Закона «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў». Згодна з ім, найменне, якое надаецца геаграфічнаму аб'екту, павінна адлюстроўваць погляды грамадзян, якія пражываюць у гэтай мясцовасці (вось дзеля чаго праводзіцца іх апытанне або рэферэндум). Там прапісана, што назвы могуць надавацца ў азнаменаванне гістарычных падзей, а таксама іменаў асоб, якія маюць заслугі перад дзяржавай і грамадствам.

Каб упэўніцца, што імя Тадэвуша Касцюшкі заслугоўвае ўвекавечання ў беларускай сталіцы, мы звярнуліся да **старшыні Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігара КАПЫЛОВА:**

— Лічу, што даўно наспела неабходнасць назваць вуліцу ў Мінску ў гонар Тадэвуша Касцюшкі — чалавека-легенды, які на працягу свайго жыцця паспеў пакінуць значны след у гісторыі некалькіх краін, за што па праве лічыцца нацыянальным героем Беларусі, ЗША, Польшчы і ганаровым грамадзянінам Францыі. Пра значнасць гэтай асобы сведчаць вось такія гістарычныя факты: Касцюшка атрымліваў вышэйшую дзяржаўную ўзнагароду з рук першага прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі Джорджа Вашынгтона, яго паважаў і падтрымліваў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, яго ваенны талент высока цаніў палкаводзец Сувораў, Павел І прасіў аб асабістай прысязе расійскаму імператару, ён сустракаўся з імператарам Напалеонам. Імем Касцюшкі названы вуліцы расійскага Санкт-Пецярбурга, польскага Кракава, літоўскага Вільнюса. Больш за тое, у памяць аб Касцюшку пад Кракавам насыпаны курган. У ЗША яго імя носіць адна з акруг штата Індыяна, а таксама горад у штаце Місісіпі і востраў у штаце Аляска. Помнікі Тадэвушу Касцюшку ўстаноўлены ў Кракаве, Лодзі (Польшча), у сямі гарадах ЗША, у Францыі і Швейцарыі. Музей Касцюшкі ёсць у швейцарскім Салюры. Яго імя носіць самая высокая гара ў Аўстраліі. У Нью-Ёрку ў метрапалітэне на лініі метро J ёсць станцыя «Kosciuszko Street». Але ў першую чаргу трэба памятаць, што гэты незвычайны чалавек нарадзіўся на беларускай зямлі — каля мястэчка Косава Слонімскага павета Навагародскага ваяводства (цяпер гэта тэрыторыя Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці). Тут жа вучыўся ў школе пры Любяшоўскім піярскім манастыры на Піншчыне, дзе актыўна вывучаў французскую, нямецкую, лацінскую, польскую мовы, што дало пазней магчымасць паступіць у прэстыжныя навучальныя ўстановы Польшчы і Францыі і зрабіць бліскучую кар'еру. А таму справай гонару беларусаў-патрыётаў будзе назваць у гонар Тадэвуша Касцюшкі адну з цэнтральных вуліц сталіцы незалежнай Беларусі.

Мы задаліся пытаннем яшчэ і пра тое, якая канкрэтна вуліца ў Мінску магла б ганарова насіць імя Касцюшкі? Некаторыя спецыялісты выказалі думку, што называць так пэўную новую вуліцу на ўскраіне было б не вельмі лагічна: маштаб асобы заслугоўвае пачэснага месца недалёка ад цэнтра. Прагучала думка, што праспекту Дзяржынскага (ці яго частцы) было б добра даць імя Тадэвуша Касцюшкі, бо гэта адна з магістральных вуліц сталіцы, якая вядзе ў кірунку Берасцейшчыны — яго радзімы.

***

Магчыма, мы не выканалі цалкам навагоднне жаданне чытача. Аднак паспрабавалі звесці разам зоркі, якія могуць паспрыяць таму, каб мара пра назву вуліцы стала рэальнасцю. Ідэя Уладзіміра Валеткі заслугоўвае ўвагі і падтрымкі. Аднак да канца яе рэалізоўваць давядзецца яму самому. Зрэшты, наш чытач адзначае, што гатовы для плённай працы дзеля памяці Касцюшкі. У сваім лісце ў рэдакцыю паведаміў, што можа ўзначаліць ініцыятыўную групу, якая займалася б справамі будучай вуліцы імя Касцюшкі. Таму шукае аднадумцаў (кантакты Уладзіміра Іванавіча можна атрымаць у рэдакцыі). Акрамя таго, марыць пра тое, каб у сталіцы з'явіўся яшчэ і помнік гэтаму чалавеку — у ідэале конны. Ужо знайшліся спонсары, гатовыя ахвяраваць сродкі на такую справу. Засталося толькі адкрыць добраахвотны рахунак.

А яшчэ Уладзімір Валетка мае ўласны гадавальнік ружаў. Будучай вясной хоча падарыць свае найлепшыя кветкі сядзібе Касцюшкі ў Косаве. Кветкі — бадай што лепшае прызнанне ў любові. У тым ліку і славутаму земляку...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Сталічны праспект імя Дзяржынскага вядзе ў кірунку Берасцейшчыны.

# ЖАДАННЕ ІРЫНЫ

**На peраднавагоднім рэдакцыйным сходзе мне дaручылі выканаць жаданне падпісчыцы «Звязды», скажам так, працаздольнага ўзросту. Ёсць розныя спосабы знайсці такога чалавека, і я вырашыла пазваніць у паштовае аддзяленне Салігорска — аднаго з самых маладых гарадоў Беларусі. Аднак паштальёнка статысячнага шахцёрскага горада слушна параіла мне спытаць у вясковым аддзяленні сувязі, дзе асабіста ведаюць усіх падпісчыкаў. Так я трапіла на аграгарадок Доўгае Салігорскага раёна, дзе мне адразу назвалі Ірыну Башуру. «Гадоў сорак, — сказалі пра яе ўзрост. — Ветурач». Потым высветлілася, што памыліліся з пасадай, і трошкі з узростам. Але ў галоўным — з асобай падпісчыцы — падказалі вельмі ўдала.**



Фота Надзеі БУЖАН.

## МІСІЯ ВЫКАНАЛЬНАЯ

— Мне нічога не трэба, у мяне ўсё ёсць, — адказаў вясёлы жаночы голас па тэлефоне.

Я настойвала, і жанчына прапанавала: «Напішыце пра нашу гаспадарку. Яна добрая: дом мне далі, я ў ім ужо 10 гадоў жыву». Пасля гэтых слоў мне захацелася расцалаваць Ірыну. За тое, што жаданне было выканальнае. І... як бы гэта сказаць... у нашым, звяздоўскім, духу: неяк па-сапраўднаму, не для паказухі, патрыятычным.

Трошкі бянтэжыла тое, што публікацыю заказвала не кіраўніцтва гаспадаркі. Ірына Башура працуе на малочнатаварнай ферме тэхнікам-асеменатарам. Праўда, яна з'яўляецца адным з акцыянераў ААТ «БелСлуч», якое спецыялізуецца на вытворчасці малака і раслінаводстве. Калі сельскагаспадарчае прадпрыемства змяняла сваю арганізацыйна-прававую форму, усе яго работнікі, у залежнасці ад стажу і заробку, сталі ўладальнікамі акцый. Ірына таксама валодае невялікім пакетам.

Але ж пагадзіцеся, жаданне шэрагавага работніка прачытаць у сваёй газеце пра сваё прадпрыемства пра многае гаворыць. І мы з фотакарэспандэнтам, не папярэджваючы начальства Ірыны, накіраваліся да яе на ферму. Падпісчыца жадае — газета выконвае. Аказалася, быць чараўніком, калі гэта ў тваіх сілах, вельмі прыемна. Нават калі трошкі рызыкоўна. А паглядзець на гаспадарку вачыма тэхніка-асеменатара — не ардынарная задача.

## ЛЁГКАЯ РУКА ПЛЮС ТЭХНАЛОГІЯ

Ірына выпісвае «Звязду» ўжо гадоў дзесяць. «Калісьці паштальёнка параіла», — прызнаецца яна. Стольк ж Ірына працуе ў Доўгім. Нарадзілася і скончыла школу ў суседняй вёсцы Прагрэс, там працавала дзесяць гадоў да таго, як гаспадаркі аб'ядналіся. Адразу пасля школы Ірына спрабавала развітацца з вясковым жыццём, вывучылася ў Мінску на швачку і каля дзесяці гадоў працавала на сталічнай швейнай фабрыцы імя Крупскай (цяпер «Элема»), але потым вярнулася да бацькоў.

Яшчэ калі была ў водпуску па догляде маленькага сына, старшыня калгаса прапанаваў ёй выйсці на ферму раздойваць кароў, якія ацяліліся ўпершыню. Яна добра разумела, што працаваць з маладняком — больш цяжка і вельмі адказна, ды і малака першачкі даюць менш, чым, скажам, чатырох-пяцігадовыя, якія дасягнулі максімуму сваёй прадукцыйнасці. Але Ірына, відаць, не з баязлівых, яна пагадзілася. Да таго ж, работа была добра знаёмая — яе маці і бабка былі даяркамі.

У «БелСлучы» Ірыне далі асобны дом, яна і тут спачатку раздойвала першачак, пакуль не прапанавалі вывучыцца на тэхніка штучнага асеменення. «Шмат пісаніны», — характарызуе самы складаны для сябе бок цяперашняй працы Ірына.



Уся карціна аднаўлення статку адлюстравана ў Ірыны Башуры на цыклографах.

Насамрэч штучнае асемяненне — ювелірная работа. Важна правільна ўсё зрабіць унутры цела жывёлы, прычым увесь працэс праходзіць усляпую, навобмацак, таму маюць значэнне і веды, і вопыт, і чуллівасць пальцаў тэхнолага, і інтуіцыя, і ўвага да жывёлы.

Не менш важна правільна размарозіць семя, якое захоўваецца ў пасудзінах Дзюара з вадкім азотам пры тэмпературы мінус 196 градусаў, а таксама захаваць усю тэхналогію працэсу, у выніку якога на свет з'яўляюцца цялушкі і бычкі.

Кажуць, у сельскай гаспадарцы шмат што залежыць ад надвор'я. Справа асемянатара, напэўна, больш за іншыя залежыць яшчэ і ад якасці і зладжанасці работы ўсіх, хто мае дачыненне да жывёл. Напрыклад, без высокага прафесіяналізму спецыялістаў салігорскага філіяла Мінскага племпрадпрыемства, які забяспечвае фермы каштоўным матэрыялам, работа Ірыны не прынесла б вынікаў.

— Ірына Мікалаеўна — добры асемянатар, адна з самых лепшых у гаспадарцы, — расказала нам галоўны заатэхнік «БелСлучы» Наталля Зубовіч. — У яе лёгкая рука.

За 24 дні снежня ў Ірыны Башуры расцяліліся 34 каровы, да канца месяца павінны расцяліцца яшчэ тры. Ірына паказвае стэнд у выглядзе двух кругоў, дзе адлюстравана інфармацыя пра кожную карову ў статку. Цыклографы з рознакаляровымі біркамі, на якіх напісаны індывідуальныя нумары жывёл (колер бірак адпавядае даярцы, якая даглядае пэўную групу кароў), дазваляюць адразу бачыць, у якім перыядзе аднаўлення знаходзіцца ўвесь статак. Тыя ж самыя паказчыкі Ірына фіксуе ў сваіх журналах, а таксама — на індывідуальных картках у стойле, каб і даяркі бачылі, якой з іх падапечных патрэбна больш корму і ўвагі, якая павінна прыбавіць малака, а якую надышоў час рыхтаваць да ацёлу.

## УБАЧЫЦЬ ПРОСЬБУ

Апроч іншага, майстэрства тэхніка-асемянатара залежыць ад стаўлення чалавека да сваёй справы. Два разы на дзень Ірына мэтанакіравана выяўляе кароў «у ахвоце»: раніцай (летам а чацвёртай гадзіне) і падчас дзённай прагулкі. Гэты момант вельмі важна не прапусціць, бо ён доўжыцца ад 6 гадзін да паўтара сутак, можа быць невідавочным — «ціхім», пры гэтым самым лепшым часам для асемянення з'яўляецца сярэдзіна перыяду «ахвоты». Прапушчаны момант азначае рост выдаткаў на ўтрыманне статку, страту цялят і зніжэнне вытворчасці малака. Таму асемянатары працуюць без адпачынкаў, іх працоўны дзень ненармаваны, але і заробкі, калі ўсё атрымліваецца добра, досыць высокія.

— Як вы выяўляеце карову «ў ахвоце»? — пытаюся ў Ірыны.

— Па бляску ў вачах, — тлумачыць жанчына. — Такія каровы паводзяць сябе інакш, калі я заходжу раніцай на ферму — яны падымаюцца і клічуць.

Прашу паказаць некалькі кароў, сярод якіх адна будзе «ў ахвоце», каб паспрабаваць самой выявіць — якая. Спачатку мне здаецца, што вочы блішчаць ва ўсіх трох. Але толькі адна пацягнулася пысай і па-асабліваму зазірнула ў твар. У яе позірку мне ўбачыліся і цікавасць, і боязь, і маўкліваe пытанне... Я не памылілася, гэта карова была «ў ахвоце». «Бачыце, яна і спіну трошкі прагінае», — пацвердзіла Ірына. Але гэтага я ўжо разгледзець не змагла.

## ДУХ ТАВАРЫСТВА

Ад якасці работы асемянатара залежыць не толькі колькасць прыплоду, але і жыццё дарослай жывёліны — у выпадку некалькіх няўдач яе выбракоўваюць. З колькасцю расцёлаў звязана прыбаўка малака, а гэта ўжо ўплывае на заробкі ўсяго калектыву, прыбытак і паспяховасць гаспадаркі ў цэлым.

Акцыянернае таварыства «БелСлуч» — гэта, зразумела, вынік работы ўсіх 250 чалавек: і жывёлаводаў, і механізатараў, і палявадаў, і спецыялістаў. Гэтыя людзі ў асноўным жывуць за кошт таго, якую аддачу прыносяць шэсць раскіданых па розных вёсках малочнатаварных фермаў (на кожнай свой асемянатар), дзе ўтрымліваецца зараз 4380 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 1950 галоў дойнага статку. Сёлета вытворчасць малака ў «БелСлучы» ў параўнанні з мінулым годам вырасла амаль на 20%, на столькі ж павялічыўся ўдой на карову. Выраблёнае малако таварыства здае ў салігорскі філіял Слуцкага сыраробнага камбіната.

**Але ж пагадзіцеся, жаданне шэрагавага работніка прачытаць у сваёй газеце пра сваё прадпрыемства пра многае гаворыць.**

— Апошнім часам гаспадарка наша набірае абароты, — з задавальненнем далучаецца да размовы даглядчыца жывёлы Валянціна Ляпіна. — Цяперашні дырэктар, Марат Міхайлавіч Вайтовіч, стараецца для людзей, усюды наводзіць парадак. Раней мы заўсёды кармы куплялі, цяпер нават прадаём. Будуем дзве новыя фермы, старыя адрамантавалі.

На жаль, нам не ўдалося пабачыцца з Маратам Вайтовічам, які ў гэты дзень знаходзіўся ў вяскаме. Але ён звязаўся з намі па тэлефоне і папрасіў у артыкуле павіншаваць ад яго імя ўсіх акцыянераў ААТ «БелСлуч» з Новым годам.

***Мы з задавальненнем далучаемся да віншавання дырэктара акцыянернага таварыства і віншуем работнікаў «БелСлучы» і ўсіх вяскоўцаў з Калядамі і Новым годам! Дзякуем вам за вашу працу, за смачнае і чыстае малако з вашых фермаў, за тое, што выпісваеце і чытаеце нашу газету, ганарыцеся сваёй справай і любіце свае мясціны. На такіх людзях, як Ірына Башура і ўсе, каго мы сустрэлі ў той дзень у Доўгім, напэўна, стаіць не толькі наша краіна, але і свет у цэлым. Зычым, каб акцыі таварыства падскочылі ў цане, а ўсе акцыянеры «БелСлучы» былі здаровыя і багатыя!***

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*Салігорскі раён.*



Адміністрацыя ААТ «БелСлуч».
У зыходзячым годзе гаспадарка ў цэлым павялічыла вытворчасць сваёй прадукцыі амаль на 10%.

# СТАЎКА НА МІР І НОВЫЯ ПРАЕКТЫ

## Чым запомніўся 2015 год для краіны?

**Мінулы год быў насычаны як добрымі, так і страшнымі падзеямі. На шчасце, апошнія — тэракты, крушэнні самалётаў, узброеныя сутыкненні — адбываліся не ў нашай краіне. Але ж сёння, калі свет ператвaрыўся ў «глабальную вёску», трагедыя ў іншай дзяржаве ўспрымаецца вельмі блізка да сэрца, прымушае задумацца — а ці не здарыцца такое і ў нас? Думкі-думкамі, а год заканчваецца. Пара падвесці вынікі — якім жа ён быў для нашай краіны?**

**У 2015-м, нягледзячы на цяжкасці ў эканоміцы, у нас было шмат дасягненняў, прычым у розных сферах — ад сацыяльнай да знешнеэканамічнай. Давайце паглядзім, чым жыла краіна ў адыходзячым годзе.**

### СІМВАЛЫ МІРУ

На нашу дзяржаву сталі іначай глядзець у свеце. Так, сапраўды, мы і раней былі вядомымі за мяжой — спартыўнымі дасягненнямі, чыстымі гарадамі, гасціннасцю, але цяпер назвы «Беларусь» і «Мінск» гучаць ужо зусім па-іншаму. Гэта не толькі дзяржава і яе сталіца, гэта сімвалы міру, добрасуседства і шчырага імкнення дапамагчы. Наша краіна прапанавала бакам канфлікту ва Украіне сваю пляцоўку для перамоў. 12 лютага 2015 года ў Мінск прыехалі лідары Германіі, Францыі, Расіі і Украіны. 15 гадзін яны правялі ў абмеркаванні шляхоў вырашэння ўкраінскага крызісу.

Усяго кантактная група па Украіне сустракалася ў нашай сталіцы больш за 20 разоў, сустрэчы будуць арганізоўвацца і надалей. Дзякуючы ім вайна на паўднёвым усходзе суседняй краіны пайшла на спад.

На саміце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па ўстойлівым развіцці Прэзідэнт Беларусі ў сваім выступленні таксама зрабіў акцэнт на немагчымасці ўстойлівага развіцця без міру і бяспекі.

### ВЫБАРЫ АДБЫЛІСЯ

Самай важнай унутранай падзеяй летась сталі прэзідэнцкія выбары. Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў зарэгістравала 8 ініцыятыўных груп патэнцыяльных кандыдатаў, у выніку неабходныя 100 тысяч галасоў назбіралі чатыры з іх, адпаведна, на выбарах было чатыры кандыдаты на пост прэзідэнта.

Кампанія праходзіла спакойна — гэта адзначаў і беларускі Цэнтрвыбаркам, і міжнародныя назіральнікі. Кандыдатам былі гарантаваны роўныя магчымасці вядзення агітацыі, данясення сваёй перадвыбарнай кампаніі да выбаршчыкаў. У выніку выбары адбыліся ў адзін тур 11 кастрычніка. Яўка выбаршчыкаў склала 87,2%, датэрмінова прагаласавалі звыш 36% грамадзян. Перамог Аляксандр Лукашэнка з 83,49% галасоў.

### ПАЦЯПЛЕННЕ Ў СТАСУНКАХ З ЗАХАДАМ

Краіны Захаду нарэшце пачалі больш аб'ектыўна ставіцца да нашай дзяржавы. У адыходзячым годзе Мінск наведалі дэлегацыі Злучаных Штатаў Амерыкі, краін Еўрапейскага саюза. Усе яны выказвалі зацікаўленасць у развіцці стасункаў з Беларуссю. Падобнае пацяпленне ў адносінах назіралася і ў перыяд прэзідэнцкіх выбараў 2010 года, але на гэты раз еўрапейскія краіны павялі сябе больш канструктыўна пасля падвядзення вынікаў выбараў. Спачатку было аб'яўлена аб магчымай замарозцы санкцый у дачыненні да нашай краіны, пасля яны былі ўвогуле адменены.

Плённа развіваліся стасункі з Еўрапейскім саюзам і ў плане спрашчэння візавага рэжыму. Пра адпаведны намер заявіў яшчэ ў 2013 годзе міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей. Праца ў гэтым кірунку пачала даваць вынікі. У пачатку снежня стала вядома: Беларусь і Еўрасаюз падрыхтавалі да падпісання пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму.

### ЗАПРАЦАВАЎ ЕАЭС

Яшчэ адна важная падзея адыходзячага года тычыцца ўдзелу Беларусі ў буйным інтэграцыйным аб'яднанні мацерыка — Еўразійскім эканамічным саюзе. З 1 студзеня 2015 года ён пачаў сваю работу. На працягу года да яго далучыліся Арменія і Кыргызстан. Пагадненне аб стварэнні свабоднай эканамічнай зоны ўжо падпісана з В'етнамам. Зацікаўлены ў заключэнні такога пагаднення з ЕАЭС Егіпет, Ізраіль, Кітай, Сырыя, Іарданія, Туніс, Зімбабве, Пакістан, Манголія, Албанія, Кітай, Індыя, Іран і Еўрапейскі саюз.




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЕАЭС мае на мэце перш за ўсё эканамічнае супрацоўніцтва. Ужо сёння паміж краінамі-ўдзельніцамі зняты мытныя бар'еры, спрошчаны рэжым вядзення бізнесу.

### ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ДЗЯЦЕЙ

У сацыяльным плане нельга не сказаць пра так званы мацярынскі капітал, які з'явіўся 1 студзеня 2015 года. Так, калі ў перыяд з 1 студзеня 2015 года па 31 снежня 2019-га у сям'і з'яўляецца трэцяе, чацвёртае і наступнае дзіця, дзяржава залічвае на спецыяльна адкрыты для яго рахунак у Беларусбанку 10 тысяч долараў. Да таго часу, пакуль дзіцяці не споўніцца 18 гадоў, гэтыя грошы будуць ляжаць у банку і назапашваць працэнты. Зняць іх раней за тэрмін нельга, адзінае выключэнне — платнае лячэнне. Пасля наступлення паўналецця дзіцяці патрацяць гэтую суму можна будзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, на адукацыю, на лячэнне або на пенсійныя зберажэнні для мамы.

### Як думаюць людзі?

Днямі Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта абнародаваў звесткі сацыялагічнага апытання, праведзенага ў першай палове снежня. Тэма апытання — галоўныя падзеі мінулага года.

Згодна з апублікаванай інфармацыяй, каля 54% жыхароў нашай краіны лічаць прэзідэнцкія выбары галоўнай падзеяй адыходзячага года.

Паказальна, што гэта было адкрытае апытанне, г. зн. у пытаннях не было варыянтаў адказу: людзі самі ўзгадвалі тыя ці іншыя моманты і даты з жыцця краіны за 2015 год.

У ліку значных падзей грамадзяне называлі перамовы кантактнай групы па Украіне ў Мінску (5%), святкаванне 70-годдзя Перамогі, будаўніцтва Астравецкай АЭС, а таксама выступленне кіраўніка дзяржавы на саміце ААН. Ацэньваючы характар змен, якія адбыліся за год у дзяржаве, большасць жыхароў адзначылі, што ў адыходзячым годзе сітуацыя ў краіне стала больш спакойнай (23%) або засталася стабільнай (42%). Разглядаючы становішча ў свеце, беларусы прытрымліваюцца іншай думкі: пераважная большасць (80%) лічаць, што за год сітуацыя стала больш напружанай.

### НОВАЕ НАФТАВАЕ РАДОВІШЧА

Новы год краіна сустракае з новым нафтавым радовішчам, якое атрымала назву Шацілаўскае. Яно размешчана ў Прыпяцкім прагіне на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Згодна з папярэднімі разлікамі, яго запасы могуць складаць каля 350 тысяч тон, а гэта пятая частка ад штогадовага аб'ёму здабычы нафты ў нас.

У выніку праведзеных выпрабаванняў атрыманы прыток высакаякаснай светла-зялёнай лёгкай нізкасярністай нафты. Сумарныя прагнозныя рэсурсы ацэнены геолагамі Мінпрыроды ў 850 тысяч тон, здабыча можа складаць каля 350 тысяч тон коштам больш за 200 млн долараў. Больш дакладныя лічбы будуць вызначаны пазней.

### ТЫЯ, ХТО АФІЦЫЙНА НЕ ПРАЦУЕ, БУДУЦЬ ПЛАЦІЦЬ ПАДАТАК

Прэзідэнт падпісаў Дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Дакумент вызначае, што працаздольныя грамадзяне нашай краіны ў выпадку, калі яны не ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў больш за 183 дні, абавязаны заплаціць падатак. Яго сума роўная 20 базавым велічыням. Ад падатку вызваляецца шэраг катэгорый грамадзян, такіх як інваліды, пенсіянеры, дзеці да 18 гадоў, студэнты... Калі ж чалавек будзе ўхіляцца ад выплаты падатку, то яму пагражае дадаткова штраф або адміністрацыйны арышт.

### МОСТ ПАМІЖ ЗАХАДАМ І ЎСХОДАМ

Беларусь стала часткай праекта Вялікага шаўковага шляху. У рамках кітайскай стратэгічнай праграмы «Эканамічны пояс Шаўковага шляху» распрацоўваецца шэраг праектаў марскіх і сухапутных шляхоў паміж Еўропай і Кітаем пад агульнай назвай Новы шаўковы шлях.

Галоўная мэта амбіцыёзнага праекта Кітая — не толькі стымуляваць унутранае развіццё вялікай краіны, але і развіваць узаемавыгадныя адносіны з дзяржавамі Еўразіі. Беларусь на гэтым маршруце можна лічыць ключавой пляцоўкай. Геаграфічнае становішча нашай краіны — якраз пасярэдзіне Шаўковага шляху. З такім выгадным размяшчэннем мы адначасова «глядзім» на Усход і на Захад. Наша краіна — акно ў Еўропу з аднаго боку, з другога — прыцягненне еўрапейскіх капіталаў і тэхналогій на Усход. У Кітаі спадзяюцца, што Беларусь будзе адыгрываць ролю пляцоўкі, якая злучае Усход і Захад. Візіт старшыні КНР Сі Цзіньпіна, які адбыўся ў маі, — рэальнае пацвярджэнне гэтых спадзяванняў.

### НОБЕЛЬ НАШ

Грамадзянка нашай краіны Святлана Алексіевіч атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Прэмія прысуджана «за шматгалосую творчасць — помнік пакуты і мужнасці ў наш час».

**Яшчэ адна цікавая падзея мінулага года — акцыя «Сямейнае чытанне». Яна стартавала ўвосень — як працяг творчага праекта «Лета з добрай кнігай». Заснавальнікі акцыі — Міністэрства інфармацыі, Беларускі саюз жанчын, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда». Да ўдзелу ў рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне» запрошаны абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты, бібліятэкі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, дзяржаўныя і прыватныя кніжныя выдавецтвы.**

**Пляцоўкай акцыі з'яўляюцца кнігарні, бібліятэкі, школы краіны. Пісьменнікі Беларусі правядуць прэзентацыі сваіх кніг, аўтограф-сесіі, прымуць удзел у кніжных кірмашах, фестывалях сямейнага чытання, кніжных марафонах.**

Святлана Алексіевіч ужо называлася букмекерамі як адна з прэтэндэнтак на Нобелеўскую прэмію ў 2013 годзе. Але ў той год узнагароду атрымала канадская пісьменніца Эліс Манро. У 2015 годзе канкурэнцыю беларускай пісьменніцы, па версіі букмекерскай канторы Ladbrokes, склалі Харукі Муракамі (Японія), Нгугі Ва Тхіёнга (Кенія), Джойс Кэрал Оўтс (ЗША), Юн Фосе (Нарвегія), Філіп Рот (ЗША).

### НОВЫЯ ГРОШЫ

Кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ №450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь». Дакумент пастанаўляе, што дэнамінацыя будзе праведзена 1 ліпеня 2016 года. Яна заменіць банкноты ўзору 2000 года на грашовыя знакі ўзору 2009 года ў выглядзе банкнот і манет. «Старыя» грошы будуць суадносіцца з новымі наступным чынам: сённяшнія 10 тысяч рублёў роўныя 1 рублю.

Усяго 1 ліпеня будзе выпушчана ў зварот сем наміналаў банкнот (5, 10, 20, 50, 100, 200, 500) і восем наміналаў манет — 1, 2, 5, 10, 20, 50 капеек, а таксама 1 і 2 рублі.

### 70 ГАДОЎ ПЕРАМОГІ

Адыходзячы год запомніўся і шэрагам мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 70-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У ваенным парадзе 9 мая прынялі ўдзел сотні адзінак тэхнікі, больш за 5 тысяч вайскоўцаў, сотні тысяч гледачоў.

Упершыню на парадзе былі паказаны найноўшыя айчынныя сістэмы залпавага агню «Паланез». Рэактыўныя сістэмы вялікай далёкасці створаны арганізацыямі абароннага сектара эканомікі нашай краіны і адпавядаюць найлепшым сусветным аналагам. Кожная баявая машына «Паланеза» можа адначасова нанесці кропкавы ўдар па васьмі мішэнях на адлегласці больш за 200 кіламетраў.

### СПАРТЫЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ

Запомніўся гэты год і дзякуючы двум спартыўным мерапрыемствам сусветнага маштабу, што прайшлі ў нашай краіне. З 17 па 24 лютага адбыўся чэмпіянат свету сярод юнакоў і юніёраў па біятлоне. Галоўнай пляцоўкай спаборніцтваў стала славутая спартыўная база — Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы», дзе знаходзіцца адзін з найлепшых у свеце біятлонных комплексаў. Чэмпіянат па традыцыі ўключаў два асобныя залікі: сярод юніёраў і юніёрак (ва ўзросце 19-21 год) і сярод юнакоў і дзяўчат (маладзейшых за 19 гадоў).

З 17 па 25 красавіка Беларусь правяла чэмпіянат свету па футзале. Матчы праходзілі ў пяці гарадах краіны: у Мінску, Брэсце, Пінску, Барысаве, Маладзечне. Упершыню за 20 гадоў планетарны турнір вярнуўся з краін Лацінскай Амерыкі ў Еўропу.

Яшчэ адна значная падзея — наша біятланістка Дар'я Домрачава атрымала галоўны трафей біятлоннага года — Вялікі хрустальны глобус. У кар'еры Домрачавай гэта першая такая ўзнагарода. Да гэтага яна шэсць разоў запар займала месцы ў першай дзясятцы.

Чым яшчэ запомніўся адыходзячы год у спартыўным плане? Натуральна, першай у гісторыі перамогай нашай хакейнай каманды над камандай ЗША.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ЧАКАЙЦЕ ЛЮБІМЫХ І ВЕРЦЕ Ў НОВУЮ СУСТРЭЧУ

**Новы год — чароўны час, калі мы падводзім вынікі, рыхтуем адно аднаму падарункі. Але ці думаем, што, магчыма, само жыццё рыхтуе нам незвычайныя падарункі — сустрэчы з блізкімі, роднымі і любімымі людзьмі? І, галоўнае, ці верым? Людзі, якія звяртаюцца ў праграму «Чакай мяне» (выходзіць у эфіры тэлеканала АНТ) — з тых, хто не губляе надзеі атрымаць менавіта такі падарунак. Шэф-рэдактар праграмы Вікторыя Байбурына кажа, што цяпер толькі ў базе беларускай рэдакцыі праграмы «Чакай мяне. Беларусь» знаходзіцца каля 30 тысяч заявак. І за час існавання беларускага выпуску передачы тут адшукалі сваімі сіламі каля 1,5 тысячы чалавек. Калі ўлічваць сярэдні паказчык па ўсіх краінах, то атрымліваецца, што нехта знаходзіцца кожныя некалькі хвілін.**

— Здзіўляе тое, як лёгка часам людзі страчваюць адно аднаго... на дзесяцігоддзі. Пераехалі і забыліся пакінуць новы адрас, змянілі прозвішча... Здавалася б, цяпер, калі існуе столькі розных сацыяльных сетак, такое проста немагчыма. Але ж здараюцца выпадкі, калі людзі гадамі не могуць знайсці адно аднаго. Часам проста так складаюцца абставіны, — дзеліцца Вікторыя Байбурына. — І мы просім у нашай праграме ўсіх праверыць на сайце «Чакай мяне», ці не шукаюць раптам вас альбо кагосьці з вашых знаёмых. Чалавек заходзіць на сайт проста таму, што цікава, а аказваецца, што шукаюць менавіта яго... Я працую ў праграме ўжо больш за 6 гадоў, і ўсё роўна бываюць моманты, калі цяжка стрымаць слёзы... Калі дзеці знаходзяць бацькоў, калі сустракаюцца людзі, якіх разлучыла вайна... І прыкладаў безліч. Усе нашы гісторыі вучаць спачуваць тым, хто побач з намі, берагчы адно аднаго.

## НАДЗЕЯ НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ

Лідзія Васільеўна з горада Бяроза і яе сёстры даўно марылі знайсці пляменніка Мікалая, сына іх брата Івана (які трагічна загінуў, калі хлопчыку было 9 гадоў). Іх брат жыў са сваёй сям'ёй ва Украіне, куды яшчэ ў маладосці з'ехаў на заробкі. Першы час пасля смерці Івана родзічы з Беларусі падтрымлівалі сувязь з яго жонкай і сынам праз лісты. Пляменнік запрашаў сваякоў нават на вяселле, але ў тых не атрымалася. Пасля ім даслалі вясельны фотаздымак Мікалая, і перапіска абарвалася... Цёткі бачылі свайго пляменніка ў рэальнасці толькі маленькім, гадоў 20 таму. Як аказалася, жаданне знайсці адно аднаго ва ўсіх было ўзаемным: мужчына таксама рабіў спробы адшукаць родных: звяртаўся ў міліцыю, але атрымаў адказ, што яны выехалі. Радасці не было межаў, калі даведаўся, што яго шукаюць праз праграму «Чакай мяне». «Аж да слёз радуюся! Сам думаў у гэтую праграму звярнуцца, але вы зрабілі гэта хутчэй!» — адзначаў герой перад сустрэчай з родзічамі. І расказваў пра свае паездкі ў Беларусь, успамінаў, як тут Новы год і Каляды святкавалі... А пасля адбылася цёплая і эмацыйная сустрэча ў беларускай студыі праграмы «Чакай мяне». Сям'я зноў аб'ядналася.

## ЛІСТЫ АД КАХАНАЙ

Падчас канфлікту ў Нагорным Карабаху больш за дваццаць гадоў таму сярод бежанцаў была сям'я (муж, жонка і двое дзяцей), якія з'язджалі з Баку. Пераехалі яны ў Краснадарскі край, на Кубань. Наступствы той вайны былі цяжкімі... Праз чатыры гады не стала бацькі, маці трапіла ў бальніцу з дэпрэсіяй, дзеці засталіся адны. Даў ім прытулак дзядзька (брат маці), які таксама быў бежанцам і жыў у вёсцы. У рэчах, што засталіся ад бацькі, 12-гадовая Алена знайшла лісты, якія ён вывез з Баку з каштоўнымі рэчамі. Гэта былі пісьмы да каханай жанчыны з мінулага. Так дзяўчынка даведалася пра існаванне сястры Наталлі... Аказалася, што яна жыве ў Мінску, але дзякуючы пакінутаму на сайце праграмы водгуку сёстры змаглі сустрэцца.

І наступныя некалькі кароткіх гісторый таксама інакш, як «навагоднім цудам», не назавеш...

## НЕЗАБЫЎНАЕ СЯБРОЎСТВА

Валерый з Пятром пазнаёміліся і пачалі сябраваць падчас вучобы, калі служылі ў ракетным дывізіёне. Пётр быў мастаком-афарміцелем, маляваў у клубе плакаты для наглядной агітацыі, Валерый — сувязістам. Яны ўваходзілі ў склад аднаго падраздзялення... Першая заяўка ад Пятра, дзе ён шукаў сябра, з'явілася на сайце передачы ў сакавіку 2011 года, другая была датавана 1 студзеня 2012 года, а трэцяя — лютым 2012-га. Іх пад кіраўніцтвам бацькі складала яго 15-гадовая дачка Яна.

Падчас сустрэчы ўспаміналі, як святкавалі Новы год у арміі. Пётр Мікалаевіч са смехам узгадваў, як накрывалі ў казарме стол, дзе былі сокі, садавіна, ніякага спіртнога, але ўсім было весела, бо з імі служылі хлопцы з цыркавога вучылішча, у тым ліку і фокуснік. «Цвіком праграмы» заўсёды было з'яўленне Дзеда Мароза і Снягуркі, у якіх пераапраналі салдат. Дзядуля быў у армейскай вушанцы і кажуху, а яго ўнучка — у спадніцы, зробленай з ручніка... Сустрэча былых саслужыўцаў адбылася ў мінскай студыі. Знайсці сябра на Новы год — ці можна ўявіць сабе лепшы падарунак?..

## НАЙДАРАЖЭЙШЫЯ ЗНАХОДКІ

Яшчэ адна з заявак, зарэгістраваных 1 студзеня, знайшла водгук. Канстанцін Анатольевіч шукаў родных свайго бацькі, з якім ніколі не бачыўся. Бацькі разышліся, калі хлопчыку не было і года. Зрабіць спробу адшукаць родзічаў мужчыну натхніў сын. І ў выніку сваякі знайшліся. Аказалася, у Канстанціна шматлікая радня.

Сапраўдным цудам можна лічыць і фінал гісторыі Дзяніса з Беларусі, які шукаў свайго бацьку ў Латвіі. Двойчы хлопец рабіў спробы знайсці роднага чалавека. Першы ліст трапіў у праграму ў 2004 годзе, калі Дзяніс ішоў на службу ў войска, а другі — калі ён зрабіў прапанову рукі і сэрца каханай дзяўчыне ў сакавіку 2012-га. Вяселле было запланавана на стары Новы год... І бацька знайшоўся!

Таму верце ў цуды, беражыце сябе і блізкіх людзей! І што б ні здарылася, чакайце іх вяртання дадому!




# ШАЙБЫ, КЛЮШКІ, КАНЬКІ...

## Калядныя падарункі ад «Беларусь 5»

**Спартыўныя перамогі 2015-га і надзеі на 2016-ы — у навагодняй праграме на «Беларусь 5».**

Наступны год — алімпійскі, таму зараз у цэнтры ўвагі тэлеканала «Беларусь 5» — спартсмены, якія заваявалі ліцэнзію на ўдзел у галоўных гульнях чатырохгоддзя. А ўзгадаць яркія моманты беларускага спорту напярэдадні Новага года і адкрыць 2016-ы тэлеканал плануе трансляцыямі любімых спартыўных турніраў.

31 снежня 2015 года ў 21.30 гледачоў спартыўнага канала пачнуць віншаваць спецыяльныя госці «Беларусь 5». Сярод іх — музыкі, зоркі беларускага спорту і маладыя спартсмены, якія заваявалі пуцёўку ў Рыа-дэ-Жанейра, дзе пройдуць летнія Алімпійскія гульні — 2016.

4-7 студзеня 2016 года канал «Беларусь 5» традыцыйна будзе асвятляць XII Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Нашу краіну на гэтых спаборніцтвах прадставіць каманда кіраўніка дзяржавы, якая 8 разоў станавілася пераможцай першынства! Тэлеканалам «Беларусь 5» будуць арганізаваны трансляцыі матчаў беларускай каманды, а таксама фінальны паядынак. Дарэчы, у 2015 годзе пераможцай каляднага турніру стала каманда з Расіі. Гэтым разам чакаецца не менш інтрыгуючая барацьба, якая, несумненна, выкліча цікавасць як тэлегледачоў, так і балельшчыкаў на лядовых арэнах Мінска. Трансляцыі гэтых спаборніцтваў стануць сапраўдным калядным падарункам для аматараў хакея.

9-10 студзеня прыме «эстафету» ў турніру чэмпіянат Еўропы па канькабежным спорце, які ўпершыню пройдзе ў нашай краіне. Творчая група канала «Беларусь 5» удала справілася з асвятленнем новага для сябе віду спорту падчас Адкрытага чэмпіянату Беларусі. Цяпер кантынентальнае першынство гатова падарыць скрыгат канькоў у класічным шматбор'і спартсменаў з 15 краін: Галандыі, Італіі, Германіі, Нарвегіі, Расіі, Чэхіі і іншых. «Беларусь 5» будзе шырока асвятляць гэтыя спаборніцтвы.

Тэлеканал «Беларусь 5» запрашае айчынных аматараў спорту і гледачоў з ліку замежных гасцей далучыцца да святкавання Новага года і Каляд у кампаніі любімых спартсменаў, трэнераў і каментатараў.

# ВІНШАВАЛЬНЫ МАРАФОН У РАДЫЁЭФІРЫ

**З 31 снежня 2015 года па 3 студзеня 2016 года самае папулярнае радыё краіны — Першы нацыянальны канал Беларускага радыё — правядзе інтэрактыўны віншавальны марафон. У ім прымуць удзел вядомыя палітыкі, дзеячы культуры і мастацтва, спартсмены, зоркі беларускай эстрады. Да марафону таксама змогуць далучыцца ўсе слухачы канала. Для таго, каб стаць яго ўдзельнікам, трэба будзе толькі адправіць навагодняе SMS-паведамленне на кароткі нумар 1062 і дачакацца агучвання свайго віншавальнага паслання ў эфіры святочных выпускаў праграмы «Вітаем, віншуем, жадаем».**

На працягу эфірнай акцыі будзе праходзіць сімвалічная перадача эстафеты ад Года моладзі Году культуры, якім аб'яўлены ў Беларусі 2016-ы. Год моладзі будуць прадстаўляць лаўрэаты V Рэспубліканская творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» і прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх арганізацый краіны. Яны раскажуць пра свае галоўныя дасягненні ў адыходзячым годзе.

Якім бачыцца надыходзячы год, раскажуць прадстаўнікі творчых колаў Беларусі — літаратары, драматургі, музыканты, мастакі, скульптары, навукоўцы, педагогі, артысты эстрады, тэатра, кіно і многія іншыя, хто адносіць сябе да культурнай сферы. Менавіта яны стануць галоўнымі героямі рэпартажаў, інтэрв'ю, дыскусій, круглых сталоў, якія прагучаць на працягу 2016 года ў нацыянальным радыёэфіры. Але журналісты галоўнага радыёканала краіны ў Год культуры не будуць абмяжоўвацца толькі тэмай творчасці — плануецца больш шырокая тэматыка радыёперадач.

Па даных сацыялагічных даследаванняў, праведзеных у 2015 годзе, Першы нацыянальны канал з'яўляецца лідарам нацыянальнага радыёэфіру, яго перадачам аддае перавагу кожны пяты радыёслухач краіны. Нагадаем, яго перадачы можна слухаць па праваднай сетцы ва ўсіх абласных цэнтрах краіны, на доўгіх, ультракароткіх хвалях, у FM-дыяпазоне, а таксама ў рэжыме рэальнага часу ў сетцы інтэрнэт на сайце radio1.by і ў лічбавым стандарце DVB-T. Заставайцеся ў кампаніі любімага радыё.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Алена ДРАПКО. drapko@zviazda.by

■ Сачыце за эфірам

# У ДОБРАЙ КАМПАНІІ

**Эфір «Беларусь 1» будзе багатым на сюрпрызы: эксклюзіўныя прамыя трансляцыі, гучныя кінапрэм'еры, паказы любімых фільмаў, віншаванні ад вядучых канала...**

Прыемным бонусам для гледачоў стануць спецыяльныя святочныя выпускі кулінарных праектаў на «Беларусь 1», у якіх вядучыя падзеляцца любімымі рэцэптамі да навагодняга стала. Так, 2 і 3 студзеня (10.15) у святочных выпусках праекта «50 рэцэптаў першага» гледачам будзе прадстаўлена наступнае меню: грудка гусака з ягадным соусам і баклажанай ікрой, «Панна Кота» з кававым і ягадным соусамі, курыныя ножкі са шпінатам і шашлык з гародніны, селядзец «пад шубай» у новым выкананні.

Добры настрой галоўны тэлеканал краіны традыцыйна будзе падтрымліваць тэматычным кінапаказам. 31 снежня ў эфіры выйдзе меладрама «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш», а потым эстафету падхопяць фільмы «За два кіламетры да Новага года», «Ёлкі», «Кухня ў Парыжы». Не дадуць засумаваць камедыя «Горка!», меладрама «Памылкі кахання» і фільм «Навагодняя жонка». Прыемным сюрпрызам для тэлеаўдыторыі стануць паказы спецыяльных святочных ролікаў з удзелам супрацоўнікаў тэлеканала.

На гэтым тэлевізійныя падарункі не скончацца. Новы год на «Беларусь 1» парадуе новымі арыгінальнымі праектамі ад Агенцтва тэлевізійных навін, парад якіх пачнецца ў канцы студзеня. У прыватнасці, у эфір выйдзе 4-ы сезон праекта «Лёс гігантаў», дзесяць серый якога будуць прысвечаны прадметам побыту, без якіх нельга было ўявіць наша жыццё на працягу многіх дзесяцігоддзяў, але якія сталі «ахвярамі» прагрэсу і адышлі ў нябыт...

Сюрпрызам стане і новае афармленне любімых праграм, сярод якіх «Галоўны эфір», «Клуб рэдактараў», «Буйным планам», «Форум», «Беларуская часінка», «Добрай раніцы, Беларусь!». Зменяцца не толькі дэкарацыі, але і напаўненне праграм. Акрамя гэтага, у планах АТН запуск новых праектаў. Таму атрымліваць падарункі гледачы «Беларусь 1» будуць і пасля Новага года — сачыце за эфірам і адзначайце навагоднія святы разам з галоўным каналам краіны!

**Алена ДРАПКО.**

## «БТшнікі» руляць,

### або Гісторыя з працягам

**1 студзеня 2016 года Беларускаму тэлебачанню спаўняецца 60 гадоў. Як прысвячэнне гэтай падзеі ў эфіры «Беларусь 1» будзе паказаны фільм-рэпартаж «БТшнікі», дзе мы ўбачым мноства партрэтаў, рэканструкцыю падзей, архіўныя матэрыялы і расследаванні. Фільм адлюстроўвае погляд творчай групы Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі на гісторыю айчыннага тэлебачання.**

— «БТшнікі» — гэта своеасаблівы тэлевізійны летапіс, прысвечаны станаўленню і развіццю нацыянальнага тэлебачання. Знакавыя падзеі, цікавыя факты, гучныя імёны тых, хто стаяў ля вытокаў, і, безумоўна, вядомыя тэлегледачам персоны, якія працягваюць тварыць гісторыю сёння. Усё гэта і шмат чаго яшчэ сабралі карэспандэнты АТН пад кіраўніцтвам Міхаіла Равуцкага, — адзначыў галоўны дырэктар Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант.

Нас чакаюць людзі і героі ў кадры і «за кадрам», дакументы пад грыфам «строга сакрэтна», якія будуць раскрыты ўпершыню, сустрэчы з «першапраходцамі», праўда і міфы пра тэлебачанне. Аўтар фільма Міхаіл Равуцкі адзначае: «Гэты фільм — частка вялікай тэлевізійнай гісторыі, якая пачыналася ў 50-я гады і сёння працягвае стварацца на вачах у гледачоў на розных кнопках. У гэтым сэнсе сімвалічна, што наша стужка не заканчваецца цітрамі, а перадае ў эфіры эстафету «Панараме».

Не прапусціце прэм'ерны паказ фільма-рэпартажу 1 студзеня ў 20.00 у эфіры тэлеканала «Беларусь 1». А паўтор глядзіце 10 студзеня ў 11.00.

# ПАНЯДЗЕЛАК, 4 СТУДЗЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 22.40** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05 Серыял «Крыху не ў сабе». 1-я серыя.**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10 Камедыя «Залатая нявеста».**
**13.10, 15.25 Меладрама «Правінцыйная муза».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00, 21.40 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».**
**21.00** Панарама.
**23.15** Дзень спорту.
**23.30 Меладрама «Прадаецца кошка».**

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 9.35, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** Беларуская кухня.
**10.10** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.40** «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**11.35** Азбука густу.
**12.15** Навуковае шоу прафесара Адкрываўшкіна.
**12.40** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**13.15** «Разбуральнікі міфаў».
**14.15** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**15.25 Меладрама «Шукаю нявесту без пасагу».**
**17.15** Перазагрузка.
**18.05 Серыял «Вароніны».**
**19.05 Серыял «Кухня».**
**20.00 Серыял «Шурачка».**
**21.10** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**22.05** КЕНА.
**22.10** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.

**23.05** Рэпарцёр.
**23.55 Серыял «Косці».**
**0.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20, 14.20, 18.10, 23.40** «Калейдаскоп».
**7.35** «Сусветная карцінная галерэя».
**8.05 «Навагоднія прыгоды ў ліпені». Фільм-казка.**
**9.20, 17.45** М/ф.
**10.05 «Хаджэнне за тры моры». Маст. фільм.**
**12.30** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**13.20** «Наперад у мінулае».
**13.50, 21.00** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**14.35 «Знахар». Меладрама.**
**16.40 «Госця з будучыні». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**18.30 «Дабравольцы». Драма.**



**20.00** «Каб жылі іншыя». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.35** «Прыгоды Несцеркі». М/ф.
**22.25 «Кантрольная па спецыяльнасці». Меладрама.**
**23.55** «Геапалітыка: свет за тыдзень».

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.35** Авертайм.
**8.00, 12.00** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Тотэнхэм».
**14.00** Спорт, спорт, спорт. Кароль Румель.

**14.30** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Ніжні Ноўгарад» — «Цмокі-Мінск».
**16.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**17.05** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20.
**19.20, 21.40** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Ак Барс» (Казань).
**21.50** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. 1/2 фіналу.
**23.45** Хакей. Калядны турнір.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Яўгенія Ханаева. З антрактам на каханне».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Маст. фільм «Тры мушкецёры».**
**13.10** «Адгадай мелодыю».
**13.55, 16.20** «Кропля ў кроплю». Фінал.
**18.20** «Адваротны адлік». «Тэлебачанне па-савецку. Глядзець не шкодна».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Прынц Сібіры».**
**22.55 Маст. фільм «Месяц».**
**1.25** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20** «Ведай нашых!»
**6.35** «Дакументальны праект»: «Пісьмы з космасу».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**7.45** «Такі лёс».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне»
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».

**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50 Фантастыка «Матрыца: Рэвалюцыя».**
**16.00** «Дарагая перадача».
**16.50** «Чыстая праца».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «З кім скрыжавалі чалавека?».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Усё, што нам трэба...». 1-я і 2-я серыі.**
**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00 Маст. фільм «Байран».**

## МІР

**6.00** М/ф.
**6.45** Дыскатэка 80-х.
**9.30** «Трэш-тэст».
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**11.50 Маст. фільм «Дзед Мароз паняволі».**
**13.20 Маст. фільм «Ён горшы за мяне».**
**15.10** «Практычная магія».
**16.15, 3.00 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».**
**19.15 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай». 1—2 серыі.**
**21.05 Маст. фільм «Есці пададзена!».**
**22.40 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**0.25 Маст. фільм «Эльвіра: Уладарка цемры».**
**2.10 Серыял «Чорны пакой».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** М/ф.
**7.50 Серыял «Даярка з Хацепетаўкі. Выклік лёсу».**
**9.25, 11.25, 14.15 Серыял «Сваты».**
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.55 Маст. фільм «Павер, усё будзе добра...».**
**17.00** «Новая хваля-2015. Найлепшае».

**18.10 Маст. фільм «Каралі».**
**20.35** «Петрасян-шоу».
**22.20, 23.10 Серыял «Паміж намі, дзяўчатамі».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Дзікі свет».
**6.25, 8.20 Серыял «Таксісткa».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20 Серыял «Таксістка» (працяг).**
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.55 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.30, 13.20 Серыял «Рускі дубль».**
**14.25 Серыял «Браценікі».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Выратавальнікі».
**18.15** «Следства вялі...»
**19.20 Серыял «Павуцінне».**
**22.40 Серыял «Расклад лёсаў».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 19.50 Серыял «Бібліятэкары».**
**8.20 Камедыя «Гусарская балада».**
**10.00, 16.30** «Аналітычная праграма».
**10.10 Меладрама «Вакзал для дваіх».**
**12.30** «Кінаблакнот».
**12.45, 13.50, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 21.00** «Хатняя крама».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Палюбоўніцы».**
**17.00 Камедыя «Касмічныя сябры».**
**18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Востраў».**
**23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

## ВТБ

**6.00, 9.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 18.00, 22.15** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00, 14.30, 23.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30, 15.00** «Ералаш».
**10.00, 5.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**11.00** «Наш Новы год». 70-я.
**12.30** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**16.00** «Турбаміксер».
**17.30, 23.30, 4.30** «Лаві момант».
**19.00, 0.00** «Уральскія пельмені».
**20.00** Камедыя «Прышэльцы».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00** Навіны культуры.
**10.20** «На падмостках сцэны». Маст. фільм.
**11.45** «Васіль Васільевіч Мяркур'еў». Дак. фільм.
**12.25** «Узыходзячыя зоркі. Навучальны год у Балетнай школе Парыжскай нацыянальнай оперы». Дак. серыял. 1-я серыя.
**12.55, 22.45** «Фантамас». Серыял.
**14.25** «Зоркі пра неба. Наталля Нарочніцкая». Дак. фільм.
**14.50, 1.40** Краіна птушак. «Совы. Дзеці ночы». Дак. фільм.
**15.45, 0.15** «Адлюстраваны час... Крамлёўскія ёлкі». Дак. фільм.
**16.15** Салісты Нацыянальнага акадэмічнага аркестра народных інструментаў Расіі імя М.П. Осіпава.
**16.50** Сяргей Безрукаў, Міхаіл Хамякоў, Наталля Ягорава ў спектаклі Тэатра-студыі пад кіраўніцтвам А. Табакова «На ўсякага мудраца даволі прастаты».

**19.45** Юбіляры года-2015. Алег Табакоў. Лінія жыцця.
**20.40** «Каралева чардаша». Ганна Нятрэбка і Хуан Дыега Флорэс у навагоднім гала-канцэрце з Дрэздэна.
**22.20** «Зоркі пра неба. Наталля Нарочніцкая». Дак. фільм.
**0.45** «Мядзведзь». Маст. фільм.
**1.30** «Маленькая начная сімфонія». М/ф для дарослых.
**2.35** І. Штраус. «Не толькі вальсы».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** Маст. фільм «Ваенна-палявы раман».
**7.30** «Зямля — Паветра». Пётр Мамонаў. 2002 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Ехалі мы, ехалі».
**11.10, 13.30, 15.25, 17.05, 19.00, 21.40, 22.55, 0.50, 2.50, 3.40, 4.55** Музычная настальгія.
**12.00** «Зямля — Паветра». «Акварыум». 2002 год.
**14.00** Фільм-канцэрт «Дыскжакей». 1987 год.
**16.00** Маст. фільм «Ні пуху, ні пер'я!»
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Эрык Клэптан». Аляксей Аграноўскі, Уладзімір Мацецкі. 2005 год.
**19.20** «Зямля — Паветра». Гр. «Начныя снайперы». 2002 год.
**20.50** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» А. Шыврынт, М. Дзяржавін.
**1.20** «Зямля — Паветра». «Няшчасны выпадак». 2002 год.

## EUROSPORT 1

**8.45, 13.15** Зімовыя віды спорту.
**9.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**10.30, 1.30, 3.30** Ралі-рэйд. Дакар.

**11.00, 14.15** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету.
**12.00** «Усе віды спорту».
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**15.30, 2.00** Тэніс. Турнір АТР.
**22.30** Дартс. Чэмпіянат свету.

## КАМЕДЫЯ

**1.00, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчком «Паміж намі».
**1.15, 23.00** Камедыя «Вясельная вечарынка».
**3.00** Серыял «Пакетная здзелка».
**4.00** Камедыя «Кахаю тваю жонку».
**5.45** Камедыя «Зануда».
**7.20, 21.30** Камедыя «Касцюм Санты».
**9.00** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**10.40** Камедыя «12 калядных сабак. Цудоўнае выратаванне».
**12.30** Камедыя «Палярны рэйс».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Пяць нявест».
**18.00** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**19.40** Камедыя «Каманда мары».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 5.35** «Доктар І ...»
**8.20** «Аддам жонку ў добрыя рукі». Меладрама.
**9.55, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.45** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30** «Мая мама Снягурка». Меладрама.
**15.10, 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**16.05** «Мой герой».

**16.55** «Самацветы. Фабрыка Юрыя Малікава». Дак. фільм.
**18.00** «Брыгада». Серыял.
**19.00, 1.35** «Лера». Меладрама.
**20.55, 0.50** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**21.55** «Выратуйце нашы душы». Серыял.
**22.55** «Часова даступны».
**0.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

## ТБ1000

**7.05** Меладрама «Розум і пачуцці».
**9.20** Баявік «Напруж звіліны».
**11.10** Драма «Усмешка Моны Лізы».
**13.05** Фантастыка «2012».
**15.40** Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**18.00** Фантастыка «Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца». Частка І.
**20.00** Меладрама «Яшчэ адна з роду Болейн».
**22.00** Драма «Жнівень».
**0.10** Меладрама «Даю год».
**2.00** Трылер «8 міліметраў».
**4.00** Драма «Не злоўлены, не злодзей».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Карасі».
**8.10** Меладрама «Афінскія вечары».
**9.50** Прыгоды «Вязень замка Іф. Абат Фарыя».
**11.05** Прыгоды «Вязень замка Іф. Граф Монтэ-Крыста».
**12.20** Прыгоды «Вязень замка Іф. Аз аддам».
**14.00** Трылер «Уцекачы».
**15.40** Трылер «Вій 3D».
**18.10** Камедыя «Мамы 3».
**20.00** Меладрама «Іронія кахання».
**21.40** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**23.40** Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
**1.45** Меладрама «Аднойчы».
**3.20** Меладрама «М+Ж».
**4.40** Драма «Доўгія праводзіны».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 13.50** Гульні розуму.
**7.15** Папулярная навука.
**7.35, 13.20** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Незвычайныя здабычы.
**8.45** Тэхасکі ўлоў.
**9.30, 14.10, 19.30** Світанне чалавецтва.
**10.20, 14.50, 20.15** Місія на Марс.
**11.00** Сіла племені.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.35** Золата Юкана.
**15.40** Мядзведжы качэўнік.
**16.25** Тайны гарыл.
**17.10** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**18.00** Цунамі.
**18.40, 21.45, 0.00, 1.30, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**21.00, 0.45, 3.55** Ліхтугі за мяжой.
**22.30** Зона 51.
**23.15** Уварванне на Зямлю.
**3.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.

## DISCOVERY

**6.00, 10.30** Дарожныя каўбоі.
**6.50** Нябачныя светы.
**7.45** Як гэта зроблена?
**8.15** Як гэта ўстроена?
**8.40** Прапажы на продаж.
**9.35, 5.15** Гульня на жыцці.
**11.25** Інжынерныя праліcкі.
**12.20** Падарожжа ў невядомасць.
**13.15** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**14.10** У пошуках скарбаў.
**20.00** Выжыць разам.
**21.00** Голыя і напалоханыя.
**23.00** Бар на заказ.
**1.00** Вяртанне белай забойцы.
**2.00** Маланкавыя катастрофы.
**2.25** Сапраўдныя аферысты.
**2.50** Бітвы за кантэйнеры.
**3.40** Хуткія і гучныя.
**4.25** Звышчалавечая навука.

## СЕРАДА, 6 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Богаяўленне.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Крыху не ў сабе».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Не жаночая справа».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».**
**21.00** Панарама.
**21.40** Святочнае Богаслужэнне на Раство Хрыстова з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
**23.40 Меладрама «Павер, усё будзе добра...».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** Беларуская кухня.
**9.35** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.10** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**11.10, 17.05 Трылер «Зачыненая школа».**
**12.10 Серыял «Косці».**
**13.05** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**14.05, 18.05 Серыял «Варонiны».**
**15.05, 20.00 Серыял «Шуранка».**
**16.05, 19.00 Серыял «Кухня».**
**21.10 Камедыя «Ноч у музеі».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**23.15 Камедыя «Ноч у музеі 2».**
**1.00 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20, 12.00, 18.45, 23.40** «Калейдаскоп».
**7.35, 12.15, 19.00, 0.00** «Размовы пра духоўнае».
**7.45** «Сусветная карцінная галерэя».
**8.20, 16.10 «Госця з будучыні». Маст. фільм.**



**9.20, 15.40** М/ф.
**9.50 «Слон». Драма.**
**11.20** «Вадзім Юсаў. Год і ўсё жыццё». Дак. фільм.
**12.25, 23.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Уладзіміра Солтана.
**12.50 «Трактарысты». Меладрама.**
**14.15** «Славянскі базар-2014». Надзея Кадышава і ансамбль «Залатое кальцо».
**17.15 «Бывай, паўднёвы горад». Драма.**
**19.10 «Па галоўнай вуліцы з аркестрам». Трагікамедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Масква — Мінск. Кінатранзіт». Ларыса Шапіцька. «Узыходжанне». Дак. фільм.
**21.25 «Узыходжанне». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**6.50, 19.20, 21.40** PRO спорт. Навіны.
**7.00** Козел пра футбол.
**7.20, 13.00, 23.55** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен.
**9.20** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Матч за 3-е месца.
**11.10, 21.50** Хакей. Калядны турнір.
**15.00** Спорт-кадр.
**15.30** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Фінал.
**17.30** Баскетбол. НБА. «Чыкага» — «Мілуокі».
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Лада» (Тальяці).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Разам з дэльфінамі».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Маст. фільм «Тры мушкецёры».**
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20 Серыял «Серафіма Цудоўная».**
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Прынц Сібіры».**
**22.55 Маст. фільм «Жаданне».**
**0.45** «Цудатворцы XX стагоддзя».
**1.40** «Віфлеем. Горад Ісуса».
**2.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20** «Ведай нашых!»
**6.40** Дакументальны праект: «Згублены свет».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**7.45** «Дакументальны праект»: «Братэрства Сусвету».
**8.40 Фільм-дзецям «Вясновая казка».**
**10.00** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.45** «Званая вячэра».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50 Маст. фільм «Усё, што нам трэба...». 3—4-я серыі.**
**15.45** «Эліксір маладосці».
**16.50** «Чыстая праца».
**17.35** «Дарагая перадача».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Горад анёлаў».**
**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20 Маст. фільм «Падарожжа да Калядная зоркі».**
**0.40** Дакументальны праект: «Марская планета».

### МІР

**5.30** М/ф.
**8.00 Маст. фільм «Дзед Мароз паняволі».**
**9.30** «Трэш-тэст».
**10.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**11.55 Маст. фільм «Есці пададзена!».**
**13.30 Маст. фільм «Усплёск».**
**15.10** «Практычная магія».
**16.15 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».**
**19.15 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**21.00** Боская літургія на свята Нараджэння і Богаяўлення Госпада нашага Ісуса Хрыста.
**21.35 Маст. фільм «Я жадаю табе сябе».**
**23.10** Нараджэнне Хрыстова!
**1.10 Маст. фільм «Прадаецца дача».**
**02.55 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава».**
**4.30** «Тайны часу».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**8.00 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».**
**9.35, 11.25, 14.15 Серыял «Сваты».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**13.50, 16.50, 19.50, 22.50** Навіны — Беларусь.
**15.10** «Калядная «Песенька года».
**16.25, 17.00 Маст. фільм «Дом спячых прыгажунь».**
**20.35 Серыял «Паміж намі, дзяўчатамі».**
**23.00** Нараджэнне Хрыстова. Прамая трансляцыя ўрачыстага Калядная богаслужэння.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Дзікі свет».
**6.20, 8.20 Серыял «Таксістка».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.55 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.30, 13.20 Серыял «Рускі дубль».**
**14.25 Серыял «Браценікі».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Выратавальнікі».
**18.15** «Следства вялі...»
**19.20 Серыял «Павуцінне».**
**22.40 Серыял «Расклад лёсаў».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.55, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 9.35, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 20.00 Серыял «Бібліятэкары».**
**8.25, 9.30, 13.50, 15.45, 16.30, 18.10, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**8.30, 18.20 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак.
**11.00 Камедыя «Снежны анёл».**
**12.50** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Палюбоўніцы».**
**16.45 Серыял «Дванаццаць калядных жаданняў».**
**19.20** «Мой любімы гадаванец».
**20.45** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «На мяжы».**
**23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00, 9.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 18.00, 22.30, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00, 22.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30, 15.00** «Ералаш».
**10.00, 5.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**11.00, 3.30** «Наш Новы год». 90-я.
**12.30** Камедыя «Прышэльцы 2: Калідор часу».
**16.00** Камедыя «Капітаны».
**17.30, 23.00** «Лаві момант».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.00** Камедыя «Ёлкі лахматыя».
**0.00** Канцэрт А. Макарэвіча «Усё вельмі проста».
**2.00** «Наш Новы год». 80-я.

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Навіны культуры.
**10.20** 105 гадоў з дня нараджэння Мікалая Кручкова. «Нябесны ціхаход». Маст. фільм.
**11.35** «Мікалай Кручкоў». Дак. фільм.
**12.15, 2.50** «Пётр Першы». Дак. фільм.
**12.25** «Узыходзячыя зоркі. Навучальны год у Балетнай школе Парыжскай нацыянальнай оперы». Дак. серыял.
**12.50** Пернікавы домік. «Крохкі цуд».
**13.20, 1.55** «Дзікія астравы». Дак. серыял.
**14.15** «Феафан Пустэльнік». Дак. фільм.
**14.55** Урачыстае закрыццё XVI Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунок» у КЗЧ.
**16.35** Іна Чурыкава, Віктар Ракаў у спектаклі тэатра «Ленкам» «Хлусня дзеля выратавання».
**18.50** «Песні кахання». Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**19.45** Юбіляры года-2015. Ілья Глазуноў. Лінія жыцця.
**20.40** Д. Пяўцоў, Д. Дзюжаў, Б. Плотнікаў, А. Пагудзін, Я. Смальянінава і хор Маскоўскага Срэценскага манастыра ў музычнай пастаноўцы па кнізе архімандрыта Ціхана (Шаўкунова) «Несвятыя святыя».
**22.10** «Маналог». Маст. фільм.
**23.45** «Лета Гасподняе». Калядны.
**0.15** «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм.
**1.30** «Ерусалімскія аліўкі». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Эрык Клэптан». Аляксей Аграновіч, Уладзімір Мацецкі. 2005 год.
**7.00, 9.40, 11.00, 12.20, 14.20, 15.40, 17.00, 18.40, 20.20, 21.40, 23.10, 1.30, 3.25, 5.10** Музычная настальгія.
**7.20** «Зямля — Паветра». Гр. «Начныя снайперы». 2002 год.
**8.50, 14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Клара Навікава.
**13.00** «Зямля — Паветра». Аляксандр Маршал. 2002 год.
**18.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1992 год.
**19.00** Маст. фільм «Дубраўка».
**0.00** «Зямля — Паветра». «Акварыум». 2002 год.
**2.00** Фільм-канцэрт «Дыскжакей». 1987 год.
**4.00** Маст. фільм «Ні пуху, ні пер'я!»

### EUROSPORT 1

**2.30, 5.00, 9.30** Тэніс. Турнір АТР.
**3.30, 7.00, 11.00, 18.30, 0.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 22.00, 22.35** Дартс. Чэмпіянат свету.
**8.30, 12.15, 14.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**10.30, 22.30, 1.00** Ралі-рэйд. Дакар.
**12.45, 15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**17.15, 21.00, 1.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.

### КАМЕДЫЯ

**0.45, 23.00** Камедыя «12 калядных сабак. Цудоўнае выратаванне».
**2.25** Меладрама «Домік у сэрцы».
**4.00** Камедыя «Ёлкі 3».
**5.45** Камедыя «Свята пад замком».
**7.20, 21.30** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**9.00** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**10.40** Камедыя «Каманда мары».
**12.30** Камедыя «Чалавек-эльф».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Любовь-моркоўь».
**18.00** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**19.40** Камедыя «Любовь-морковь 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І ...»
**8.20** «Грахі нашы». Драма.
**9.55, 4.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 5.10** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30, 17.55** «Брыгада». Серыял.
**14.35** «Простыя складанасці».
**15.10, 3.40** «Нераскрытыя тайны».
**16.10** «Мой герой».
**17.00** «Родныя сувязі. Ад любові да нянавісці». Дак. фільм.
**19.00, 2.05** «Сядзелка». Меладрама.
**20.55** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**21.55** «Выратуйце нашы душы». Серыял. Заключная серыя.
**22.55** «Зорныя гісторыі».
**23.55** «Вялікія святы: Каляды».
**0.25** «Янтарныя крылы». Меладрама.

### ТБ1000

**6.00** Меладрама «Замуж на 2 дні».
**8.00** Меладрама «Іспанская-англійская».
**10.30** Меладрама «Розум і пачуцці».
**13.00** М/ф «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
**14.40** Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж. К. Роўлінг».
**16.10** Меладрама «Крок наперад: Усё ці нічога».
**18.00** Прыгоды «Чарлі і шакаладная фабрыка».
**20.00** Меладрама «Жонка вандроўніка ў часе».
**21.50** Драма «Філамена».
**23.30** Баявік «Напруж звіліны».
**1.30** Драма «Не злоўлены, не злодзей».
**4.00** Меладрама «Пазбаўце нас ад Евы».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Прыгоды «Вязень замка Іф. Граф Монтэ-Крыста».
**7.40** Прыгоды «Вязень замка Іф. Аз аддам».
**9.25** Камедыя «Сірата казанская».
**11.05** Казка «Чароўны партрэт».
**12.45** М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».
**14.05** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
**15.35** Драма «Дуброўскі».
**17.50** Драма «Географ глобус прапіў».
**20.00** Камедыя «Любовь-морковь 2».
**22.00** Драма «Чэмпіёны».
0.00 Меладрама «8 новых спатканняў».
**1.30** Меладрама «Афінскія вечары».
**3.00** Камедыя «Каўказская палонная!».
**4.50** Меладрама «М+Ж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 9.30, 13.45, 19.30** Гульні розуму.
**7.15** Гісторыя ежы.
**7.35, 13.20** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Ліхтугі за мяжой.
**8.45, 0.00, 2.15, 5.15** Расследаванні авіякатастроф.
**10.10, 14.50, 20.15** Як перамагчы ва ўсім.
**11.00** Сіла племені.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.35** Золата Юкана.
**15.40** Мядзведжы качэўнік.
**16.25** Каралева гіен.
**17.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**18.00, 21.00, 0.45, 3.45** Ледзяная дарога.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Непакорлівы вострaў.
**22.30** Тайны гісторыі.
**23.15** Уварванне на Зямлю.
**3.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.

### DISCOVERY

**6.00, 10.30** Легендарны аўтамабіль.
**6.50** Хаос у дзеянні.
**7.45** Як гэта зроблена?
**8.15** Як гэта ўстроена?
**8.40** Іржавая імперыя.
**9.35, 12.20, 5.15** Падарожжа ў невядомасць.
**11.25** Інжынерныя пралікі.
**13.15** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**14.10** Стальныя хлопцы.
**18.00** Марпех Дуг.
**20.00** Паляўнічыя на зброю.
**21.00** Паляўнічыя на старызну.
**22.00** Ліквідатар.
**23.00** Бар на заказ.
**0.00** Мужчынскія бярлогі.
**1.00** Акулы-ніндзя.
**2.00** Маланкавыя катастрофы.
**2.25** Сапраўдныя аферысты.
**2.50** Склады.
**3.40** Кубінскі хром.
**4.25** Гіганцкія мячы.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Захочацца перамен, вызвалення ад усяго, што скоўвае, толькі паспрабуйце своечасова спыніцца, каб не разбурыць тое, што вам дорага. Давядзецца ўзяць на сябе галоўную ролю ў сямейных пытаннях. У сярэдзіне тыдня паўстане неабходнасць прыняць няпростае рашэнне ці зрабіць выбар. Каб прасоўвацца далей, трэба ўзяць з сабой адно і адмовіцца ад іншага. Шмат у чым гэта тычыцца асабістага жыцця. Вы зможаце справіцца са сваімі эмоцыямі і падпарадкаваць іх розуму, што дазволіць рабіць прадуманыя крокі і прымаць узважаныя рашэнні. З'явіцца магчымасць пераканаць іншых людзей і павесці іх за сабой.



**ЦЯЛЕЦ.** Паспрабуйце не прыдзірацца да навакольных, іх дробныя прамашкі — гэта не нагода ствараць буру ў шклянцы вады. Ад вас спатрэбіцца ўзмоцненая і карпатлівая праца. Можна сказаць, што нічога незвычайнага ў гэты час не адбудзецца, тым больш што вы прывыклі шмат працаваць і вам гэта не ў навіну і не ў цяжар. У той жа час з'явіцца жаданне і магчымасць зірнуць на ўсё пад іншым вуглом. А перагледзеўшы сваё стаўленне да многіх фактаў, акуржэння і праведзенай работы, вы захочаце змяніць і сваё жыццё.



**БЛІЗНЯТЫ.** Пажадана ні з кім не спрачацца і не канфліктаваць. Актыўная прaява эмоцый на гэтым тыдні не давядзе вас да дабра. У вас ёсць магчымасць стрымаць сябе і кантраляваць унутраныя парывы, але, верагодна, вы будзеце дзейнічаць наадварот, каб выплюхнуць сваё абурэнне з падвоенай сілай. Адзін з самых удалых дзён тыдня — чацвер. Падарожжы прынясуць разнастайныя ўражанні, вы даведаецеся шмат новага і цікавага. А канец тыдня лепш правесці ў цішыні і адзіноце, ні з кім не размаўляючы і нічога не робячы.



**РАК.** Асноўнымі падзеямі гэтага тыдня могуць стаць справы, звязаныя з сям'ёй і домам. У аўторак вас могуць наведаць новыя каштоўныя ідэі — паспрабуйце іх ажыццявіць. Вы з лёгкасцю зможаце ліквідаваць практычна любы канфлікт, проста накіраваўшы энергію адносін на агульную справу. Тыдзень спрыяльны для ўсіх, хто шукае сваю другую палоўку, жадае новых пачуццяў або хоча адрадзіць старыя адносіны, дадаўшы ім сіл і страсці. Атрымлівайце асалоду ад прыемных момантаў, але не забывайцеся захоўваць здаровы сэнс.



**ЛЕЎ.** Не варта спрабаваць фарсіраваць падзеі. Проста не звяртайце на іх увагі — тады цяжкасці знікнуць самі сабой. З'явіцца магчымасць пазнаёміцца з новымі людзьмі, узбагаціць сябе новымі ўражаннямі. У вызвалення лепш не абвастраць адносіны непатрэбнымі сваркамі: у выніку спрэчкі вы станеце прайграўшым бокам. Праца, якую давядзецца рабіць у пачатку тыдня, вам хутка надакучыць, і захочацца змяніць становішча. У другой палове тыдня вы не толькі ўнесяце перамены ў сваю штодзённасць, але і будзеце адчуваць сябе радасна і камфортна ў гэтым.



**ДЗЕВА.** Карысна будзе паразважаць і супаставіць прычыны і следства вашых жыццёвых сітуацый. Не варта прымаць паспешных рашэнняў, будзьце разважлівыя. Зараз вы працуеце на сваю будучыню. У выхадныя надайце больш увагі сям'і і дзецям. У пачатку тыдня ўсё будзе ісці добра і спакойна, вы зможаце займацца звыклымі справамі, атрымліваючы ад гэтага задавальненне. Канец тыдня можа прынесці сумныя падзеі і расчараванні, але разам з тым і перамены, якія дазволяць рухацца далей.

■ Гатуй сваё

# ШЛЯХЕТНАЯ ГУСЬ І ВІННЫЯ АНДРУТЫ

## Як накрыць святочны стол у нацыянальнай традыцыі?



**— У маёй сям'і самымі любімымі святамі былі Каляды і Вялікдзень. Абавязкова ўсе павінны былі прысутнічаць за калядным сталом, бо лічылася, што тады будзе шчаслівы год. І я назірала, як рыхтаваліся да свята, — расказвае даследчыца нацыянальнай кухні Ларыса МЯТЛЕЎСКАЯ. — Па-першае, бацькі стараліся закалоць кабанчыка. Бо яшчэ ў язычніцкія часы свінню прыносілі ў якасці ахвяры багам. З тых часоў для нашай традыцыі свіння — гэта сімвал дабрабыту. А яшчэ былі козы. Аднойчы ў мяне былі чароўныя Каляды! Майму сыну было гадоў восем. І калі сцямнела і з'явілася першая зорка, перад тым, як сесці за стол, мы пайшлі ў хлеў усе разам даіць казу. На дварэ — мароз траскучы, а мы з сынам зарыліся ў сена. Цішыня ў хляве, толькі струменьчыкі малака аб вядро цыркочуць. І я падумала: «Вось яно, шчасце!»**

На Беларусі Калядою, уласна, называюць тры дні: дзень перад Раством, перад Новым годам (Васілле) і перад Вадохрышчам. Гэтыя тры Каляды яшчэ называюць Куццёй. Першая і апошняя — Посная каляда, альбо Посная куцця. Вадохрышчанскую куццю яшчэ называюць Беднай. У гэтыя дні падаюць посныя стравы. А ў дзень перад Новым годам — Тоўстая каляда, альбо Шчодрая куцця, таму і называюць яшчэ свята Шчадрэц. Раней гэты дзень сапраўды прыпадаў на Новы год, а цяпер праваслаўныя адзначаюць яго з 13 на 14 студзеня.

На ўсе куцці заўсёды гатуецца багатая вячэра. Прычым, калі гатуюць посную ежу, гэта не значыць, што стол бедны. Такіх страў робяць шмат, і яны смачныя. Ёсць смакоцці, якія павінны абавязкова прысутнічаць на стале. Па-першае, «царыца» стала — сама куцця. Гэта каша з абтоўчаных ячных круп. Склад куцці залежаў не толькі ад посту, але і ад дабрабыту сям'і. Калі яна была бедная, то варылася проста падсалоджаная мёдам (сытой) каша. Традыцыйная куцця, апроч мёду, запраўлялася яшчэ алеем. А на Шчадрэц можна было гатаваць яе з салам. Таксама Васілёва куцця можа гатавацца з макам, арэхамі і сухафруктамі. Прычым на ўсе тры дні куцця варыцца з адлолькавай колькасці круп, у адным гаршку. На стол яна падаецца першай, але ядуць куццю апошняй. Верхнюю яе частку здымаюць і аддаюць курам і іншай свойскай жывёле, каб яна была здаровай. Ні падчас прыгатавання, ні падчас таго, як куцця «чакае» на покуці свайго часу, яе нельга каштаваць. Акрамя іншага, яе ядуць заўсёды халоднай.

Абавязкова на святочным стале павінны прысутнічаць альбо бліны, альбо аладкі — посныя ці багатыя. Казалі: *«Калядкі — вясёлыя святкі: бліны ды аладкі»*. Яны сімвалізавалі сонца.

Апроч абавязковых смакоццяў, нашы продкі падавалі на святочны стол тыя, што былі характэрны для іх мясцовасці. Вельмі добрай традыцыяй лічылася рабіць свежыну. Трэба было закалоць кабанчыка і загадзя нарыхтаваць пэўных страў: вантрабянку (альбо сальцісон), пальцам пханыя каўбасы. Рабілі розныя мясныя стравы, халадцы, прычым не толькі з мяса, але і з рыбы.

У беларусаў была вельмі цікавая традыцыя на Шчадрэц, на жаль, ужо страчаная. Выпіўшы першую чарку, гаспадар казаў: *«Судзі, Божа, каб на другі год прыждалі ў шчасці, у долі і ўсякай добрай памыснасці, каб жывы і здаровы былі, каб разам святую куццю спраўлялі; судзі, Божа!»* Яму адказвалі ўсе: *«Судзі, Божа!»* Гэтак па чарзе, прымаючы чарку з рук у рукі, усе выказвалі свае найлепшыя зычэнні, але ўжо іншымі словамі, і выпівалі чарку. Ніхто пры гэтым не выпіваў лішку: піў толькі той, хто гаварыў. Увогуле, да спіртнога ставіліся раней па-іншаму, быць п'яным было непрыстойна.

З часам традыцыі святкаванняў і святочнай ежы ў нас моцна памяняліся. Натуральна, мы ўжо ў большасці сваёй не можам гатаваць у печы. Але цяпер ёсць мультыварткі, у якіх ежа атрымліваецца вельмі блізкай да «пячной». Калі казаць пра 1960-я гады, я ўзгадваю, як у горадзе святкаваўся Новы год (на вёсцы старэйшае пакаленне яго не адзначала). Сваякі хадзілі адно да аднаго ў госці, і стол ламіўся ад рознай ежы. І гэтая традыцыя вельмі старажытная: лічылася, колькі страў на Васілле прысутнічае на стале, столькі і дабрабыту будзе цэлы год. Хоць некаторых прадуктаў тады было не знайсці, той жа маянэз рабілі самі. І стараліся накідаць на стол розных саленняў, мяса і грыбоў, аднак гэта няправільна, бо так есці — шкодна для здароўя. Таму я вельмі вітаю, што ў апошнія гады людзі не гатуюць столькі ежы, а імкнуцца больш рухацца ў навагоднюю ноч, ходзяць святкаваць кудысьці.

# Што падаць на стол у свята?

Рэцэпты, якія прапануе Ларыса Мятлеўская да навагодняга стала, яна знайшла ў першай беларускай кулінарнай кнізе «Літоўская кухарка» Вінцэнты Завадскай.

Даследчыца раіць не абмінуць у Новы год першыя стравы, напрыклад квас з рыбай. Квас — гэта не той напой, які мы ведаем сёння, а старажытная кіслая страва. Кіслае дапамагае засвойваць сытную ежу. А вось грыбы, хоць і з'яўляюцца адным з асноўных прадуктаў беларускай кухні, варта падаваць у невялікай колькасці, бо гэта вельмі цяжкі прадукт.

Не абавязкова на свята гатаваць шмат нацыянальных страў. Хай яна будзе адна, а астатнія яе будуць адцяняць. Прапануем чытачам некалькі рэцэптаў ад спадарыні Ларысы.

## Густая куцця з макам, або Васілёва куцця

**Спатрэбіцца:** *2 шклянкі панцаку або пшаніцы, 1,5 шклянкі маку, мёд на смак.*

Крупы добра прамыць і замачыць на ноч. Паставіць на агонь і варыць да гатоўнасці. Мак заліць дзвюма шклянкамі кіпеню, паварыць 10 хвілін і астудзіць. Зліць ваду і добра расцерці. Найлепш для гэтага падыдзе гліняная макотра. Змяшаць крупы з макам і сытой. Можна дабавіць крыху тоўчаных арэхаў. Сыта гатуецца з мёду, разведзенага гатаванай вадой.

## Квас з рыбай

Квас з сушанай рыбай варыцца ў некалькі этапаў, і для яго гатавання ў печы спатрэбяцца цэлыя суткі. Акрамя солі і спецый, выкарыстоўваюць толькі хатнія прадукты. Калі няма магчымасці зварыць рыбны квас у печы, то асноўныя этапы гатавання можна ажыццявіць у мультыварцы, а ў канцы скарыстацца плітой, даварыўшы гэтую страву на ёй.

**Спатрэбіцца:** *250 г капуснага расолу, 200 г ячных круп, 6-8 шт. сухіх грыбоў, 1 цыбуліна, пучок зялёнага кропу з сукверцямі, 3 шт. сухой рыбы, 200 г салёнага сала, 1,2 л вады, 0,5 ст. лыжкі солі, 8-12 гарошын перцу, 3 шт. лаўровага ліста.*

З вечара замачыць у цёплай вадзе крупы і грыбы. Раніцай грыбы адцадзіць і нашаткаваць. У чыгунок на 2,5 л усыпаць крупу і грыбы, заліць да паловы вадой і ўставіць у гарачую печ варыцца да гатоўнасці. Тым часам дробна накрышыць цыбулю, каб яна цалкам разварылася ў квасе, і нарэзаць кубікамі сала. Дастаць з печы чыгун і ў зварны крупнік дабавіць цыбулю, сала, рыбу і некалькі сукверцяў кропу, заліць расол, даліць яшчэ трошкі вады і ўставіць варыцца яшчэ на 10 хвілін пры тэмпературы 150 °С. За 5 хвілін да гатоўнасці варыва дастаць, усыпаць соль і ўкласці спецыі: чорны перац, лаўровы ліст і скрышаны кроп. Ставім даварвацца на 5 хвілін.

Разліваючы квас па місках, у кожную кладуць грыбок і кавалачак рыбкі. Ядуць рыбны квас з бульбяной кашай, якая называецца таўкеняй. Лыжку кашы заядаюць дзвюма лыжкамі квасу.



## Гусь печаная з яблыкамі і падліўкай па-літоўску

**Спатрэбіцца:** *1 гусь, соль, 0,5 ст. лыжкі кмену, 2 цыбуліны, 20 дробных і 10 вялікіх яблыкаў, 1 ст. лыжка мукі.*

З укормленай гусі зняць залішні тлушч, нацерці яе соллю і кменам зверху і з сярэдзіны, начыніць дробнымі яблыкамі і пячы на памазанай тлушчам блясе, падсыпаўшы папярэдне жменю сечанай цыбулі і паліваючы спачатку булёнам, а потым сокам, які будзе выцякаць з гусі. Пры падачы абкласці спечанымі асобна яблыкамі, пакласці і тыя, што былі ў сярэдзіне гусі. Соус запраўляць лыжкай мукі. Моцна закіпяціць і абліць гусь, рэшту соусу падаць у соусніцы.

Замест яблыкаў гусь можна начыніць тушанай чырвонай капустай.

Які святочны стол без салодкага? З напояў на беларускім святочным стале заўсёды прысутнічаў узвар з сухафруктаў (дарэчы, нашым продкам добра вядомы былі апельсіны, якія вырошчваліся ў панскіх фальварках. Гэтыя плады называлі аранжыкамі, і іх сухія скуркі таксама дабаўлялі ў кампот для водару).

Замест пірага Ларыса Мятлеўская раіць прыгатаваць андруты. Так на Беларусі называлі... вафельныя трубачкі. Ёсць цікавы рэцэпт.

## Андруты з віном

**Спатрэбіцца:** *2 яйкі, 180 г мукі, 185 г малака, 165 г цукру, 150 г белага віна, 0,5 ст. лыжкі масла.*

Малако альбо вяршкі, патоўчаны цукар, віно, яйкі моцна ўзбіць міксерам, паступова дабаўляючы сухую муку, каб маса атрымалася, як рэдкая смятана. Бо, калі яна будзе занадта густая, то ўсе 180 грамаў мукі не спатрэбяцца. Разагрэць форму для андрутаў, нашмараваць пчаліным воскам альбо маслам, пакласці сталовую лыжку масы і выпякаць яе да залатога колеру. Абрэзаць цеста, што выходзіць за форму, і адразу ж, дастаўшы, згарнуць на качалцы ў трубачку альбо конус.

## «Манашкі» з віном

Страва XIX стагоддзя. Вельмі проста гатуецца. Наліце віно ў глыбокую місачку. Намачыце ў ім абаранчыкі так, каб яны добра набрыняілі, але не развалiліся. Акуратна выкладзіце іх на патэльню і смажце ў гарачым масле або алеі з абодвух бакоў, каб утварылася залацістая скарынка. Пры падачы на стол варта прыпудрыць сцямнелыя ад віна «манашкі» цукрам з карыцай. Дарэчы, калі смажыць на сметанковым масле будзе смачней. Толькі сачыце, каб не прыгарэлі. Запарце гарбату і ласуйцеся на здароўе!

А за гэтымі словамі святкуйце здаровымі! Ды з сямейкаю, ды з вясёленькаю! Смачна есці!

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*




Юлія Сакалова — удзельніца дзіцячага фальклорнага гурта «Калыханка» з аграгарадка Міханавічы Мінскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Студзень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Люты**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | | | | | | |

**Сакавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**Красавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**Май**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**Чэрвень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**Ліпень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Жнівень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**Верасень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

**Кастрычнік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**Лістапад**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

**Снежань**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

# Праваслаўны каляндар

**1 мая Светлае Уваскрэсенне Хрыстова. Пасха. Вялікдзень**

## Двунадзясятыя святы

7 студзеня................................Раство Хрыстова
19 студзеня..............................Хрышчэнне Гасподняе
15 лютага..................................Стрэчанне Гасподняе
7 красавіка ..............................Дабравешчанне
Прасвятой Багародзіцы
24 красавіка ............................Уваход Госпада
ў Іерусалім
9 чэрвеня..................................Узнясенне
19 чэрвеня ...............................Пяцідзясятніца (Троіца)
19 жніўня .................................Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня .................................Успенне
Прасвятой Багародзіцы
21 верасня ...............................Нараджэнне
Прасвятой Багародзіцы
27 верасня ...............................Узвіжанне Крыжа
Гасподняга
4 снежня ..................................Увядзенне ў храм
Прасвятой Багародзіцы

## Вялікія святы

14 студзеня..............................Абразанне Гасподняе
і памяць свц. Васілія Вялікага
7 ліпеня ....................................Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня ..................................Святых першавярхоўных
апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня ...............................Усекнавенне галавы
Іаана Прадцечы
14 кастрычніка ........................Пакроў Прасвятой Багародзіцы

## Шматдзённыя пасты

Вялікі пост ...............................з 14 сакавіка да 30 красавіка
Пятроў пост ..............................з 27 чэрвеня да 11 ліпеня
Успенскі пост............................з 14 жніўня да 27 жніўня
Пост перад
Раством Хрыстовым .............з 28 лістапада
да 6 студзеня 2017 года

## Аднадзённыя пасты

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду

Навячэр'е Богаяўлення .......................................... 18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы ................... 11 верасня
Узвіжанне Крыжа Гасподняга.................................27 верасня

## Усёедныя тыдні

(па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд .....................з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея ..................з 22 да 27 лютага
Сырны (масленічны)...............з 7 да 12 сакавіка
Пасхальны (Светлы)...............з 2 да 7 мая
Троіцкі .....................................з 20 да 25 чэрвеня

## Трапеза ў святы

*Паводле царкоўнага статута, у святы Раства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У навячэр'е Раства Хрыстовага, навячэр'е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Вялікадня да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.*

## Дні асаблівага памінання спачылых

Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову.......................................7 лютага
Субота мясапусная...................................5 сакавіка
Субота 2-га тыдня Вялікага посту............26 сакавіка
Субота 3-га тыдня Вялікага посту............2 красавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту............9 красавіка
Памінанне спачылых воінаў......................9 мая
Радаўніца..................................................10 мая
Субота Троіцкая........................................18 чэрвеня
Субота Дзімітрыеўская.............................5 лістапада

# Мусульманскія святы і знамянальныя даты

**(1437—1438 гг. па Хіджрэ)**

3 мая (26—27 раджаба) .............Узнясенне Прарока Мухамада
(ноч Мірадж)
21 мая (14—15 шаабана) ............Ноч ачышчэння
(Лейлят аль-Бараа)
6 чэрвеня (1 рамадана)..................пачатак мусульманскага посту
(Ураза)
1 ліпеня (26—27 рамадана) ........Ноч Прадвызначэння
(Лейлят аль-Кадр)
5 ліпеня (1—3 шаваля)................Свята разгавення — Ураза-Байрам. Заканчэнне
мусульманскага посту
11 верасня (9 зуль-хіджа)............Дзень стаяння на гары Арафат
12 верасня (10—13 зуль-хіджа) ..Свята ахвярапрынашэння — Курбан-Байрам. Заканчэнне
вялікага паломніцтва ў Мекку
2 кастрычніка (1 мухарама) ........пачатак новага 1438 года
па Хіджрэ
11 кастрычніка (10 мухарама) ....Ашура, дзень памінання
пракрокаў і пасланнікаў Алаха
11 снежня (12 рабі аль-аваля) ....Дзень нараджэння Прарока
Мухамада (Маўлід ан-Набі)

**Даты календара могуць змяніцца ў залежнасці ад стану месяца.**

# Каталіцкі каляндар

1 студзеня..................Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня..................Аб'яўленне Пана (Тры Каралі)
10 студзеня................Хрост Пана
10 лютага...................Папялец
(пачатак Вялікага посту)
19 сакавіка ................Святога Юзафа
20 сакавіка ................Пальмавая нядзеля
27 сакавіка ................Вялікдзень
3 красавіка ................Божай Міласэрнасці
5 мая ..........................Унебаўшэсце Пана
15 мая ........................Спасланне Духа Святога
22 мая ........................Найсвяцейшай Тройцы
26 мая ........................Цела і Крыві Пана
29 чэрвеня .................Святых апосталаў Пятра і Паўла
15 жніўня ..................Унебаўзяцце Найсвяцейшай
Панны Марыі
1 лістапада ................Усіх Святых
20 лістапада ..............Хрыста Валадара Сусвету
8 снежня ....................Беззаганнага Зачацця
Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня ..................Нараджэнне Пана
30 снежня ..................Святой Сям'і

# Лютэранскі каляндар

1 студзеня.................. Новы год, Абразанне
і нарачэнне імя Ісуса Хрыста
6 студзеня.................. Богаяўленне, Эпіфанія
25 студзеня................ Дзень абарачэння
святога апостала Паўла
2 лютага..................... Стрэчанне Гасподняе
10 лютага................... Папяльцовая серада,
пачатак Пакутнага часу
20 сакавіка ................ Вербная нядзеля
24 красавіка .............. Вялікі чацвер,
Дзень усталявання Прычасця
25 сакавіка ................ Дабравесце
27 сакавіка ................ Пасха, Уваскрэсенне Гасподняе
28 сакавіка ................ Пасхальны панядзелак
25 красавіка .............. Дзень евангеліста Марка
5 мая .......................... Узнясенне Гасподняе
15 мая ........................ Пяцідзясятніца,
свята Сашэсце Святога Духа
22 мая ........................ Тройца, свята Святога
Трыадзінства
24 чэрвеня ................. Нараджэнне Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня ................. Дзень Аўгсбургскага
веравызнання
29 чэрвеня ................. Дзень святых апосталаў
Пятра і Паўла
2 ліпеня ...................... Дзень наведвання
Марыяй Елізаветы
6 жніўня ..................... Праабражэнне Гасподняе
21 верасня ................. Дзень апостала
і евангеліста Мацвея
29 верасня ................. Дзень архангела Міхаіла
і ўсіх анёлаў
2 кастрычніка ............ Свята падзякі за ўраджай
18 кастрычніка........... Дзень евангеліста Лукі
30 кастрычніка........... Дзень памінання ахвяр гвалту,
вайны і тэрору
31 кастрычніка........... Дзень Рэфармацыі
19 лістапада ...............Дзень пакаяння і малітвы
27 лістапада................Першая нядзеля Адвенту
4 снежня.......................Другая нядзеля Адвенту
11 снежня ....................Трэцяя нядзеля Адвенту
18 снежня ....................Чацвёртая нядзеля Адвенту
24 снежня.....................Святы вечар. Пярэдадзень Раства
25 снежня ....................Раство Хрыстова
26 снежня ................... Дзень першапакутніка
Сцяфана
27 снежня ................... Дзень апостала
і евангеліста Іаана
28 снежня ................... Дзень нявінна забітых немаўлят
31 снежня ................... Пярэдадзень Новага года

# Іўдзейскія святы і пасты

25 студзеня ...................Ту-бі-Шват
23 сакавіка....................Пост Эстэр
24 сакавіка....................Пурым
23 — 30 красавіка.........Пейсах
26 мая ...........................Лаг-беоймер
12 — 13 чэрвеня ...........Швуойс
24 ліпеня .......................Пост 17 тамуза
14 жніўня.......................Пост Тышо-бэоў (9 ава)
3—4 кастрычніка ..........Рош Гашано
5 кастрычніка................Пост Гедаллі
12 кастрычніка..............Ём-Кіпур
17 —23 кастрычніка......Сукойс
24 кастрычніка..............Шміні-ацэрэс
25 кастрычніка..............Сімхас-Тойра
25 снежня 2016 — 1 студзеня 2017 .......Ханука

**Усе яўрэйскія святы пачынаюцца напярэдадні ўвечары.**

# ГОД МАЛПЫ:

## пачуццё меры, цвярозая галава і ўменне трымаць сябе ў руках



**У гараскопе на 2016 год ёсць нешта такое, што абяцае зрабіць год незабыўным і яркім. Зоркі падказваюць, што гэта будзе год нечаканых паваротаў і сюрпрызаў, узлётаў і падзенняў. Згодна з кітайскай традыцыяй, ён пройдзе пад знакам Чырвонай Малпы, ну а галоўнымі рысамі гараскопа ў гэты раз стануць актыўнасць, рэўнасць, выкрутлівасць і рызыка. Менавіта гэтыя якасці і будуць вызначаць кірунак галоўных падзей.**

Іншымі словамі, надыходзячы 2016 год будзе годам павышанай актыўнасці і энергічнасці, што само па сабе вельмі спрыяльна, калі б не адзін важны нюанс — вельмі лёгка можна захапіцца, не разлічыць свае сілы і, як вынік, наламаць дроў. Гэта датычыцца ўсіх сфер, пачынаючы ад асабістага жыцця і заканчваючы фінансамі.

Увесь год зоркі будуць правакаваць празмернасць ва ўсім — у любові, у працы, у тратах, у набыцці. У многіх людзей пры гэтым часта будзе ўзнікаць ілжывае адчуванне ўсемагутнасці, якое правакуе на непрадуманыя крокі. У гэтым сэнсе нават у простых справах колькасць памылковых рашэнняў можа рэзка ўзрасці, ну а з улікам павышанай энергічнасці года відавочна, што цана такіх памылак можа аказацца даволі высокай.

Зрэшты, ёсць людзі, якія пры любым раскладзе ўвесь год будуць заставацца на кані. Гаворка ідзе пра тых, хто валодае пачуццём меры і ўмее кіраваць сваімі эмоцыямі. Менавіта для іх зоркі адкрываюць шырокія перспектывы ў любой сферы жыцця — і ў творчасці, і ў кар'еры, і ў зносінах, і ў каханні. Дастаткова проста не губляць галаву, каб шчодрая Малпа запісала вас у свае любімчыкі, абсыпаўшы ўсімі магчымымі выгодамі і падарункамі.

Яшчэ адна адметная рыса 2016 года — гэта рэўнасць ва ўсіх яе праявах, няхай гэта будзе рэўнасць да каханага чалавека, саперніцтва з калегамі ці зайздрасць да чужых дасягненняў. Усё гэта можа атручваць жыццё на працягу ўсяго года. Зрэшты, у рэўнасці ёсць і пазітыўны бок: замест таго, каб бессэнсоўна мучыцца ад яе уколаў, паспрабуйце выкарыстоўваць гэтае пачуццё як стымул для ўласнага развіцця.

Але самае галоўнае ў 2016 годзе — не забываць, што тры галоўныя якасці (пачуццё меры, цвярозая галава і ўменне трымаць сябе ў руках) дапамогуць вам адкрыць любыя дзверы. І тады зоркі нададуць сіл і энергіі для ажыццяўлення любых вашых планаў.



**АВЕН.** Усё будзе складвацца станоўча, аднак давядзецца сутыкнуцца і з некаторымі перашкодамі ў рэалізацыі сваіх задум. Год будзе багаты на любоўныя і рамантычныя прыгоды, а таксама фінансавыя поспехі. У пачатку года Авены сутыкнуцца з хатнімі клопатамі. Вясной вы зможаце наладзіць адносіны з другой палавінкай. Для адзінокіх прадстаўнікоў знака гэты час абяцае рамантычныя сустрэчы з чалавекам, пра якога вы так доўга марылі. У пачатку лета Авенаў ахопіць жаданне ствараць нешта новае, і вы смела можаце прымацца за рамонт жылля ці акультурванне дачнага ўчастка. Можна спрабаваць рэалізаваць сябе як творчую асобу. У канцы лета адмоўцеся ад значных фінансавых выдаткаў. Восенню давядзецца звярнуць увагу на сваё здароўе і знешні выгляд, надаць больш увагі хатнім справам. Праявіце пазітыўны настрой і напорыстасць — гэта дазволіць вам дамагчыся поспехаў ва ўсіх пачынаннях. Вялікія надзеі і чаканні абяцае гараскоп у 2016 годзе на снежань, і толькі ваша настойлівасць пакажа, ці зможаце вы ўвасобіць усё задуманае ў жыццё.



**ЦЯЛЕЦ.** У 2016-м можна будзе смела і ўпэўнена рухацца наперад. Перш за ўсё давядзецца ўмацоўваць тылы. У лютым і сакавіку варта актыўна заняцца працай. У гэтым годзе ў вас ёсць вялікія шанцы падняцца па кар'ернай лесвіцы, а дабрабыт пачне расці. Давядзецца шмат падарожнічаць; магчыма, гэта будзе звязана з камандзіроўкамі. Для адзінокіх вясна адзначыцца пераменамі ў асабістым жыцці. І на фронце любоўным, і ў бізнесе вас чакае гармонія аж да мая. Але ў гэты перыяд не купляйце нічога вельмі дарагога, а таксама не пазычайце, бо грошы да вас могуць не вярнуцца. Пачатак лета пройдзе пад знакам клопату пра дзяцей. Для некаторых будзе навіной, што вас чакае папаўненне ў сям'і. Слухайце ўнутраны голас у жніўні, бо давядзецца прымаць шмат сур'ёзных рашэнняў. Увосень варта больш увагі надаць блізкім. Дапамагайце ім у іх праблемах — гэта вельмі цэняць і чакаюць ад вас. У снежні адчуеце небывалую гармонію і разуменне, знаходзячыся ў акружэнні блізкіх людзей.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вы заўсёды шукаеце баланс паміж супярэчлівымі рэчамі. Часта такая тактыка дазваляе дасягнуць поспеху, аднак 2016-ты настойліва рэкамендуе змяніць стыль жыцця. Будзьце больш упэўненымі ў сабе, вызначайце мэты і імкніцеся да іх. Люты можа пачацца з некаторых непрыемнасцяў, што паспрабуюць выбіць вас з каляіны. Аднак не варта рэагаваць на ўвесь негатыў, трэба проста якасна выконваць сваю працу далей, і ўсё пройдзе само сабой, а вы нават зможаце атрымаць з усяго гэтага выгаду. Вясной вас чакае прыход рамантыкі ў будзённае жыццё. Як мяркуецца, вы сустрэнеце свой лёс ужо ў канцы сакавіка ці ў пачатку красавіка. Пры гэтым гараскоп папярэджвае, што ваш недавер да партнёра можа ўсё сапсаваць. У другой палове лета добра будзе адпачыць. У гэты перыяд у вас намячаецца ўсплёск любоўных прыгод. Рамантыка пяройдзе з лета ў восень. Але тут яе паступова пачне выцясняць праца. У гэты перыяд начальства заўважыць стараннасць і талент, які вы праяўляеце. Вас чакае прыемны фінансавы сюрпрыз. Цяпер вы зможаце здзейсніць набытак, пра які марылі на працягу доўгага часу. Канец восені і зіма 2016-га прынясуць Блізнятам поспех у бізнесе — вы будзеце купацца ў апладысментах і кампліментах. А калі вы чалавек творчы — у гэты перыяд зможаце стварыць выдатны шэдэўр.



**РАК.** Часам варта трохі адысці назад, таму што рухацца напралом не з'яўляецца выйсцем. Аднак 2016-ты хоча, каб вы стаялі на сваім і праяўлялі цвёрдасць. Усё, што трэба, — дакладна ведаць, чаго вы хочаце, і прытрымлівацца гэтага бесперапынна. Варта пачынаць новае жыццё. Перамены пачнуцца з самага пачатку года. Адразу ж стане ясна, хто з вашага кола зносін для вас з'яўляецца сябрам, а хто — не. У лютым давядзецца ўспомніць пра ўсе абавязкі і справы, што не былі выкананы раней. Вынік ад сваёй дзейнасці атрымаеце ўжо ў сакавіку. Вядома, нагрузка будзе значная, але ўсе фінансавыя справы пойдуць угору і ў кішэні з'явяцца лішнія грошы. Май падорыць шмат рамантыкі. Але гэта можа быць і не каханне. Магчыма, вы зможаце адправіцца ў падарожжа або праявіць сябе як творчая асоба. Некаторым стане відавочна, што няма нічога лепшага, чым час, праведзены з дзецьмі. Вядома, і без любоўных прыгод не абыдзецца. Чэрвень пройдзе пад знакам хатняга ачага. Ліпень хоча, каб вы марылі. У гэты перыяд выразна сфармуляваная мара абавязкова збудзецца, але прадумайце ўсё да дробязяў. У жніўні давядзецца папрацаваць. У пачатку восені вы зможаце крыху адпачыць. Лістапад прынясе шмат цікавых і вельмі прыемных навін. Снежань прысвяціце дому, блізкім, зносінам, і ў вашым жыцці з'явіцца доўгачаканая гармонія.



**ЛЕЎ.** У вас шмат вопыту па частцы зрабіць ўражанне на навакольных, аднак 2016-ты можа павярнуць ўсё так, што давядзецца станавіцца тым чалавекам, якога ў вас бачаць іншыя. Трэба стаць больш адкрытым, сумленным і шчырым для навакольных. Так будзе нашмат прасцей жыць. У пачатку года спатрэбяцца рашучыя дзеянні, бо з'явіцца некалькі вельмі цікавых задач. Яны будуць тычыцца вашай прафесійнай дзейнасці, а некаторым прадстаўнікам знака трэба будзе адкрыта пагаварыць са сваімі любімымі. У пачатку вясны вас чакае некалькі складаных пытанняў, але не варта ісці напралом. Адпусціце гэтую праблему, і яна вырашыцца сама сабой. У красавіку Львоў чакае некалькі авантурных ідэй. Калі вы прыслухаецеся да сваёй інтуіцыі, то атрымаеце вялікую выгаду. Хоць рызыка з'яўляецца справай добраахвотнай. Улетку — бура рамантыкі, кахання і запалу. У пачатку восені можна чакаць павышэння ў кар'еры ці прыбытку да зарплаты. Але расходаваць заробленыя грошы лепш за ўсё са сваёй сям'ёй — гэта прынясе шмат прыемных і запамінальных момантаў. У лістападзе справы пачнуць адбіраць вялікую частку часу і бываць дома зможаце рэдка. Нават калі будзе вельмі цяжка, не адчайвайцеся і не кідайце нічога на палове шляху. У снежні можна будзе дазволіць сабе адпачыць і атрымаць асалоду ад зносін з сям'ёй.



**ДЗЕВА.** Вас можна параўнаць з ракетай, якая пасля доўгіх падарожжаў усё ж дабралася да зорак. Аднак яна не ўсведамляе, што ёй рабіць далей. Год Малпы дапаможа разабрацца і дасягнуць усяго, чаго вы хочаце. Па студзені атрымаецца вярнуцца да таго, што, як вы лічылі, ўжо пайшло назаўжды. У канцы зімы — пачатку вясны ваша асабістае жыццё возьме верх над астатнімі сферамі. У маі варта быць вельмі дыпламатычнымі. У гэтым месяцы вас чакае мноства паездак, падарожжаў, але магчымы канфлікты і неразуменне з боку блізкіх. Чэрвень патрабуе расплаціцца па старых даўгах. У 2016 годзе Дзевы ў прынцыпе не павінны забывацца пра тыя абяцанні, якія давалі раней. Пазбавіўшыся ад гэтага грузу, можна будзе нармальна рухацца далей і строіць планы на будучыню. У сярэдзіне лета вашы пачуцці здабудуць новае жыццё. Для адзінокіх вялікі шанц сустрэць другую палавіну і застацца з ёй на ўсё жыццё. Пасля эмацыйных падзей чэрвеня і ліпеня вас чакае спакойны жнівень. Увосень на працы адбудуцца перамены, якія запатрабуюць ініцыятыўнасці, умення шмат і ўважліва працаваць, а таксама адстойваць свае ідэі перад начальствам, хаця б у межах разумнага. У снежні астролагі абяцаюць мноства перспектыў і новых магчымасцяў, якія адкрываюцца перад вамі. Не спыняйцеся і актыўна дзейнічайце! Лёс да вас добразычлівы.



**ШАЛІ.** У першыя ж дні 2016-га вы адмовіцеся ад той рэчаў, якія не прыносяць ніякай карысці. У гэты перыяд адпачывайце і збірайце сілы для новых здзяйсненняў. Некаторыя зрухі ў дзелавым жыцці намячаюцца ў сакавіку. Красавік дапаможа разабрацца ў адносінах з партнёрам. Гэты час спрыяльны для прызнанняў у каханні, не бойцеся рамантыкі — яна акажацца як ніколі да месца. Май запатрабуе павоенай энергіі ў працы. У пачатку чэрвеня варта чакаць прапанову цікавай працы, якая звязана з інфармацыяй, камп'ютарнай тэхнікай ці рэкламай. Гараскоп абяцае ў сярэдзіне лета ўдачу і толькі добрыя навіны. У жніўні лепш спыніцца і трохі падумаць пра планы на будучыню. Магчыма знаёмства з прадстаўніком супрацьлеглага полу, які надоўга ўвойдзе ў ваша жыццё. У першай палове верасня надыдзе час для тых, чыё імкненне да высокіх вынікаў прымушае іх рухацца далей. У кастрычніку з'явіцца магчымасць памяняць усё тое, што доўгі час выклікае толькі раздражненне. Сярэдзіна восені адзначыцца тым, што ваша прысутнасць стане проста неабходнай дома. У пачатку зімы Лёс пакажа знакамі, куды варта рухацца.



**СКАРПІЁН.** У пачатку года гараскоп абяцае прыліў сіл, які вы захочаце адразу ж патраціць на ўвасабленне сваіх задумаў. Нават калі вашы планы ідуць насуперак звыкламу жыццю — не варта спыняцца. Гэтыя дзеянні дапамогуць усё памяняць у лепшы бок. У лютым лепей адразу ж пачаць раздачу ўсіх назапашаных даўгоў; час вырашыць справы, якія назбіраліся на працоўным месцы. У гэты перыяд вы можаце закахацца, але не варта строіць планы — раман будзе хуткаплынным. Увесну Скарпіёнаў захопіць калейдаскоп цікавых рэчаў: праекты і ідэі, якія дазволяць зрабіць кар'еру і наладзіць сваё фінансавае становішча; шмат рамантыкі; усе пытанні, звязаныя з прафесійнай дзейнасцю, вырашацца на вашу карысць. У пачатку лета ёсць шанцы, што вашы даўнія мары пачнуць спраўджвацца. Астатняя частка лета пройдзе пад знакам працы, пры гэтым вы добра зarобіце. Да верасня варта зменшыць абароты. У гэты перыяд будзе добрай ідэяй узяць адпачынак. Беражыце фінансы, бо менавіта ў гэты час вас могуць падмануць нядобразычліўцы. У лістападзе з'явіцца магчымасць дапамагчы блізкім. Такі падыход закладзе моцны падмурак пазітыву на наступны 2017 год. Вы зможаце беспярэшкодна ўвасабляць у жыццё ўсе свае планы і задумы.



**СТРАЛЕЦ.** У студзені будзе шмат зносін з блізкімі людзьмі. Не варта пазбягаць іх. Люты дасць новыя гарызонты, пра якія вы так даўно марылі. Не варта занадта напружвацца ў сакавіку, бо гэта можа прывесці да праблем са здароўем. У гэты перыяд будзе нядрэнна прайсці медыцынскае абследаванне і заняцца прафілактыкай захворванняў. У красавіку ў вас магчымыя рамантычныя прыгоды, флірт, новыя знаёмствы, а таксама аднаўленне старых адносін. Май вельмі спрыяльны для таго, каб падумаць пра планы на будучыню. У чэрвені лепш за ўсё будзе пачаць разбірацца з усімі сваімі справамі і расплаціцца з усімі пазыкамі. Шанцаванне будзе спадарожнічаць Стральцам у 2016 годзе ва ўсім. Праца, пра якую марылі, можа сама прыйсці да вас у рукі, тут галоўнае — пачаць дзейнічаць. У любоўных справах вас таксама чакае поспех. Свабодныя здабудуць сваё шчасце — часцей глядзіце па баках. Увосень прачнуцца схаваныя таленты, і вы пачняце працаваць з удзесяцяронай сілай. Калі не спыняцеся да зімы, то ўжо ў снежні фінансавыя справы рэзка пойдуць угору.



**КАЗЯРОГ.** 2016-ты запатрабуе ад вас быць сканцэнтраванымі, бо трэба будзе вырашыць мноства цікавых, але складаных задач. Але не адчайвайцеся: вы атрымаеце бясцэнны вопыт. У студзені можна будзе крыху забыцца пра справы і аддацца зносінам з сябрамі. Падрыхтуйцеся да таго, што ў вашым звыклым калектыве адбудуцца змены. У жыцці можа вярнуцца мінулае, але гэта пойдзе толькі на карысць. Другі месяц зімы заклікае разабрацца са справамі на працы, аддаць крэдыты, папрасіць прабачэння ў тых, каго вы маглі пакрыўдзіць. Вясной — шанцаванне ва ўсіх справах. Усё, што спатрэбіцца ад прадстаўнікоў знака, — гэта шчырасць у сваіх учынках. Фінансавы стан дазволіць зрабіць доўгачаканую пакупку. Улетку трэба будзе добра папрацаваць, але пры гэтым не забывайце пра адпачынак. Жнівень прынясе перамены ў асабістым жыцці. Верасень можа падкінуць задачы ў галіне рамонту жылля або набыцця новай бытавой тэхнікі. Канец восені — пачатак зімы будуць спакойнымі і гарманічнымі.



**ВАДАЛЕЙ.** 2016 год будзе спрыяць таму, што вашы таленты стануць вельмі запатрабаванымі. Вашы дзеянні гарантуюць поспех. У студзені будзе шанц адвысць адносіны з тым, з кім адбылося раставанне. У лютым давядзецца папрацаваць і стварыць сабе моцны падмурак для новых праектаў. У гэтым месяцы не рэкамендуецца пачынаць новыя любоўныя прыгоды. А вось ужо ў сакавіку гараскоп абяцае шмат цікавых момантаў, якія будуць звязаны з асабістым жыццём. Гэты перыяд стане для вас лёсавызначальным. Красавік будзе вельмі багаты на розныя знакі Лёсу. Ні ў якім разе не ігнаруйце іх! У маі лепш больш часу праводзіць з блізкімі. У другой палове лета займіцеся домам: зрабіце рамонт, купіце новую бытавую тэхніку. Не пазычайце ні ў кога грошай! Пачатак восені адзначыцца вялікай колькасцю спраў на працы. Смела ўключайцеся і праяўляйце ініцыятыву. Лістапад прысвяціце сям'і. Размаўляйце, дзяліцеся сваімі думкамі з любімымі. Вашы адносіны ад гэтага стануць толькі мацнейшымі. Ужо ў снежні вы адчуеце вынік ад гэтага, і ў ваш дом увойдуць гармонія і каханне.



**РЫБЫ.** Вам выпадзе шанц крута памяняць жыццё. Аднак варта быць уважлівымі да навакольнага свету і яго абставін, каб не ўпусціць свае магчымасці. Гэтай зімой вам трэба будзе абдумаць усе свае справы і памылкі, зробленыя ў мінулым. Вясна прынясе знаёмства з новымі людзьмі, што ўвойдуць у ваша жыццё. Старыя і правераныя сябры могуць паказаць сябе з нечаканага, а часам адкрыта негатыўнага боку. Час абяцае адзінокім Рыбам сустрэчу з сваёй палавінкай. А для сямейных прадстаўнікоў знака гэты перыяд стане магчымасцю ўмацаваць і вывесці на новы ўзровень свае адносіны. У пачатку лета ўсе мары і планы могуць увасобіцца ў жыццё, галоўнае — не адступаць. Пачатак восені адзначыцца запускам новых праектаў і хваляй цікавай працы. Але пры гэтым не забывайце пра тое, што дома вас чакаюць любімыя і блізкія людзі. Працягвайце працаваць, і ў снежні ўжо будзе вялікі багаж паспяхова выкананых спраў. Аднак трэба думаць пра будучыню, плануючы новыя здзяйсненні.

## З НОВЫМ ГОДАМ! З ЛЁГКАЙ ПАРАЙ!

**Тэлевізійная прэм'ера камедыі Эльдара Разанава «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» адбылася 1 студзеня 1976 года. Праз месяц, па шматлікіх просьбах гледачоў, фільм паўтарылі. Кінаверсія, паводле апытання часопіса «Савецкі экран», была названа найлепшым фільмам года.**



Змянялася ідэалогія і дзяржаўны лад, аднак стужка, перажыўшы свайго стваральніка, засталася неад'емнай часткай навагодняга тэлеменю на доўгія гады. Як засталася нязменнай і глядацкая любоў да гэтай анекдатычнай і сумнай, неверагоднай і шчырай гісторыі. Вы ўпэўнены, што ведаеце «Іронію лёсу...» ледзьве не на памяць? Давайце праверым! Паспрабуйце без падрыхтоўкі адказаць на пытанні.

**1.** Жэня Лукашын і яго нявеста Галя абмяркоўвалі: сустрэць Новы год разам альбо прыняць запрашэнне сяброў, прозвішча якіх...
— Абрамавы,
— Катаняны,
— Аганесяны,
— Геваркяны.

**2.** Эльдар Разанаў часта выконваў у сваіх фільмах эпізадычныя ролі. У «Іроніі лёсу» ён сыграў...
— таксіста,
— лазеншчыка,
— пасажыра самалёта,
— суседа з сабакам у ліфце.

**3.** Многія ўспрымаюць галоўных герояў карціны як сваіх аднагодкаў. Насамрэч дакладны ўзрост Лукашына...
— 33 гады,
— 36 гадоў,
— 40 гадоў.

**4.** У лазню Лукашын пайшоў з трыма сябрамі, адзін з якіх мусіў ляцець у Ленінград, а другі сцвярджаў, што ніколі не п'янее і мае «фенаменальную памяць». Гэтага другога сыграў акцёр...
— Аляксандр Шырвіндт,
— Аляксандр Бяляўскі,
— Георгій Буркоў.

**5.** Якога колеру тэлефонны апарат у ленінградскай, Надзінай, кватэры?
— чырвонага,
— белага,
— зялёнага.



**6.** Калі Лукашына выгналі за дзверы, на марозе той хутка працверазеў і прыпушчаў нагамі, паўтараючы на розны лад фразу:
— «Дарагая мая сталіца»;
— «Трэба меней піць»;
— «Чаравікі на тонкай падэшве».

**7.** У пад'ездзе дома ў Ленінградзе герой Андрэя Мяккова сустракае суседа з сабакам. Якой пароды і колеру сабака?
— чорная аўчарка,
— белы пудзель,
— руды мопс,
— чорны дог.

**8.** Паводле фільма, у якую суму абыходзілася савецкаму чалавеку модная тады мэбля — польскі гарнітур?
— 560 рублёў,
— 650 рублёў,
— 830 рублёў.

**9.** Апрытомнеўшы ў незнаёмай кватэры, Жэня Лукашын пачаў ліхаманкава апранацца. У прыватнасці, герой доўга шукаў пінжак. Які?
— шэры ў елачку,
— чорны з іскраю,
— шэры ў палоску,
— клятчасты.

**Часцей глядзіце добрае кіно — у наступным годзе і наогул. З Новым годам!**

**АДКАЗЫ**

1. Катаняны. 2. Пасажыра самалёта. 3. 36, а Надзя на 2 гады маладзейшая. 4 .Георгій Буркоў. 5. Пытанне з падвохам: у пакоі стаіць чырвоны тэлефон, а ў прыхожай — зялёны! 6. «Трэба меней піць». 7. Чорны дог. 8. 830 рублёў. «І 20 зверху», — дадала Надзя, а Лукашын заўважыў: «Не, я даў 25». 9. «Дзе мой пінжак? Дзе я яго павесіў, шэры ў елачку, з «Масгандлю»?..» — бедаваў Лукашын.

## НЯДЗЕЛЯ, 10 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Меладрама «Знайдыш».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.00** «БТшнікі». Тэлефільм АТН да 60-годдзя Беларускага тэлебачання.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50 Камедыя «Белыя Росы».**
**17.25 Серыял «Усё спачатку».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15 Меладрама «Новы стары дом».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.55** М/с «Сябры анёлаў».
**7.55** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**8.25 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**10.15** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.15, 20.05** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.15** «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.50 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**14.50** М/ф «Прыгоды Цінціна. Тайна «Аднарога».
**16.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Масстарт. Жанчыны.
**17.25 Меладрама «Законы прывабнасці».**
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.25** Хачу ў тэлевізар!
**22.30 Серыял «Косці».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 15.20, 17.50, 23.30** «Калейдаскоп».
**8.15, 21.30 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.40 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм.**
**12.55** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Сяргей Башлыкевіч, дуэт Яўген і Алена Піменавы, Сяргей Занімонец.
**13.35** «Наперад у мінулае».
**14.00** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**14.50** «Музеі Беларусі». Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.
**15.35** «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Сяргей Ілын.
**16.30 «Перапыненая серэнада». Меладрама.**
**18.05 «За што?» Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Легенды беларускай эстрады».
**22.55** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Маршала згубілі жанчыны?». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 23.25** PRO спорт. Навіны.
**7.40** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен. Фінал.
**9.45** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Калеў» (Талін).
**11.30** Баскетбол. НБА. «Атланта» — «Чыкага».
**13.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**14.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Масстарт. Мужчыны.
**15.00** Канькабежны спорт. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1500 м. Мужчыны. 1500 м. Жанчыны. 5000 м. Мужчыны. 10 000 м.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы».
**20.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Мужчыны.
**21.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Жанчыны.
**23.00** Авертайм.
**23.30** Баскетбол. НБА. «Кліперс» — «Нью-Арлеан».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20 Камедыя «Француз».**
**11.10 Камедыя «Адзін дома 2».**



**13.20** «Ледніковы перыяд». Гала-шоу.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20 Камедыя «Золушка».**
**18.00, 21.05** «Кропля ў кроплю». Навагодні выпуск.
**20.00** Контуры.
**23.00** «Ружа Хутар». Святочны канцэрт.

### СТБ

**6.00** «Дакументальны праект»: «Вялікія тайны старажытных скарбаў».
**8.25, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.50 Фільм-дзецям «Прададзены смех».**
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 Камедыя «Любоўморкоў 3».**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.30** Мюзікл «Лятучая мыш».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Дарагая перадача».
**17.30 Маст. фільм «Далікатная зіма». 3—4-я серыі.**
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Трылер «Начны дазор».**



**22.35** «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 90-я!».
**23.35** «Дакументальны спецпраект»: «Тайна выратавання».

### МІР

**5.45** М/ф.
**7.40 Маст. фільм «Фокус-покус».**
**9.30** «Трэш-тэст».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Апаштарэннe». 1—2 частка.**
**13.40 Маст. фільм «Банкаўскі білет у мільён фунтаў стэрлінгаў».**
**15.10, 1.15** «Практычная магія».
**16.15, 4.00 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».**
**19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**3.30 Серыял «Чорны пакой».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 «Ха». Маленькія камедыі.**
**8.00 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».**
**9.35, 11.25, 14.15 Серыял «Сваты».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**15.50** «Пакой смеху».
**16.55 Камедыя «Паварот наадварот».**
**20.35 Маст. фільм «У імя кахання».**
**22.15** Навагодні блакітны агеньчык-2016.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Таксістка».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.20** «Іх норавы».
**10.50 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.25, 13.20 Серыял «Рускі дубль».**
**14.25 Серыял «Брацeнікі».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Выратавальнікі».
**18.15** «Следства вялі...»
**19.20 Серыял «Павуцінне».**
**22.40 Маст. фільм «Зноў Новы».**

### 8 КАНАЛ

**9.00,15.50, 19.00, 23.35** «Надвор'е».
**9.05, 15.55** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30 ,13.30, 16.10, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45** «Мой любімы гадавалец».
**11.15 Прыгоды «Маска Зора».**
**13.40 Прыгоды «Зора».**
**16.40 Камедыя «Помста Кіці».**
**18.00** «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05 Прыгоды «Як у казцы».**
**20.50** «Вечарніца». «Снягурка».
**21.05 Драма «Сем гадоў у Тыбеце».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00, 22.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Камедыя «Татулі».
**11.00, 3.00** «Турбамікcер».
**13.00** Камедыя «Пяцёра сяброў 2».
**14.45** М/ф «Снежная каралева 2».
**16.00** Камедыя «Ёлкі 3».
**18.00, 1.00** «Уральскія пельмені».
**20.00** Камедыя «Ёлкі 1914».
**23.30** Скетчком «Студэнты».
**0.00** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».
**0.30, 5.30** «Лаві момант».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Волга-Волга». Маст. фільм.
**12.20** «Пеця і воўк». Фільм-фантазія па казцы С. Пракоф'ева.
**12.50** «Прарокі. Цар Давід». Дак. фільм.
**13.20, 1.55** «Дзікія астравы». Дак. серыял.
**14.20** «Яна напісала сабе ролю... Вікторыя Токарава». Дак. серыял.
**15.40** «Пешшу...». Масква Раманава.
**16.10** «Маленькія ролі Вялікага артыста. Аляксей Смірноў». Дак. фільм.
**16.50** Год кіно-2016. 1. «Дзелавыя людзі». Маст. фільм (1962 г.). 2. «Знак Зора». Маст. фільм (1958 г.).
**19.45** Юбіляры года-2015. Сяргей Юрскі. Лінія жыцця.
**20.40** «Рамантыка рамансa».
**21.35** Кіно на ўсе часы. «Адзіночка». Маст. фільм.
**23.15** «Партрэт у інтэр'еры Вялікага тэатра». Дак. фільм.
**23.45** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Хібла Герзмава, Тэадор Ілінкай, Габрыэле Вівіяні і Іна Дукач у оперы Дж. Пучыні «Багема». Каралеўскі оперны тэатр «Ковент-Гардэн».
**1.40** «Пумс». «Завея». М/ф для дарослых.
**2.50** «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яфім Шыфрын.
**6.20, 8.20, 9.40, 11.00, 12.40, 14.40, 17.20, 20.20, 21.50, 23.20, 0.50, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** «Зямля — Паветра». Гр. «Прэм'ер-міністр». 2002 год.
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1992 год.
**14.00, 19.55** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Міхаіл Жванецкі.
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Пятля Арыёна».
**18.00** «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**20.30** «Зямля — Паветра». Дэцл. 2003 год.
**22.00** Маст. фільм «Жанчыны жартуюць усур'ёз».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітknown... 

### EUROSPORT

**2.30, 5.00, 9.00** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**3.30, 11.30, 17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**4.00, 8.00, 13.30, 16.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**4.30, 8.30, 11.00, 14.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**7.00, 1.30** Зімовыя віды спорту.
**10.30, 1.00** Ралі-рэйд. Дакар.
**12.15,15.15** Лыжнае двабор'е. Кубак свету.
**15.45, 19.30, 21.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**20.30** Дартс. Чэмпіянат свету. Фінал.
**22.00** Снукер. Майстарс.

### КАМЕДЫЯ

**0.45, 17.55** Камедыя «Любоўморкоў 2».
**2.25, 19.40** Камедыя «Снежная нявеста».
**4.00, 21.10** Камедыя «Любоўморкоў 3».



**5.40, 22.50** Камедыя «Выхадныя».
**7.20** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**8.55** Камедыя «Каманда мары».
**10.45** Камедыя «Чалавек-эльф».
**12.15** Камедыя «Любоўморкоў».
**14.00** Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
**15.35, 17.35** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.50** «Дачныя гісторыі».
**10.15, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.10** «Паненка і кулінар».
**11.45, 1.00** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.30** «Пляменшка». Дэтэктыў.
**19.50** «Без падману».
**20.40** «Стары новы год». Камедыя.
**22.55** «Асцярожна, махляры!»
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.55** «Як прыручыць голад». Дак. фільм.

### ТБ1000

**7.00** Меладрама «Пазбаўце нас ад Евы».
**9.00** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**10.50** Фантастыка «2012».
**13.30** Фантастыка «Вострaў».
**15.50** Меладрама «Іспанская-англійская».
**18.00** Баявік «Тэрмінатар: Няхай прыйдзе выратавальнік».
**20.00** Драма «V» значыць Вендэта».
**22.30** Драма «Гангстар».
**1.10** Трылер «Улада страху».
**3.10** Меладрама «Замуж на 2 дні».
**5.00** Камедыя «На жыўца».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Андэрсан. Жыццё без кахання».
**9.00** Казка «Чароўны партрэт».
**10.40** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**12.20** Мюзікл «Саламяны капялюшык».
**14.40** Казка «12 месяцаў. Новая казка».
**16.15** Меладрама «Аднойчы».
**18.00** Драма «Духless 2».
**20.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**21.40** Меладрама «8 новых спатканняў».



**23.15** Драма «Паддубны».
**1.25** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**2.50** Трылер «Мужчынскі сезон: Аксамітная рэвалюцыя».
**4.45** Меладрама «Ваенна-палявы раман».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 13.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 12.30** Гульні розуму.
**7.10** Гісторыя ежы.
**7.35, 11.50, 17.20, 23.15, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45** Навука будучыні.
**9.30** Сканеры старажытнага свету.
**10.20** Космас. Прастора і час.
**11.00** Асушыць акіян.
**14.10** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.50** Апошні тыгр Суматры.
**15.40** Прыручыць дракона.
**16.25** Разбагацей або памры на капальні.
**18.40** Мегаэксплуатацыі.
**20.15** Наступнае мегацунамі.
**21.00, 0.00, 3.45** Найгоршае надвор'е ў гісторыі?
**21.45, 0.45, 4.40** Даследчык 2.0.
**22.30, 1.30, 5.15** Погляд знутры.

### DISCOVERY

**6.00** Паляўнічыя на зброю.
**6.50, 2.50** На краі Аляскі.
**7.45, 2.00** Голыя і напалоханыя.
**9.35** Выжыць разам.
**10.30, 19.00** Залатая ліхаманка.
**11.25, 18.00** Хлопцы з Юкана.
**12.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 21.00** Космас навывярат.
**14.10, 22.00** Як уладкаваны Сусвет.
**15.05, 3.40** Вулічныя гонкі.
**20.00** Зорнае выжыванне.
**23.00** Аляска: апошняя мяжа.
**0.00** Мяцежны гараж.
**1.00** Паляўнічыя на старызну.

■ Нефармат



# СІНДРОМ СВЯТОЧНАГА СЭРЦА

**Новы год стукаецца ў нашы дзверы. І ўсе да яго патроху рыхтуюцца. Ну хоць бы ў мінулую нядзелю: іду пад праліўным даждом з рынку і на пераходзе сутыкаюся з вельмі цікавай парай. Ён і яна. Дзядзька цягне немалую, не вельмі добра перавязаную, елку, а «палавіна» злосна пілуе яго за тое, што выпіў, і яны не змаглі паехаць па запланаваных ёю магазінах. А ён і так, і гэтак спрабуе ўлагодзіць жонку, расказвае, як яны паставяць елку, прыбяруць, і ўсё будзе добра, а першага ранкам пад дрэвам яна знойдзе падарунчак... Стараюся адстаць ад выпадковых спадарожнікаў. Але паспяваю заўважыць, што злосны паўшэпт жанчыны трохі пацішэў. Можа, словы «падарунчак» падзейнічала?**

Калі па шчырасці, то ўсе чакаюць нейкага падарунка ад Новага года. Калі не банальнага пакунка са стужачкай пад ёлкай, то хоць слова, званка ад далёкага сябра, знака ўвагі ад бліжняга. А дзяжурныя прэзенты ў яркіх абгортках заўсёды бываюць праблемай у апошнія дні, і не толькі для мяне, мабыць. То забудзешся купіць, то думаеш, каб не набыць непатрэбную рэч, і доўга не можаш вызначыць, што ўсё-такі лепш. Але бываюць падарункі і нечаканыя, і вельмі значныя. Днямі пачула, які шчодры падарунак зрабіў губернатар Кемераўскай вобласці вясковай жанчыне. Пра яе паказалі сюжэт па мясцовым тэлебачанні: гераіня тэлезамалёўкі рашуча памяняла свой лад жыцця, для чаго пазбавілася ад 30 лішніх кілаграмаў. Разам з гэтым яна абмовілася, што не нарыхтавала яшчэ на гэтую зіму паліва. І кіраўнік адміністрацыі рэгіёна распарадзіўся прывезці я на падворак пяць тон вугалю. Вось гэта знак увагі!

Пра яшчэ больш неверагодны падарунак расказала мне жанчына ў бальніцы. Яе малады сусед, з маці якога яна сябруе, знайшоў сабе жонку акурат пад Новы год. Недалёка знайшоў. Трымалася небарака за плот па прычыне агульнай няўстойлівасці цела. Хлопец прывёў маладую асобу дадому, адагрэў, а праз колькі часу перавёз і яе рэчы, і хлопчыкаў-двайнятак. Цяпер ён гадуе яе дзяцей, любіць яе, называе «навагодняя мая». І ўсё было б добра, каб яна перыядычна не хадзіла ля чужога плота, як тады каля ізняга. Ну, а як вып'е маладзіца, прывячае кожнага, хто пакліча. Так і жывуць. Нават маці таго хлопца змірылася, чакае, што нявестка неўзабаве возьмецца за розум, і ўсё ў іх сям'і наладзіцца. Яна ж, як не п'е, добрая, спагадлівая, кацяняці бадзяжнага не праміне, каб не накарміць. Але ўвесь час павінна быць пад наглядам. Як той казаў: крок управа, крок улева, і — гатовая. Таму свякроўка нават распрацавала свой тайны план на святкаванні Новага года без спіртнога.

— Што толькі не зробіш дзеля спакою ў хаце, — уздыхае іх суседка і дадае, што яна на такія подзвігі, хутчэй за ўсё, не здольная, яе «выхаванне» звялося б да выстаўлення рэчаў нявесткі за парог. — Цацкацца з такімі не варта, — заключае жанчына, якая выгадавала траіх дзяцей, мае ўнукаў.

Варта ці не варта, тут у кожнага свой адказ. А тое, што вясковая кабета аб'явіла ў сваім доме свята безалкагольным, вельмі нават правільна. Каб ва ўсіх маладзіц былі такія свякроўкі альбо ў дзецюкоў цешчы, то і менш усялякіх святочных здарэнняў адбывалася б. Доктар траўмапункта бальніцы хуткай дапамогі расказваў, як летась у самае свята прывезлі па хуткай маладую жанчыну з разбітай патыліцай. Пакуль агледзалі, пацікавіліся, ці няма ў яе алергіі на што-небудзь.

— Няма, — адказвае. А потым, нібы схамянуўшыся: — Не, усё ж ёсць... на кісламалочныя прадукты.

Просяць расказаць падрабязней, і яна выдае: «Мы з сяброўкай выпілі паўлітра спірту. Потым я закусіла ёгуртам, і адразу нібы выключылася, бразнулася з табурэткі, пабіла галаву». Вось такая гісторыя хваробы. Амаль тыповая для профільных аддзяленняў бальніц.

Яшчэ доктар казаў, што ў святы людзі паступаюць спрэс з сардэчнымі праблемамі. Нярэдка не толькі таму, што чалавек моцна перабраў, а таму, што яму наогул піць нельга, а ён гэтага не ведае. Нават малая доза алкаголю пры пэўных сардэчных хваробах здольная справакаваць прыступ мігальнай арытміі, што вельмі небяспечна. Гэты стан урачы яшчэ называюць «сіндромам святочнага сэрца». А я такому словазлучэнню надала б яшчэ адно значэнне. Здагадваецеся, якое? Маю на ўвазе тую жанчыну, якая не губляе веры, дае шанц нават піттушчай нявестцы. І таго чыноўніка, які не абышоў увагай простага чалавека.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Сямейнае чытанне са «Звяздой»

# НАШЫ КНІГІ — У ВАШУ ХАТУ

**Новы год — час дзівосаў і падарункаў, пранізліва шчырых, нечаканых, відавочна смешных, прыемна зручных, карысных... Да святочна-сюрпрызнага марафону вырашыла далучыцца і «Звязда». Нашы карэспандэнты днямі завіталі ў госці да цудоўных жанчын, прафесія якіх — выхоўваць дзяцей. Зразумела, прыйшлі не з пустымі рукамі: з беларускамоўнымі дзіцячымі кнігамі і часопісамі Выдавецкага дома «Звязда» (нагадаем, што сёлета ён стаў адным з заснавальнікаў рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне»).**



Калі мы завіталі ў кватэру, дзе жывуць героі нашага рэпартажу, — сям'я была далёка не ў поўным зборы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Такіх людзей, як мама Ніна Домніч і яе дарослая дачка Вольга Лазаковіч, якія выхоўваюць у дамах сямейнага тыпу 18 непаўналетніх дзетак на дваіх, яшчэ трэба пашукаць! Зразумела, жывуць дзве сям'і асобна, аднак адлегласць паміж дамамі невялікая — праз дарогу. Таму ўся дзятва сябруе паміж сабой; часта сустракаюцца, дапамагаюць адно аднаму. Вольга — яшчэ і хросная мама Тані, адной з дачок Ніны. Увогуле, усе стасункі, што звязваюць паміж сабой абедзве сям'і, пералічыць цяжка.

## «Нам — з рыссю, вам — з птушкамі»

У падарунак рознаўзроставай дзятве, якая сабралася ў доме Вольгі Паўлаўны, мы прынеслі ні многа ні мала дзве торбы кніжак. Ледзьве дасталі іх з пакетаў, як малеча адразу расцягнула кнігі, часопісы і календары, так што ўрачыстага ўручэння, як планавалася, не атрымалася. Сяргей адразу стаў шукаць малюнкі ў кнізе з казкамі. Света вадзіла пальчыкам па старонцы і старанна чытала па складах. Больш дарослыя хлопцы сціпла падзякавалі і пачалі акуратненька гартаць кнігі, ацэньваючы іх змест... Каляндарыкі з выявамі звяроў і смешнымі малпачкамі ад часопіса «Вожык» малыя вырашылі скарыстоўваць як закладкі для кніг... (Назіраючы такі ажыятаж, мы міжволі парадаваліся, што некаторыя з дзяцей былі на адпачынку.)

**«У Казахстане вельмі марозныя зімы, а я, сямігадовая, прыходзіла дахаты і «адхуквала» настылы замок ці запалкамі яго грэла, каб адчыніць дзверы. І плакала».**

Каб даць магчымасць убачыць падарункі і матулям, прыйшлося прыдумаць дзецям «працу» — надзімаць паветраныя шарыкі з лагатыпам «Звязды». З імі малыя ў хуткім часе і пайшлі ў школу, бо завіталі мы ў госці з самага ранку. Дома засталіся толькі Таня і Света — дочкі Ніны, якія пачалі дзяліць падарункі. Хоць і сябруем і жывём побач, але кнігі ўсё ж падзелім, вырашылі дзяўчынкі.

*— Вось гэтая кніга хай будзе дзеткам Вольгі — яна для маленькіх: гэтыя вершыкі — таксама ім, а гэта — нам,* — раскладае Танечка падарункі на два бакі.

— Вой, а часопісы ўсе розныя, як іх падзяліць? — засмучаецца Святлана, трымаючы ў руках «Родную прыроду».

— Мы іх усе забяром сабе, — вырашае Таня.

— *Ну, не!* — уступае ў размову мама Вольга. — *Нам вось гэты, з рыссю, і гэты, а вам — з птушкамі.*

## «11 дзяцей — малавата»

Калі падарунак прыйшоўся дарэчы, гэта відаць адразу. Слухаючы развагі малых, мы ўпэўніліся, што кнігі трапілі да цікаўных дзяцей і будуць карысныя.

— *У нас кнігі будуць чытаць,* — пацвердзіла нашы спадзяванні Ніна ДОМНІЧ. — *У нас існуе традыцыя — перад сном у дзяцей ёсць свой уласны час, калі яны могуць пагаварыць або пачытаць, і большасць з іх менавіта чытае. Бывае, што і спаць укласці цяжка. Кажуць: «Дай дачытаць, цікава ж!». Мне гэта вельмі падабаецца. Любоў да чытання сведчыць пра адпаведнае выхаванне. Упэўнена, што калі дзецям не прывіць цікавасць да кніг з дзяцінства, то і пасталеўшы яны чытаць не будуць.*

Сама Ніна Эдуардаўна, дзяцінства якой, дарэчы, прайшло ў Казахстане, у свой час вывучыла беларускую мову па часопісах «Вожык», «Работніца і сялянка», якія выпісвалі бацькі.

Ніна ўвогуле незвычайная жанчына, імпэту і моцы ў яе хапае літаральна на ўсё. Дзвюх малодшых дочак — Таню і Свету — яна нарадзіла ў 40 і 44 гады, дзвюх дзяўчынак удачарыла. У 46 гадоў (2010-ты) пераехала з Бабруйска, дзе доўгі час была мамай прыёмнай сям'і, у сталіцу, каб стаць на чале дзіцячага дому сямейнага тыпу. Пры гэтым яна яшчэ паспявае старшынстваваць у грамадскім аб'яднанні замяшчальных сем'яў.

*— Я хачу выхоўваць шмат дзяцей, і тых 11, якія ў мяне ёсць цяпер, мне нават і малавата. Мама — гэта ў мяне не прафесія, а форма існавання. Па-іншаму не змагла б. Магчыма, я кампенсую гэтым тое, чаго маленькай не атрымала ў сям'і. Мая мама памерла, калі мне было 16,* — успамінае Ніна. — *У Казахстане вельмі марозныя зімы, а я, сямігадовая, прыходзіла дахаты і «адхуквала» настылы замок ці запалкамі яго грэла, каб адчыніць дзверы. І плакала. Дала сабе слова, што калі ў мяне з'явяцца дзеці, працаваць дзесьці яшчэ не буду. Так і адбылося. Я шыла, пякла, чаго толькі не рабіла, але заўсёды была дома, калі малыя вярталіся са школы.*

## Чытанне за цукеркі?

Слухаючы развагі маці пра кнігі, Вольга дадае:

*— Наш другакласнік Данік сапраўды любіць чытаць, прычым кнігі на дарослую тэматыку. А вось 6-гадовы Сяргей трошкі шантажыст. У яго алергія на салодкае, таму ласункі выпадаюць нячаста. Дык ён, была справа, прызвычаіўся есці за ўзнагароду... цукеркай. Кнігі, баюся, таксама будзе за ласункі чытаць* (усміхаецца). *Затое, як ён лічыць «на цукерках» умее — ні на чым іншым так не атрымліваецца!* (Смяяліся ўсе.)

— Яны ўсе ў нас будуць чытаць, мы вам абяцаем, — далучаецца да размовы муж Вольгі Максім. Верым яго ўпэўненым словам, таму што часцей за ўсё менавіта довады таты малеча ўспрымае як кіраўніцтва да дзеяння.



Света і Таня сфатаграфаваліся з кніжкамі і часопісамі, якія падарылі супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда».

Вольга Лазаковіч кажа, што першы час, сышоўшы ад маці, вельмі сумавала, часта наведвала яе, дапамагала даглядаць малодшых. Маючы поўнае ўяўленне аб акалічнасцях жыцця ў вялікай сям'і, прапусціўшы праз сябе ўсе яго радасці і цяжкасці, яна вырашыла працягнуць справу матулі. Пачаўшы працаваць у ліпені 2011-га, да лістапада Вольга ўжо выхоўвала семярых дзетак — зараз іх зноў сем, разам з Міронам, які нарадзіўся некалькі месяцаў таму (адна з дзяўчатак ужо жыве самастойна).

— *Мне падабаецца быць з дзецьмі, падабаецца даглядаць іх, аднак, каб адчуваць сябе камфортна, без надрыву, мне дастаткова васьмярых дзяцей — больш было б цяжка,* — прызнаецца яна. — *Разам з тым калі нехта адзін з'яздждае на адпачынак, мне ўжо здаецца, што нас замала.*

...За душэўнымі размовамі праляцела некалькі прыемных гадзін, на працягу якіх мы пачулі шмат смешных і цікавых гісторый з сямейнага жыцця і нават даведаліся (па сакрэце), куды дзятва хавае лісты для Дзеда Мароза. Усе свае жаданні яна адпраўляюць у... маразільнік. Ну дзе ж яшчэ казачны персанаж будзе іх шукаць.

Развіталіся мы цёпла і па-сяброўску, адчуваючы, што ў гэтыя перадсвяточныя дні зрабілі невялічкую, але вельмі важную справу — знайшлі цікаўных гаспадароў для цудоўных кніг.

**Ірына СІДАРОК**

## Валерый КАЗАКОЎ:

# «БОГ СПЫТАЕЦЦА «ХТО ТЫ?» ПА-БЕЛАРУСКУ...»

### Расійскі палітык, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч пра свае беларускія карані, сямейныя традыцыі, чыноўнікаў і моц роднага слова



**Ці ведаеце вы, што снежань — найлепшы час для лёсавызначальных знаёмстваў? Псіхолагі тлумачаць гэта тым, што набліжаецца Новы год і Каляды — традыцыйна сямейныя святы, якія мы не хочам сустракаць у адзіноце. Дарэчы, нават Валерый Казакоў — жывы прыклад гэтых сцвярджэнняў. З магілёўчанкай Аксанай Дубінскай ён пазнаёміўся на навагодняй вечарыне ў агульных знаёмых. Для пачатку новыя сябры проста абмяняліся тэлефонамі, але стасункі на адлегласці толькі пацвердзілі — сустрэча не была выпадковай. Магчыма, з таго часу Валерый стаў яшчэ бліжэй да Магілёва. Бо цяпер у яго тут ёсць яшчэ і цешча. Наогул гэта чалавек з цікавым лёсам, яго жыццё падобна да рамана, насычанага рознымі перыпетыямі, паваротамі сюжэта, нечаканымі падзеямі. Падчас размовы, якая адбылася за гадзіну да прысвечанай яму вечарынкі-партрэта, мы толькі крышачку закранулі тыя ці іншыя тэмы. Астатняе ён параіў шукаць у яго кніжках. Бо яны — працяг рэальна перажытых ім падзей.**

### Візітная картка

*Валерый Мікалаевіч Казакоў займаў розныя пасады ў Савеце бяспекі РФ, адміністрацыі Прэзідэнта Расіі, Расійскім саюзе ветэранаў Афганістана. Палкоўнік запасу, кандыдат сацыялагічных навук, праваздейны дзяржаўны саветнік Расійскай Федэрацыі, член Саюзаў пісьменнікаў Расіі і Беларусі. Піша пра тое, што перажыў і ў чым добра разбіраецца, што хвалюе і не дазваляе маўчаць. З-пад яго пяра выйшлі паэтычны зборнік «Філасофія гуку», кнігі «Разбітае люстэрка Карабаха», «Асфальт і цені» і іншыя. Творы перакладзены на эстонскую, польскую, украінскую, сербскую, англійскую і нямецкую мовы. Казакоў — лаўрэат Вялікай літаратурнай прэміі Расіі (за кнігу «Запіскі каланіяльнага чыноўніка»), літаратурнай прэміі імя Грыбаедава, міжнароднай прэміі імя Пікуля («Цень гобліна»), прэміі Саюза пісьменнікаў Сербіі. Узнагароджаны медалём за ўклад у развіццё беларускай літаратуры. А зусім нядаўна стаў лаўрэатам Дзяржпрэміі ўрада РФ у вобласці культуры.*

*У 2010 годзе Валерый Казакоў выбраны старшынёй федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі пісьменнікаў Расіі і Беларусі. Адна з мэт гэтага аб'яднання — спрыяць вяртанню на тэрыторыю Беларусі тых культурных каштоўнасцяў, якія з'яўляюцца нацыянальным здабыткам і былі вывезены з краіны. Летась за ўклад ва ўмацаванне культурных сувязяў Расіі і Беларусі Валерыю Казакову ўручана медаль Францыска Скарыны. Дзякуючы праграме «Вяртанне», якую ён курыруе, музеям Беларусі перададзены шматлікія каштоўнасці, сярод якіх Статут ВКЛ, песнапенні XVII стагоддзя, электронныя копіі Слуцкага і Баркулабаўскага летапісаў і іншыя.*

## «Паступіць у ваеннае вучылішча мне дапамагала... траўрадная пляменніца Чэхава»

**— Вы чалавек вядомы, а для магілёўчан яшчэ і зусім свой. Дзякуючы вам у горадзе папаўняюцца музейныя і бібліятэчныя фонды. За апошнія 7 гадоў чытачы той жа бібліятэкі імя Карла Маркса змаглі далучыцца да сапраўдных скарбаў гістарычнай і мастацкай літаратуры. Адно толькі факсімільнае выданне летапіснага зводу «Падручнік кніг для царскіх дзяцей» чаго вартае. Наколькі для вас важна тое, чым вы займаецеся?**

— Хоць бібліятэка, куды я бегаў падлеткам, знаходзілася ў Доме культуры чыгуначнікаў, я быў запісаны і ў цэнтральнай гарадской. Цяпер мы цесна сябруем, хаця я не магу зразумець, чаму бібліятэка, якая знаходзіцца ў самым цэнтры горада, дагэтуль носіць дзіўнае імя — Карла Маркса. Якія ён мае адносіны да Магілёва, незразумела. А галоўнае, якія адносіны ён мае да нашай літаратуры. Я неадназоўна прапаноўваў змяніць назву. І спадзяюся, што прыйдзе час, калі бібліятэка возьме імя таго ж Караткевіча. Чаму б не? Або кагосьці з нашых землякоў, якія мелі дачыненне да творчай працы.

Што датычыцца важнасці таго, што я раблю, безумоўна, мне заўсёды хацелася, каб беларусы ведалі сваю гісторыю і ганарыліся ёй. Да пэўнага часу я таксама жыў сабе расійскім чалавекам і не задумваўся пра карані, а потым пачаў капацца ў сваім радаводзе, цікавіцца ўсім, што датычыцца Беларусі. Раптоўна я ўбачыў, што вакол мяне ў Маскве жыве шмат беларусаў. Пачаў глядзець, хто мае продкі, адкуль узялося прозвішча Раманкевіч па матулінай лініі, цікавіцца старымі фотаздымкамі. Ад мамы засталіся некаторыя рэчы, якія павінны перадавацца нашчадкам. А ўлічваючы, што ў мяне ёсць і сыны, і дочкі, і ўнукі, і ўнучкі, мне ёсць што ім пакінуць. Але разам з матэрыяльнымі каштоўнасцямі трэба перадаваць і духоўныя. У мяне няма ніводнага твора, дзе не было б беларуса. І гэтыя героі, як правіла, станоўчыя. Крок за крокам мне адкрываецца глыбіня беларускай гісторыі. І трэба рабіць усё, каб яе захаваць. Калі прымаў удзел у вяртанні Статута ВКЛ для Магілёва, адзін з высокапастаўленых начальнікаў сказаў, што гэта літоўскі Статут, маўляў, прычым тут беларусы. Ён нават не ведаў, што тэкст напісаны на беларускай мове.

**— У сваіх творах вы не забываеце пра сваю маленькую радзіму. А ці хапае часу наведваць яе? Я маю на ўвазе вёску Гарбаевічы Чавускага раёна.**

— Безумоўна — на Радаўніцу. У нашым родзе так заведзена — наведваць магілкі блізкіх у гэты дзень. Нават мае начальнікі ведаюць, што якія сур'ёзныя справы не стаялі б перада мной, я абавязкова ў гэты дзень павінен быць на радзіме.

**— Калісьці вы пачыналі на магілёўскім «Ліфтмашы», а потым кардынальна змянілі свой род заняткаў. Што да гэтага падштурхнула?**

— Гэта была цэлая эпапея. Спачатку я хацеў паступіць у будаўнічы тэхнікум, але не атрымалася, і я пайшоў зноў даvучвацца ў сваю 24-ю школу. Яе, на жаль, цяпер няма. А на завод пайшоў, каб зарабіць грошай і забяспечыць маці. Усё лета працаваў на «Ліфтмашы», а пасля забралі ў армію. Потым было ваеннае вучылішча, пасля якога я ўжо не вярнуўся ў Магілёў.

**— А што прымусіла пайсці ў літаратуру?**

— Вершы пісаць я пачаў даўно. Калісьці ў 50-я гады ў Магілёве было аб'яднанне «Прыдняпроўскія ветразі». Са мной нешта адбылося пасля 9-га класа. Я закінуў усе свае дваровыя кампаніі і пачаў цікавіцца мастацтвам. Мяне пацягнула ў тэатр (запісаўся ў драматычны гурток ДК чыгуначнікаў). Потым захапіўся літаратурай. Пасля арміі хацеў пісаць, быць ваенным журналістам. Але існавала адна праблема: у мяне былі складанасці з граматыкай, хоць змест заўсёды ацэньваўся на «выдатна». Я ніколі б не паступіў у вышэйшае ваеннае вучылішча, калі б не траўрадная пляменніца Антона Паўлавіча Чэхава. На падрыхтоўчых курсах у Германіі, дзе я праходзіў тэрміновую службу, яна выкладала літаратуру. Дарэчы, была жонкай афіцэра-лётчыка. Ёй імпанавала тое, што я ведаў, хто такі Чэхаў і захапляўся літаратурай. Яна маёй ручкай выправіла памылкі, і дзякуючы ёй я паступіў, куды хацеў.

## «Цікава, як добры чалавек ператвараецца ў чыноўніка»

**— Што вам перш за ўсё важна выказаць у сваіх творах?**

— Я вельмі позна пачаў пісаць. Першая мая кніга выйшла ў 2002 годзе. Цяпер у мяне дзесьці 20 кніг. Гэта зацягвае, без гэтага ўжо нельга. Тым больш што я ведаю такія рэчы, пра якія нельга маўчаць. Тэма, дзе галоўны персанаж — чыноўнік, застанецца для мяне галоўнай, таму што гэты свет мне знаёмы знутры, я ведаю ўсю подласць і веліч чыноўніцкага жыцця. Таму, калі вам будуць хлусіць, што чыноўніку цяжка жывецца, не верце, бо калі б гэта была праўда, ён пайшоў бы ў рознарабочыя. Чаму Салтыкоў-Шчадрыну было проста пра гэта пісаць? Ён сам быў віцэ-губернатарам і гэтыя «свіныя лычы» назіраў на свае вочы. Яму не трэба было тлумачыць, што гэта такое. Мне таксама не трэба тлумачыць, што такое «цень гобліна», наогул, хто такі гоблін. Мне цікава, чаму чалавек прыходзіць на ўладу ўвесь такі пушысты, а праз нейкі час яго ўжо і не пазнаць. Сядзіць такі «свіны лыч» і глядзіць дурнымі вачамі, не пазнае ні цябе, ні бацькоў. Што з ім адбылося, чаму наогул такое адбываецца? І што такое тады ўлада, калі яна так кардынальна мяняе чалавека? Чаму адбываецца трансфармацыя душэўных якасцяў чалавека, калі ён трапляе ва ўладу? У чым яе дасканаласць і недасканаласць?

**— І ў чым? Вы зразумелі?**

— Пра гэта я і пішу. Чытач можа даведацца пра гэта з маіх кніг.

**— А калі сфармуляваць коратка?**

— Калі б гэта можна было б сказаць у двух сказах, тады і пісаць не было б пра што. Як казаў адзін філосаф, хай будуць праклятыя ўсе тыя, хто гэтыя прыгожыя ісціны выказаў да нас. Таму не трэба спяшацца. Тым больш што і памыліцца можна. Не ўсе чыноўнікі аднолькавыя, усё гэта па-рознаму адбываецца.

**— А вас змянілі зносіны з чыноўнікамі? І ў які бок?**

— Па-рознаму было. Дзесьці мяне гэта загартавала, дзесьці разбэсціла. Пачынаеш разумець цану таго, што адбывалася, адбываецца і будзе адбывацца. Павінна быць унутранае люстэрка, у якое трэба глядзецца, каб паспець убачыць прыкметы змен. Калі погляд збоку адсутнічае, чалавек, лічы, страчаны.

**— Вы сябруеце і з простымі людзьмі, і з высокапастаўленымі чыноўнікамі. Ці можна лічыць, што вы — сувязное звяно паміж тымі і другімі?**

— Можна крытыкаваць уладу, але хачу адзначыць, што беларуская ўлада недалёка ад народа адышла. Яна ў крокавай даступнасці. Я ўжо пісаў пра тое, як аднойчы ішоў у Мінску па рынку і сустрэўся з Мясніковічам. Гэта ўсё роўна, калі б я сустрэў Мядзведзева на Чыркізоне. Або быў выпадак, калі я зайшоў у «Карону» ў Мінску, а мне насустрач Макей цялежку штурхае. У Расіі такога ўжо няма. Я не лічу сябе сувязным звяном, бо не трэба быць кімсьці, каб дайсці да кіраўніка горада або вобласці, калі гэта неабходна.

## «Мы не маем права хлусіць»

**— Вы, здаецца, па жыцці болей праўдалюб. А ці прыходзілася вам крывіць душой?**

— Праўдалюбы — толькі ў казках бываюць, і называюцца яны дрывасекі. Таму што, дзе дровы сякуць, там трэскі лятуць. Калі ўсюды лезці са сваёй праўдай, ты толькі людзей напалохаеш, а праўду спаганіш. Праўда — гэта страшная зброя, ёй не трэба проста так размахваць. Яна ж вельмі шматбаковая, шматгранная. Ты адну грань бачыш, а людзі — іншую. І твая праўда можа быць абсалютна непрымальнай для іншага чалавека. Я ніколі не адмаўляюся ад сваіх перакананняў. Падчас службы па маёй віне не загінуў ніводзін мой салдат: усе, каго мне маці даверылі, вярнуліся дадому жывымі. У мяне ёсць свае думкі, якія я не баюся выказваць. Нават калі гэта камусьці і не падабаецца. Мы не маем права хлусіць. У нас вельмі кароткае жыццё.

**— А былі выпадкі, калі вы з-за сваіх перакананняў мелі ўсе магчымасці пацярпець?**

— Я меў дачыненне да камітэта ў абарону Аляксандра Салжаніцына. Гэта быў пачатак 70-х, яго яшчэ не выгналі з Расіі. Кіраўніком гэтай арганізацыі быў старшы лейтэнант з Данецкага ваенна-палітычнага вучылішча. Але мяне рэпрэсіі не закранулі. Я закончыў ВНУ. Наступствы былі для старэйшых рабят, якія больш сур'ёзна да гэтага ставіліся. Пасля гэтага мяне зацікавілі і лёс, і творчасць Салжаніцына — прарока і вялікага чалавека.

**— Ведаю, што вы неабыякава ставіцеся да стварэння музея Алесю Адамовічу ў Глушы Бабруйскага раёна.**

— Гэты музей абавязкова з'явіцца, таму што быў такі чалавек. Ён напісаў «Вайну пад стрэхамі» і шмат іншага, дзе расказаў пра мужных людзей, пра партызанаў. Пра тое, што ён сам бачыў і перажыў. І была ў Глушы аптэка — явачны пункт, куды прыходзілі партызаны і падпольшчыкі. Было вялікае супрацьўленне нашага народа страшнаму, разумнаму, падступнаму і моцнаму ворагу. Адамовічу можна паставіць помнік ужо толькі за тое, што ён разам з Элемам Клімавым зрабіў фільм «Ідзі і глядзі». Гэта геніяльная кінастужка. Нельга забываць і пра тое, што Алесь Адамовіч разам з Васілём Быкавым з'яўляюцца духоўнымі роданачальнікамі нашай сённяшняй лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі — Святланы Алексіевіч. Абяцаю зрабіць усё магчымае, каб толькі быў гэты музей.

**— Вы думаеце, што праблема яго адкрыцця толькі ў грашах?**

— Мне здаецца, уся бяда ў нашым адзічэнні. Калі мы перастаём памятаць пра тых, дзякуючы каму мы сёння жывем. Пра тых падпольшчыкаў, закатаваных людзей, якія аддалі свае жыцці дзеля Перамогі. Мы сёння сядзім і робім выгляд вялікіх начальнікаў у той момант, калі трэба проста зрабіць крок. Знаходзім грошы на канцэрты, а на памяць і гісторыю свайго краю сродкаў не хапае. Тым больш гераічную гісторыю. Не ведаю, чаму такое стаўленне да класікаў беларускай літаратуры. Гэта былі дзяржаўныя людзі, яны думалі пра будучыню свайго народа. Дзяржава не мае права іх забываць.

**— Вы неяк казалі, што беларусам прасцей лічыць сябе рускімі. Чаму так адбываецца?**

— Таму што выгадна. Па грашах. Прычым рускімі яны становяцца ў Расіі, а не ў Беларусі.

**— Вы ведаеце і паважаеце родную мову. Але, на жаль, хапае людзей, якія не толькі не жадаюць размаўляць па-беларуску, але нават і чытаць...**

— Гэта няправільна. Беларусы павінны ведаць сваю мову. Магчыма, у жыцці яна камусьці і не спатрэбіцца, але ж калі ён прыйдзе да Бога, той спытаецца ў яго па-беларуску: «Хто ты такі?» Бо ён ведае, што ты беларус. І калі ты адкажаш на іншай мове, яшчэ невядома, куды ён цябе пашле.

*Пасля мерапрыемства ў ратушы мы яшчэ некалькі хвілін пагутарылі з жонкай пісьменніка — Аксанай. Разам з дачкой яна сціпла трымалася ў баку да таго часу, пакуль Валерый заставаўся ў цэнтры ўвагі. «Ці часта атрымліваеце падарожнічаць вось так, разам?» — пацікавілася я. «Стараемся як мага часцей, — усміхнулася Аксана. — Вельмі падабаюцца Італія, Чарнагорыя, Куба. Не перастаю здзіўляцца таму, як шмат Валерый ведае. Бывае, што ён нават аспрэчвае словы экскурсаводаў». Што датычыцца Новага года, то гэта сапраўды знакавае для сужэнцаў свята. «Валерый кожны дзень імкнецца зрабіць для нас з дачкой нешта прыемнае, радуе падарункамі, — прызналася Алена. — Напэўна, тым, хто, як мы, сустрэліся на Новы год, сапраўды шчасціць. Я ў гэтым нават не сумняваюся».*

Нэлі ЗІГУЛЯ. zigulya@zviazda.by

Фота аўтара.

# «ПА ТЭЛЕБАЧАННІ Б'ЮЦЬ КУРАНТЫ, А Я ЗАЯВУ НА СКАНДАЛІСТА ПРЫМАЮ»

**У святочных кінафільмах людзей, якім, у адрозненне ад сяброў, сваякоў, прыходзіцца працаваць у навагоднюю ноч, паказваюць засмучанымі. Маўляў, усім адпачываць, а мне — рабіць. Каб лепш зразумець такіх «шчаслівчыкаў», «Звязда» сабрала тры гісторыі, кожная з якіх па-свойму цікавая і адметная.**

**Валянцін, намеснік начальніка аддзела Цэнтральнага РУУС г. Мінска:**



— У першыя міліцэйскія гады сустракаць Новы год на службе было неяк нязвыкла. Атрымлівалася, што ўсе родныя і сябры адпачываюць, святкуюць, а ты ідзеш на службу. Хоць я добра разумеў: каб усе маглі святкаваць, камусьці трэба для гэтага працаваць. З часам уцягнуўся, і цяпер да гэтага стаўлюся звыкла. За гады службы я толькі некалькі разоў у навагоднія свята быў дома. Аднак менавіта з-за гэтага хатняе святкаванне становіцца і больш каштоўным. Калі ўзгадваю кур'ёзныя навагоднія гісторыі, прыгадваю адзін даўнейшы выпадак, які адбыўся тады, калі яшчэ і мабільных тэлефонаў не было. Калісьці мы дапамагалі ДАІ несці службу на пастах. Гэта якраз здарылася 31 снежня. Да Новага года заставалася ўсяго гадзіна. У той раз мы стаялі на Даўгінаўскім тракце, як раптам да нас падышоў мужчына. Як аказалася, у яго зламалася машына, ён спяшаўся дадому. Аўтамабіль сапраўды не заводзіўся — праблемы з рухавіком. Пагледзелі ў салон, а там падарункі ляжаць. І больш за ўсё мужчына хваляваўся, што дзеткі могуць застацца без гэтых падарункаў. Што рабіць, прыйшлося дапамагчы — падвезці чалавека дадому. За паўгадзіны справіліся, і так атрымалася, што ў 23:45 ён з падарункамі ўжо быў разам са сваякамі. Іншым разам я сустрэў Новы год у кампаніі з сямейным скандалістам. І ў час, калі па тэлебачанні білі куранты, я сядзеў разам з калегам і прымаў заяву. Дарэчы, у кватэры ўсё было па-святочнаму прыбрана, стаяў накрыты стол, але муж прыйшоў нападпітку, пасварыўся з жонкай, а тая выклікала міліцыю.

Новы год я па традыцыі буду сустракаць на службе. У нарад заступлю ў 19:00 і таму родных павіншую з надыходзячым святам крышачку раней. Ну а па-сапраўднаму — у сямейным коле і з келіхам шампанскага — буду сустракаць 2016 год ужо ўдзень 1 студзеня.

**Аляксандр, таксіст:**



— Да працы ў Новы год трэба проста прызвычаіцца і зразумець, што выхадныя дні, калі ўсе адпачываюць, для таксіста самыя залатыя. І таму я асабліва ніколі не перажываў. Сам такую працу выбраў, і скардзіцца нікому не трэба. Звычайна я як святкаваў? Каля 23 гадзін прыязджаў павіншаваць блізкіх сваякоў, папіць гарбаты, а пасля зноў выязджаў. Пры гэтым навагодняя ноч сапраўды вельмі складаная для працы. Многія проста не паважаюць тых, хто абслугоўвае іх у Новы год. Столькі фальшывых выклікаў, колькі я атрымліваю ў гэтае свята, я не прымаю ніколі. Нехта перадумаў, нехта забыўся, а тым часам ты адмаўляеш іншым, намотваеш кіламетраж, робіш шмат непатрэбных паездак. У той жа час ёсць пасажыры, якія паводзяць сябе карэктна, віншуюць, а напрыканцы нават спачуваюць таксісту, што працуе ў Новы год. А нехта наогул кажа: «Кідай машыну, хадзем з намі!». Самы позні заказ у старым годзе я атрымліваў у 23:57, а самы ранні ў новым — у 0:02. Мне цяжка ўявіць, што можна за хвіліну да бою курантаў, калі гэта не экстранны выпадак, прымусіць чалавека тэлефанаваць у таксі. У сваім жыцці я пабачыў многае. «Уключаць у сабе псіхолага» прыходзіцца пастаянна, адну адчайную дзяўчыну даволі нават за каўнер сцягваць з парэнчаў моста, але з каверзнымі сітуацыямі ў Новы год, дзякуй Богу, не сутыкаўся. Хоць Дзеда Мароза і Снягурку падвожу ў гэтыя святочныя дні пастаянна. Ну а калі іх вазіць? Не ў лютым жа!

**Павел, дыджэй:**



— Працаваць дыджэем у Новы год не так складана. Я б сказаў, што проста больш адказнасці. У навагоднюю ноч людзі чакаюць нейкага цуду, чараўніцтва, і трэба мець сур'ёзны падыход да працы, зрабіць свята для людзей больш эмацыйным, каб яно запомнілася. Ці сумна ад таго, што Новы год не сустракаю дома? Сама атмасфера не дае сумаваць! Але ў любым выпадку мне прыходзіцца свята спачатку сустракаць разам з роднымі і сябрамі, а пасля ўжо ехаць выступаць на вечарынку. У большасці выпадкаў сябры едуць са мной, «адрываюцца» напоўніцу. Пасля свайго выступу я далучаюся да іх.

Я выконваю бэйс, дабстэп, грайм, разам з сябрамі з руху «Басота» развіваю андэграўндныя напрамкі электроннай музыкі. І слухачы неадной-чы падыходзілі і прасілі «памяняць пласцінку». Прапаноўвалі грошы, каб паставілі іншую музыку, але я падобным ніколі не займаюся. А ўвогуле дыджэй у Новы год — заўжды паважаная асоба. І калі людзі прыходзяць у клуб не проста выпіць, а яшчэ і паслухаць артыста, яны паводзяць сябе адэкватна, уважліва слухаюць музыку і танцуюць, нешта выносяць для сябе і весяляцца. У кожнага па-розному.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

■ Святочная гісторыя

# АПОШНЯЕ ЖАДАННЕ

Перад Новым годам у мястэчку, як заўсёды, залілі коўзанку і, калі яна добра замерзла, пасярэдзіне паставілі ёлку. Усе месцачковыя дзеці збегліся, каб паглядзець на яе, а потым — удосталь пакатацца ды паштурхацца на лёдзе.

Машачка ў кампаніі малых была самай маленькай, яна коўзалася вельмі асцярожна, але ўсё ж не ўстаяла на нагах, павалілася — ды пад самай ялінкай! Хацела тут жа падняцца, устаць — ухапілася за калючую лапку і раптам убачыла, што на ёй, замест цацкі, падвешаны маленькі папяровы канверцік. Маша з цікаўнасцю адкрыла яго і прачытала ўкладзеную туды запісачку: «Выконваю ўсе жаданні! Дзед Мароз».

— Гэта ж трэба! — узрадавалася дзяўчынка і хуценька пабегла дамоў. Яна ўсёй душой верыла ў цуды, а таму на лісце паперы старанна вывела: «Дзядулечка, зрабі, калі ласка, так, каб мая мама ніколі не хварэла». Потым злажыла лісток папалам і занесла яго пад ёлку.

Вярнуўшыся дамоў, Маша з радасцю падумала: «Ура, збылося!», бо ўбачыла, што мама вельмі вясёлая.

Тады дзяўчынка пабегла ў пакой па новы лісток паперы. «Хачу, каб мама ўбачыла мяне па тэлевізары», — пажадала яна і стала чакаць заўтрашняга дня.

Раніцай, спехам паснедаўшы, яна панеслася на коўзанку. Але не паспела дайсці да ёлкі і пакласці запісачку, як туды ж пад'ехала машына з надпісам «Тэлебачанне». Аператар стаў здымаць зімовы сюжэт і, відома ж, звярнуў увагу на маленькую дзяўчынку ў чырвонай вязанай шапачцы.

Увечары, гледзячы тэлевізар, маці пляснула ў ладкі і закрычала:

— Глядзіце, гэта ж наша Машачка!

«Зноў збылося!» — узрадавалася дзяўчынка.

На наступны дзень пад ёлкай ляжала яе новая задачка для Дзеда Мароза: «Хачу, каб мне падарылі сабачку». І што вы думаеце, — у той жа вечар, вярнуўшыся з працы, тата неяк вінавата паглядзеў на іх і — ці ж не дзіва?! — дастаў з-за пазухі маленькае вушастае шчаня!

— Прабач, — сказаў ён маме, — але я не змог прайсці міма...

Далей Маша не чула.

— Гэта жах які цуд! — шаптала яна, тулячы да твару маленькага пухнатага сабачку, гладзячы яго і ўжо разам з ім, новым сябруком, прыдумваючы новае заданне для Дзеда Мароза: «Хачу, каб у мяне з'явіўся брацік».

Уся раніца і ўвесь наступны дзень прайшлі ў марным чаканні: брацік не было. Але вечарам дзяўчынка пачула, што мама па тэлефоне размаўляе са сваёй мамай, расказвае ёй, што была ў доктара... «Не, ты не хвалюйся, — супакойвае бабулю, — усё нармальна... Проста ў нас будзе маленькі».

— ?!

Маша, пачуўшы гэта, падхапіла на рукі шчаня і заскакала па хаце, напяваючы: «Дзед Мароз, Дзед Мароз, колькі радасці прынёс!»...

Сабачку танцы не вельмі спадабаліся, ды і танцорка хутка змарылася, уваліася ў крэсла — стала разважаць, што б ёй яшчэ папрасіць у Дзеда Мароза? Час быў для самых таемных жаданняў. І таму, пасядзеўшы над лістком паперы, Маша летуценна вывела: «Хачу, каб мяне абняў Коля з 10-га «Б».

Пасля абеду і сапраўды на коўзанку сышлося шмат падлеткаў. Маша хацела неўпрыкмет прабрацца паміж імі і пакласці пад ёлку свой лісток. Але не паспела: на сярэдзіне катка за яе зачапіўся нейкі цыбаты падлетак, крыкнуў: «Малая, што ты крушішся пад нагамі?» — і, абняўшы за плечы, бразнуўся на лёд.

Вы здагадаліся — гэта быў... дзесяцікласнік Коля — прыгажун, паэт, мара ўсіх месцачковых дзяўчатак.

«Але ж абняў ён менавіта мяне!» — святкавала Маша. І думала: «Што ж бывае пасля таго, як хлопец абдыме дзяўчыну?».

Думала так па дарозе дадому, потым — за сталом падчас вячэры, потым — лежачы ў ложку і згадваючы кадры з фільмаў, якія ёй удалося падгледзець...

Так нічога і не прыдумаўшы, дзяўчынка заснула.

А раніцай раптам успомніла, як тата, сыходзячы на рыбалку, абняў маму, і на наступны дзень яна сказала бабулі, што ў іх будзе маленькі.

«Як жа я адразу не здагадалася?!» — узрадавалася Маша, зноў узяла лісток паперы, акуратна напісала: «Дзед Мароз, я хачу, каб у мяне нарадзілася дзіцятка...» і, падумаўшы, дадала: «...Да заўтрашняга дня». «Заўтра якраз Новы год, — разважала яна. — і ў нас з'явіцца двое дзетак: у мамы — сваё, а ў мяне — сваё».

Схаваўшы лісток у рукавічку, Машачка пабегла да катка, а там — да сваёй чароўнай ёлкі... Ад якой насустрач ёй, відаць, удосталь накатаўшыся, ішоў... Ну вядома ж, сам Коля!

— Добры дзень! — павіталася з ім дзяўчынка.

— Прывітанне, малая! — адазваўся юнак.

— З жанчынамі так не размаўляюць! — пакрыўдзілася Маша.

— А дзе тут жанчына? — стаў азірацца Коля.

— Я, — горда сказала яму першакласніца. — Заўтра ў мяне ад вас народзіцца дзіця.

— Дзяўчынка, як табе не сорамна? — спытаў Коля і, сцепануўшы плячыма, пайшоў з катка.

— Ну і не трэба! Не трэба, — праз слёзы замармытала дзяўчынка. Яна глядзела ўслед крыўдзіцелю і на дробныя шматочкі рвала сваю запіску, ведаючы, што больш не пойдзе да ёлкі, бо гэтае жаданне было самае апошняе!

...І яго — у выглядзе белых пушынак — Маша сумна пусціла па ветры. Той падхапіў іх і весела закружыў, пагнаў па заснежанай дарозе.

Куды, спытаеце вы? Хто ведае... Магчыма, у будучыню.



**С. ЯКУБАВА,**
*г. Мінск.*

# ЁЛКУ МОЖНА... З'ЕСЦІ

**У Лепельскім раёне ўпершыню праводзяць агляд-конкурс «Найлепшая навагодняя ёлка».**



— Конкурс праводзіцца для падтрымкі традыцый і развіцця інавацый у арганізацыі і правядзенні навагодніх мерапрыемстваў, для прасоўвання з дапамогай рэкламы прадпрыемстваў, арганізацый, навучальных устаноў і творчых калектываў, — паведамілі «Звяздзе» ў Лепельскім раённым выканаўчым камітэце.

— І добра, што ў калектывах адгукнуліся людзі з фантазіяй і залатымі рукамі. Былі, праўда, і адгаворкі, маўляў, шмат спраў. Іншыя перажывалі, што можа не атрымацца... А потым, ужо на выстаўцы, ім вельмі прыемна было пачуць, што іх ёлка ўдалая, не горшая за «канкурэнтаў», — распавядае «Звяздзе» **дырэктар Лепельскага цэнтра рамёстваў Алена БАРАДЗЕЙКА.**

На сёння ва ўстанове культуры можна ўбачыць каля 70 крэатыўных ёлак. Сярод іх «медыцынская», са шпрыцоў, — твор медыкаў. Ёсць і ёлка, якую можна з'есці — ад пекараў. А яшчэ адна ёлка — з запасных частак ад тэхнікі. Фантазія, як той казаў, не мае межаў.

Паводле слоў кіраўніка ўстановы культуры, пераможцы па выніках галасавання членаў журы атрымаюць памятныя сувеніры. Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ: інавацыйнасць ідэі; крэатыўнасць; арыгінальнасць кампазіцыі; яркасць, казачнасць, упрыгожанасць, выразнасць і іншае.

Падвядзенне вынікаў конкурсу плануецца правесці падчас раённага свята Калядаў 7 студзеня.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з архіва Цэнтра рамёстваў.**

■ Застольнае

# Цёплым шампанскае не падаюць і залпам не п'юць

**Мы адкрываем шампанскае пад бой курантаў, калі ўжо няблага паласаваліся і «прыкладіся» да іншых напояў. А між тым пеністыя напоі падаюцца на іх радзіме, у Францыі, перад абедам — з маленькімі закускамі, і не за сталом, а ў гасцёўні.**



У нас немагчыма сустрэць Новы год без «стрэлу» у столь, хуткага разліву па келіхах і абавязковага загадвання жадання падчас выпівання.

У ідэале шампанскае або іншае пеністае віно, якое выпіваецца перад абедам, павінна быць сухім (брут). Гэтыя напоі трэба ахаладжваць перад ужываннем да 7-9 градусаў. Калі віно атрымаецца больш халодным, мы рызыкуем не адчуць усю прыгажосць смаку і водару, сцвярджаюць дасведчаныя самелье. Так што не кладзіце бутэльку ў маразілку. Ёй самае месца на ніжняй паліцы халадзільніка, дзе яна можа ляжаць 3-4 гадзіны і даўжэй.

Не трасіце бутэльку перад тым, як адкаркаваць. Акуратна размясціце пад вуглом 45 градусаў, зніміце фольгу і металічны гарсэт з корка. Добра трымаючы бутэльку, пачынайце круціць корак (не бутэльку).

Разліваць шампанскае трэба ў келіхі на высокіх ножках у форме конусу. Яны крыху расшыраюцца ўсярэдзіне і звужаюцца ў самым версе. Трымаць келіх трэба за ножку або за падножжа, каб не награваць напой. Нездарма правіла падачы шампанскага прадугледжвае пастаяннае знаходжанне бутэлькі ў вядзерцы з лёдам.

Наліваюць пеністае віно павольна, па сценцы келіха, у два прыёмы, дазваляючы пене асесці. Класічнае напаўненне келіха — на тры чвэрці.

Шампанскае не п'юць залпам. Перад яго ўжываннем варта паназіраць за гульнёй бурбалак і адчуць водар. Буйныя бурбалкі газу — прыкмета невысокай якасці пеністага віна.

Цікава, але шампанскае не рэкамендуецца піць з нафарбаванымі вуснамі. Бо ў састаў памады ўваходзяць сіліконы, якія нейтралізуюць асабліва каштоўныя вартасці пеністага віна.

У якасці закусак прапануюць бутэрброды з ікрой, вытрыманы сыр, салаты, стравы з белага мяса, дзічыны, плады і ягады. Гурманы не рэкамендуюць закусваць шампанскае шакаладам або кандытарскімі вырабамі, у якіх ёсць шакалад, — абодва прадукты губляюць непаўторны водар.

Паўночныя іспанцы жартуюць так на тэму шампанскіх він (у іх віно называецца «кава»/cava): «Без кавы раніца добрай не бывае!» Словам, шампанскае можа быць напоем не толькі дзённым, начным, але і... ранішнім. Але толькі па святах!

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*




■ Гэта цікава

# ЦІ БЫЛА ДЗЯЎЧЫНКА?

## Што звязвае скандальна знакамітую Моніку Левінскі з Віцебшчынай?

**Аказваецца, яна — сваячка Шагала. А ў Бешанковічах святкавала дзень нараджэння.**

## «ДЛЯ МЯНЕ ЯНА — НЕ АЎТАРЫТЭТ...»

У наступным годзе ў ЗША пройдуць прэзідэнцкія выбары. Нагадаю, сёлетняй вясной Хілары Клінтан, жонка экс-прэзідэнта, абвясціла аб вылучэнні сваёй кандыдатуры ад Дэмакратычнай партыі. І палітолагі лічаць яе фаварыткай. Па традыцыі СМІ «перамываюць костачкі» кандыдатам. Сексуальны скандал — інтымная сувязь Біла Клінтана з Левінскі, якой сёлета споўнілася 42 гады — таксама не забыты.

Па расійскіх тэлевізійных каналах, улічваючы, мякка кажучы, «нелюбоў» Хілары да Расіі, у апошні час перыядычна згадваюць тую гісторыю. Моніка (пасля таго, як стала вядома пра яе сувязь з прэзідэнтам) стала ледзь не самай знакамітай жанчынай планеты...

Калі, прыехаўшы ў Бешанковічы, пытаўся ў мясцовых пра пані Моніку, рэагавалі па-рознаму. Адны ўсміхаліся і раілі пісаць пра нешта «больш актуальнае». Іншыя казалі, што нічога пра гэта не чулі. А некаторыя чулі, але нічога канкрэтнага не ведаюць... А ў музеі мой інтарэс выклікаў шчырыя здзіўленні і смех.

— Ды ў Бешанковічах хто толькі не спыняўся! Пётр І спыняўся, магу распавесці і пра Кацярыну ІІ... А ў верасні 1821 года Аляксандр І у Бешанковічах мірыўся з гвардзейскім корпусам, які адправіў у паход у Літву пасля хваляванняў у Сямёнаўскім палку ў 1820 годзе... Пра Моніку таксама распавяду, хоць яна для мяне, скажам так, не аўтарытэт. Дакладна яна прыязджала ў Бешанковічы. Нават фота засталіся! — заінтрыгаваў Станіслаў Леаненка, галоўны захавальнік фондаў Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

## НЕКАЛЬКІ ВЕРСІЙ

Сёння Бешанковічы мала чым нагадваюць былое яўрэйскае мястэчка. Дарэчы, краязнаўцы па-рознаму тлумачаць саму назву райцэнтра. Больш распаўсюджана версія, што яна пайшла ад слова «бешань», якое азначае моцную плынь ракі. Ёсць і «яўрэйская версія». Быццам бы два браты-яўрэі з Лепеля па прозвішчы Шэнкіны пасяліліся на месцы будучага мястэчка. Тады модна было выкарыстоўваць латынь. А ў перакладзе з лацінскай мовы «бі» — гэта «два». Вось ад двух Шэнкіных і пайшла назва... Навуковыя даведнікі па тапаніміцы распавядаюць, што назва Бешанковічы магла быць утворана ад цюркскага слова «беш», што азначае пяць. Такое імя давалася пятаму дзіцяці ў сям'і. Або назва Бешанковічы ўзнікла ад прозвішча ці мянушкі з асновай «бешаны» (у сэнсе шалёны).

Станіслаў Леаненка пазнаёміў мяне з яшчэ адным краязнаўцам, Анатолем Крачкоўскім.

— Вось вам адна з маіх кніг пра Бешанковіцкі раён — там і пра Левінскі ёсць інфармацыя. На фота Моніка са сваякамі ля лодкі на беразе Заходняй Дзвіны... Пра Бешанковіцкі край я напісаў больш за трыццаць кніг, гісторыя «ўлезла ў мяне, як у шахцёра пыл». І ніяк «не магу адмыцца», — усміхаецца ён. — За 35 гадоў краязнаўства збіраў інфармацыю ў архівах Вільнюса, Гродна, Оршы, Полацка, Мінска і Віцебска. Калі ў Бешанковічах стваралі музей, была магчымасць у абласным архіве больш падрабязна вывучаць дакументы.

Родам Анатоль Вячаслававіч з Докшыцкага раёна. Працаваў дырэктарам Бешанковіцкага музея, у рэдакцыі раённай газеты. Аўтар мноства кніг. Сярод іх: «Край наш наддзвінскі», «Светлы бешанковіцкі куток», «Бачэйкава. Гісторыка-эканамічны нарыс».

**Тут жа утварыўся малады чалавек, мой пляменнік, васямнаццацігадовай боўдзіла. Ён ад яе не адыходзіў. Я яго разумею. Хлопцу час у войска. Ён працуе на трактары, знемагае ў сваёй вёсцы, дзе ён мала што бачыў. І тут прывозяць амерыканскую дзяўчынку... Бедны Лёва зламаўся, ён начаваў ля яе дзвярэй.**

— У Бешанковічах ёсць старыя яўрэйскія могілкі XVIII стагоддзя, на якіх пахаваны тысячы людзей. Сумная старонка ў гісторыі мясцовага яўрэйства — Вялікая Айчынная. Яўрэі з розных краін часта прыязджаюць у Бешанковічы. Прозвішчы сваякоў на помніках шукаюць, парадак на могілках наводзяць. І сям'я Левінскі там была, — працягвае ён.



Дзень нараджэння Монікі. Бешанковічы. 1987 год.

## БЭЛА ВЫБРАЛА МАРКА

Шмат карыснай для краязнаўцаў інфармацыі знайшлося ва ўспамінах дзядзькі Монікі. Вядома, што Моніка Сэміл Левінскі нарадзілася летам 1973 года ў Сан-Францыска. А ў Віцебску жыў яе дзядзька, родны брат бацькі.

— Міхаіл Сямёнавіч (Мойша Саламонавіч) Левінскі працаваў стаматолагам у Віцебску. Яго родны брат Беня Саламонавіч — бацька Монікі Левінскі. Жонка Міхаіла Сямёнавіча, у дзявоцтве Фокс, родам з мястэчка Бешанковічы. Менавіта туды ў жніўні 1987 года Міхаіл прывёз свайго брата Беню і яго дачку Моніку для знаёмства з роднымі. Эмігрыраваў у Ізраіль у 1999 годзе,— удакладняе Анатоль Крачкоўскі.

Аўтар гэтых радкоў, на жаль, не змог звязацца са спадаром Левінскі. Ці жывы ён? Ні ў скайпе, ні ў папулярных сацыяльных сетках яго прозвішча няма. Мяркуючы па яго ўспамінах, надрукаваных у 1990-я ў часопісе «Огонёк», Міхаіл Левінскі быў чалавекам з гумарам:

«Я лячу гэтыя зубы ўжо 40 гадоў. І, вы ведаеце, лепшымі яны не сталі, нягледзячы на «Блендамед» і «Дырол» без цукру. Вядома, я заўсёды жыў трошкі лепш, чым іншыя лекары, напрыклад тэрапеўт або педыятр. Усё-такі зубы — гэта зубы. Але сказаць, што я купаўся ў масле, не, я так не скажу. Часам лепш, часам горш, адзінае, што я магу сказаць: класці на паліцу ўласныя зубы мне не даводзілася ніколі...» І далей: «А я тут неяк пачаў складаць наша генеалагічнае дрэва. І такая дзіўная разгарнулася карціна, каго толькі няма ў нашым родзе! Дык вось пра дзядзьку Марка Шагала. У 1915 годзе ён ажаніўся з Бэлай. Мой дзед, яго звалі Ізраіль, таксама хацеў з ёй ажаніцца. Але Бэла не хацела зубнога ўрача, яна хацела мастака. Дзед быў так засмучаны.. Ён прыйшоў на іх вяселле і там добра разгледзеў адну з сясцёр Марка... Яна была зусім не горшая за Бэлу. І вось ужо на каго сапраўды найбольш падобная Моніка, дык гэта на старую Юдку, маю бабку».

## БЕДНЫ ЛЁВА...

Міхаіл Левінскі ў падрабязнасцях успамінаў аб знаходжанні Монікі на Віцебшчыне.

«Я павёз іх у Бешанковічы, там у мяне радня. Мая жонка была немка, цяпер яна памерла, яе прозвішча Фокс. Яны несапраўдныя немцы, яны з Казахстана, але ў іх ёсць сваякі ў Германіі. І вось мы паехалі да іх у Бешанковічы. Там такая прырода! Моніка купалася ў Дзвіне. Менавіта там ёй споўнілася 14 гадоў. Божа мой! Якім яна была выдатным дзіцем. Магчыма, для амерыканскага дзіцяці некалькі паўнаватай. Але не для Віцебска... Бацька скардзіўся, што яна не вельмі чыста гаворыць, у яе не атрымліваўся па-амерыканску гук «О». Але, на мой погляд, яна вельмі добра гаварыла на ідыш. ...Тут жа утварыўся (слова з арыгінала. — **Аўт.**) малады чалавек, мой пляменнік, васямнаццацігадовы боўдзіла. Ён ад яе не адыходзіў, як сабака. Я яго разумею. Хлопцу час у войска. Ён працуе на трактары, знемагае ў сваёй вёсцы, дзе ён мала што бачыў. І тут прывозяць амерыканскую дзяўчынку... Бедны Лёва зламаўся, ён начаваў ля яе дзвярэй. І ёй гэта падабалася, яна ж усё разумела. Жанчыны, яны ўсё пачынаюць разумець значна раней за нас; калі яны яшчэ зусім дзеці», — шчыра прызнаўся спадар Левінскі.

Ён успомніў і пра тое, што Лёва з Монікай дамовіліся зрабіць татуіроўкі на спіне: выяву дамы, а вакол кветкі. Хлопец зрабіў. Невядома, ці зрабіла яна. Потым Лёва эмігрыраваў. Спачатку да родных у Германію. Потым — у ЗША. Скончыў паліцэйскую акадэмію. На той час бацькі Монікі ўжо развяліся...

Міхаіл Левінскі ўпэўніваў, што менавіта Моніка дапамагла Лёве ўладкавацца ў Белы дом ахоўнікам. Гэта было ў 1995 годзе. А далей і здарылася тое, што прывяло да скандалу. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

*Бешанковічы — Віцебск.*

**Фота аўтара і з асабістага архіва краязнаўца Анатоля КРАЧКОЎСКАГА**



Моніка на Заходняй Дзвіне з Рыхардам Фоксам і яго ўнукамі.

# З ХЭПІ, ТАК БЫ МОВІЦЬ, НЬЮ ЕАР!

## ЯК У ІХ ЗБІРАЮЦЦА СУСТРЭЦЬ НАША СВЯТА



### ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

У розных кутках свету завяршаюцца апошнія прыгатаванні да сустрэчы Новага года. Гэта, мабыць, самае інтэрнацыянальнае свята. І, нягледзячы на розныя традыцыі народаў, аб'ядноўвае ўсіх адчуванне маючых адбыцца радасных перамен.



У Тайвані, напрыклад, усталявалі 36-метровую жывую ёлку *(на фота)*: галоўная гераіня навагодніх урачыстасцей кожную ноч забаўляе ўсіх ахвотных, паказваючы лазернае 3D-шоу з музычным суправаджэннем.

Жыхары філіпінскага горада Сан-Фернанда ў святочную ноч збяруцца на цэнтральнай плошчы, каб убачыць гіганцкія ліхтары. Феерычны Фестываль святла праходзіць перад навагоднімі святамі ўжо не першы год. Пяціметровыя зоркі ўспыхваюць тут ноччу шматколернымі ўзорамі.

А ў Мексіцы прайшоў незвычайны калядны караван, у якім Санта-Клаусы змянілі аленяў на матацыклы.

У амерыканскім штаце Канзас тым часам усталявалі яшчэ адзін святочны сусветны рэкорд: больш за тры тысячы гледачоў прыйшлі на баскетбольны матч у світарах з навагоднімі знакамі. Суддзя з Кнігі рэкордаў Гінеса гэта ацаніў, сказаўшы, што такі масавы флэшмоб, сапраўды, уражвае. Папярэдні рэкорд налічваў крыху больш за тысячу чалавек.

### $140 МІЛЬЯРДАЎ НА ПАДАРУНКІ

У Амерыцы падводзяць вынікі сезона традыцыйных святочных распродажаў, які звычайна адкрываецца ў Дзень падзякі і заканчваецца Калядамі. У гэты перыяд рытэйлеры праводзяць галоўныя акцыі года — Чорную пятніцу (пятніца пасля Дня падзякі), кіберпанядзелак (панядзелак пасля Чорнай пятніцы) і суперсуботу (апошняя субота перад Калядамі), калі крамы прапануюць найбольшыя зніжкі і самыя выгадныя здзелкі тым, хто яшчэ не паспеў купіць падарункі і спрабуе скарыстацца апошнім шанцам для гэтага.

Па звестках даследчай кампаніі ShopperTrak, продажы ў Чорную пятніцу дасягнулі $10,2 млрд, што на 11,2% ніжэй, чым летась, а продажы кіберпанядзелка выраслі на 12% і ўпершыню перавысілі $2 млрд. Эксперты тлумачаць гэта захаваннем тэндэнцыі да перамяшчэння продажаў са звычайных крам у інтэрнэт.



Усяго ж у адыходзячым 2015-м, па даных даследавання актыўнасці спажыўцоў, у сезон святочных продажаў амерыканцы гатовы выдаткаваць на куплю падарункаў і святочнай атрыбутыкі ў сярэднім $630, што ў суме складае каля $140 млрд.

### ПАД МУЗЫКУ... ПЕТАРД

Больш за 850 гарадоў Італіі ўвялі забарону або істотна абмежавалі выкарыстанне петардаў і феерверкаў падчас святкавання Новага года.

Паводле інфармацыі італьянскіх СМІ, улады Балонні, Пескары, Сіены, Палерма, Бары і шэрагу іншых гарадоў цалкам забаранілі выкарыстанне піратэхнікі ў навагоднюю ноч, прыстрашыўшы парушальнікаў штрафамі да 500 еўра. У Вероне падпальваць феерверкі нельга на адлегласці менш за 200 метраў ад бальніц, школ, у грамадскіх месцах, а таксама ў выпадку прысутнасці паблізу жывёл. Чакаецца, што забарона петард і феерверкаў будзе ўведзена і ў Мілане. Там гэтая ініцыятыва звязана ў першую чаргу з барацьбой са смогам, які ў апошні месяц стаіць над горадам з прычыны адсутнасці дажджоў.

Падобныя рашэнні адміністрацый італьянскіх гарадоў падтрымліваюць арганізацыі па абароне жывёл. Актывісты-зоаабаронцы выступілі з заклікамі зусім забараніць петарды і феерверкі, паколькі шматлікія выбухі піратэхнікі ў навагоднюю ноч, паводле іх слоў, з'яўляюцца «сапраўдным катаваннем» для жывёл.

А вось у Венецыі ад светлавога і шумавога суправаджэння сустрэчы 2016 года адмаўляцца не збіраюцца, паколькі гэта абавязковая частка запланаванага свята. На плошчы Сан-Марка ў адным з самых рамантычных гарадоў Італіі ў першыя хвіліны Новага года адбудзецца традыцыйны «Пацалунак апоўначы» — сотні закаханых пар абмяняюцца зацяжным пацалункам на фоне ўражлівага феерверку над Гранд-каналам.

### ...І НІ Ў ЧЫМ САБЕ НЕ АДМАЎЛЯЙ

Ва ўмовах крызісу большасць замежных кампаній, незалежна ад сферы дзейнасці, некалькі ўразаюць свае выдаткі. Аднак так робяць далёка не ўсе, і некаторыя аддаюць перавагу не эканоміць на супрацоўніках, а гуляць на поўную катушку, пакуль ёсць магчымасць.



Паводле ацэнак экспертаў індустрыі забаў, адным з самых гучных карпаратываў 2015 года стала святкаванне 20-годдзя транснацыянальнай кампаніі сеткавага маркетынгу Tiens Group — яе ўладальнік, кітайскі мільярдэр Лі Цзіньюань, зладзіў раскошнае свята для 6,4 тысячы сваіх супрацоўнікаў. Святкаванне адбылося ў Парыжы, а ў праграму ўвайшлі наведванне Эйфелевай вежы, прыватная экскурсія па Луўры, спектакль у «Мулен Руж», шопінг у «Галерэі Лафает», а потым паездка на Блакітны бераг. Для карпаратыву давялося забраніраваць... 140 гатэляў у Парыжы, Манака і Канах і 147 аўтобусаў. Увогуле мільярдэр выклаў за карпаратыў каля 20 мільёнаў еўра.

Пераплюнуць кітайскага бізнесмена па размаху здольны хіба што топ-менеджары медыякампаніі Yahoo. Па інфармацыі, якая трапіла ў прэсу, нягледзячы на значную страту даходаў кампаніі, тут вельмі любяць ладзіць карпаратыўныя вечарынкі: так, калектыўная фотасесія ў стылі «Чараўніка з краіны Оз» абышлася Yahoo каля $70 000. Прыкладна столькі ж каштаваў запіс відэаroліка «Watch Me (Whip / Nae Nae)» да святочнай вечарыны ў кампаніі. Кіраўніцтва медыягіганта, зрэшты, каментаваць гэтыя лічбы адмовілася.

### ЁЛАЧКА, ГАРЫ ЭКАНОМНА!

Па даных аналітычнай арганізацыі «Цэнтр глабальнага развіцця» (Center for Global Development), за час калядных і навагодніх свят на ілюмінацыю ў ЗША ідзе больш электраэнергіі, чым многія краіны, якія развіваюцца, спажываюць за цэлы год. Пры гэтым, аднак, менавіта ад апошніх патрабуюць скарачаць спажыванне энергіі і пераходзіць на аднаўляльныя крыніцы, што, на думку даследчыкаў, даволі некарэктна.

Так, хоць на долю ўпрыгажэнняў прыпадае ўсяго 0,2% сукупнага аб'ёму энергіі, выдаткаванай у ЗША на працягу года, лічба дасягае 6,6 мільярда кілават-гадз. Гэтага дастаткова, напрыклад, для сілкавання 14 мільёнаў халадзільнікаў. А некаторым краінам гэтага хапае на 12 месяцаў: у прыватнасці, для Сальвадора гадавое спажыванне складае 5,35 млрд кілават-гадз., для Эфіопіі — 5,3 млрд, для Танзаніі — 4,8 млрд, для Непала — 3,28 млрд. Самай «эканомнай» стала Камбоджа з 3,06 млрд кілават-гадз. за цэлы год.

Вынікі даследавання заснаваны на інфармацыі Міністэрства энергетыкі ЗША і ААН за 2008 год, аднак аўтары падкрэсліваюць, што да 2015 года аб'ёмы спажывання энергіі не знізіліся, гэта значыць, што высновы актуальныя і ў нашы дні.

### АЎСТРАЛІЯ ЗАПАЛІЛА РЭКОРД

Сусветны рэкорд па колькасці калядных агнёў на штучнай ёлцы пабіты ў Аўстраліі. На святочным дрэве, усталяваным у Канберы, засвяцілі 518 838 святлодыёдных лямпачак.

Ілюмінацыя была ўрачыста ўключана яшчэ ў канцы лістапада ў прысутнасці гараджан, а таксама афіцыйнага прадстаўніка Кнігі рэкордаў Гінеса, які пацвердзіў новае сусветнае дасягненне. Папярэдні рэкорд складаў 374 000 лямпачак. Дрэва дасягае ў вышыню 21 метра; яго вяршыню ўпрыгожвае 1,5-метровая зорка, якая зіхаціць 12 000 агнямі.

Упрыгожваннем рэкордна яркай каляднай ёлкі займаўся мясцовы энтузіяст Дэвід Рычардс пры дапамозе архітэктараў, інжынераў, дызайнераў і валанцёраў усіх узростаў. Дарэчы, у 2013 годзе Рычардс разам з сям'ёй устанавіў рэкорд па найбольшай колькасці калядных гірлянд ва ўласным доме: будынак, унутраныя памяшканні і двор былі аформлены 502 165 лямпачкамі.

### НЕ СПАДАБАЛАСЯ — ПРАДАЙ

Не паспела Еўропа адзначыць Каляды, як гандлёвая пляцоўка накшталт eBay застракацела аб'явамі аб продажы непатрэбных падарункаў. У прыватнасці, як піша французскае выданне «Le Figaro» са спасылкай на даследаванне Opinionway, кожны другі француз (52%) гатовы прадаць неўпадабаны падарунак. Толькі за мінулы год аб'ёмы продажаў непатрэбных падарункаў у Францыі ацэньваюцца ў 359 млн еўра.

У параўнанні са сваімі еўрапейскімі суседзямі, французы пазбаўляюцца ад нежаданых падарункаў хутчэй. Паводле прагнозу Opinionway, продажы на eBay дасягнуць максімуму ўжо 7 студзеня — гэта на два тыдні раней, чым летась. А вось па сярэдняй цане выстаўленага на продаж падарунка лідзіруюць аўстрыйцы — 57 еўра.

Па даных eBay France, самымі нежаданымі падарункамі для французаў з'яўляюцца гальштукі і рабочыя інструменты. Следам ідуць навушнікі, чахлы і іншыя аксесуары для мабільных тэлефонаў, на трэцім радку — сувеніры і калекцыйныя прадметы. Многія таксама імкнуцца расстацца з кнігамі і коміксамі. Звычайна гэтыя прадметы выстаўляюць на продаж па цане, на 15—20% ніжэйшай за рынкавую.

Як адзначаюць прадстаўнікі eBay, сёння многія ўжо не хаваюць, што перапрадаюць частку калядных падарункаў. Калі раней гэта лічылася чымсьці непрыемным, то цяпер стаўленне да перапродажы непатрэбных рэчаў мяняецца. Многія расстаюцца з нежаданымі падарункамі, каб выдаткаваць атрыманыя грошы на нешта патрэбнае.

### СНЕГАВІК НА СЛУЖБЕ НАВУКІ

Навукоўцы з Бірмінгемскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) зрабілі нанаснегавіка, які каталізуе расшчапленне вады з мэтай атрымання вадароду.

Малюнак снегавіка, якога можна разгледзець з дапамогай электроннага мікраскопа, складзены з кластараў плацінавых наначасціц на падкладцы з аксіду тытану. Кожны 5-нанаметровы плацінавы кластар складаецца з 30 атамаў, а ўвесь малюнак снегавіка — прыкладна з 1680 атамаў тытану і 180 атамаў плаціны.

Уключэнне атамаў тытану дазваляе эканоміць каштоўную плаціну ў працэсе сінтэзу і перашкаджае агламерацыі наначасціц. Акрамя таго, сітаватая абалонка дазваляе атаму вадароду пранікаць скрозь структуру і працаваць як каталізатар для рэакцыі выдзялення вадароду.

### КАЛЯДНАЯ ПАНЧОХА ДЛЯ ВОЛАТА

У амерыканскім горадзе Феетвіл прадставілі самую вялікую ў свеце калядную панчоху. Вага святочнага вырабу — амаль 730 кг, плошча — каля 715 кв. м. Як пажартаваліназіральнікі, Санта-Клаусу спатрэбіцца значна больш аленяў, каб прывезці дастатковую колькасць падарункаў для такой панчохі.

Над вырабам працавалі вязальшчыкі з 50 амерыканскіх штатаў і чатырох канадскіх правінцый, а таксама Ірландыі. Пражу для святочнага вырабу прадаставіла кампанія Caron



United. Гэтае прадпрыемства ахвяравала частку даходу з продажаў пражы на стыпендыі для дзяцей загінулых амерыканскіх вайскоўцаў.

### СВЯТА ДЛЯ СЛАНОЎ

Пакуль у краінах Старога і Новага свету рыхтуюцца навагоднія гулянні і маршыруюць парадамі Санта-Клаусы і іншыя казачныя персанажы, азіяты знаходзяць іншыя падставы для свята. Так, у непальскім пасёлку Саўраха ў раёне Чытван на днях фінішаваў традыцыйны, 12 па ліку, штогадовы фестываль сланоў. Сярод яго этапаў — слановы этап, гонкі на гіганцкіх жывёлах, а таксама скокі на валах і спецыяльны «пікнік на сланах», для якога было падрыхтавана некалькі тон рознай садавіны.

Акрамя таго, сярод заяўленых 127 сланоў — удзельнікаў спаборніцтваў — арганізатары фестывалю правялі спецыяльны конкурс прыгажосці. Па выніках першага этапу суддзі адабралі 5 жывёл, сярод якіх у некалькі этапаў вызначалі самую прыгожую.

Фестываль сланоў з'яўляецца традыцыйным мерапрыемствам для Непала, яго арганізуюць прадстаўнікі мясцовай асацыяцыі гатэляў. Мэта мерапрыемства спрыяе развіццю турызму ў рэгіёне, а таксама павышэнню дасведчанасці турыстаў пра абарону дзікай прыроды.

**Іван КУПАРВАС.**



# З НОВЫМ ГОДАМ!



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2.** «З Новым годам, што крыніцай// Новай пойдзе ў пераходзе,// Беларуская ...!//Беларускі наш народзе!» З верша Я. Купалы «З Новым годам!». **5.** Нават ... не можа справіцца са зграяй малпаў *(кітайская прык.)*. Паводле ўсходнеазіяцкага календара, 2016 год — год вогненнай Малпы, які пачынаецца 6 лютага. **7.** «У бары//Пад Новы год//Звяры// Ладзяць ....//Глянь,//Паўсталі цесна ў круг//Лань,//Вавёрка і Вяпрук». З верша В. Верабей «Карагод». **8.** Пісьмо. **9.** ... і піхта. Калядныя дрэвы ў краінах Скандынавіі. **11.** Узор, малюнак, выразаны на цвёрдых матэрыялах. **12.** Чырвоны агонь у печы і ... гарაць з трэскам — да маразоў *(прыкм.)*. **13.** ... на Раство — будзе ўраджайны год *(прыкм.)*. **14.** Укрыццё для стральбы. **17.** Старажытнае земляробчае свята. **19.** Здробненае мяса. **20.** Цяжкасці, якія сустракаюцца на жыццёвым шляху *(перан.)*. **21.** ... пад акном зімой зачырыкае — чакай адлігі (прыкм.). **24.** ... — як кветка, а муж — шкарпэтка (прык.). **25.** Святы агонь у язычнікаў. **26.** Пачуццё ласкі, замілавання. **27.** Маладзік ... задраў — на пагоду *(прык.)*. **28.** Неачышчаны воск.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Агульная згода па спрэчных пытаннях, уменне дасягаць яе. **3.** «Ну і ... — аж нос зрывае!//А як на ўсходзе чырвань грае!» З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («На рэчцы»). **4.** Чысціня маральных адносін. **5.** Зямля — ...: што пакладзеш, тое і возьмеш *(прык.)*. **6.** Камандзір роты. **7.** Заглыбленне ў гарах, утворанае пад уздзеяннем ледавікоў і снежнікаў. **10.** Прылада для сячэння. **15.** Дэталь у кампрэсарах, рухавіках унутранага згарання. **16.** «Сняжыначкі — ...// Ляцелі матылькамі». З верша Зм. Бядулі «Сняжынкі». 18. «Як на ... саджуся,//Ліха з горачкі качуся.//Хай ад снегу белая,//Затое дужа смелая». Зімовая прыпеўка. **20.** Юлій ... . Старажытнарымскі палкаводзец, пісьменнік, дзяржаўны і палітычны дзеяч, які нарадзіўся ў год Малпы. **21.** «Ёлку везлі нам на ...//Белы зайка і жаўна.//Як прывезлі ёлку ў хату,//Стала ёлачкай яна». З верша С. Сокалава-Воюша «Ёлка». **22.** Калі б ... раслі на дрэвах, большасць жанілася б на малпах *(афрыканская прык.)*. **23.** Іржа. Тое ж.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:
**Па гарызанталі:** 2. Зямліца. 5. Тыгр. 7. Карагод. 8. Ліст. 9. Сасна. 11. Разьба. 12. Дровы. 13. Снег. 14. Акоп. 17. Спас. 19. Фарш. 20. Церні. 21. Снягір. 24. Жонка. 25. Зніч. 26. Пяшчота. 27. Рогі. 28. Вашчына.
**Па вертыкалі:** 1. Кансэнсус. 3. Мароз. 4. Цнота. 5. Талерка. 6. Ротны. 7. Кар. 10. Сякера. 15. Клапан. 16. Пушыначкі. 18. Саначкі. 20. Цэзар. 21. Свята. 22. Грошы. 23. Ржа.

# РАМЁСТВЫ РОДНЫЯ НАТХНІЛІ




**На карпаратыўным календары, выдадзеным рэдакцыяй газеты «Гомельская праўда», — выявы прыгожых жанчын у беларускіх строях. Мадэлі трымаюць у руках традыцыйныя прадметы беларускага побыту, значэнне якіх становіцца зразумелым з каментарыяў-тлумачэнняў.**

Напрыклад: «Рубель — плоскі драўляны брусок з ручкай, якім пралі (білі, рублі) бялізну пры мыцці, тканіну пры адбельванні, выкарыстоўваўся і для прасавання. У Беларусі вядомы з XI—XII стагоддзяў». Усе здымкі зроблены фотакарэспандэнтам газеты Алегам Белавусавым, які даўно і з захапленнем збірае фотакалекцыю на тэму народных рамёстваў. Дарэчы, яму пазіравалі не прафесіяналы, а людзі, якія самі з'яўляюцца ці то музейнымі супрацоўнікамі, ці то выраблююць нейкія прыгожыя рэчы ў традыцыйных беларускіх тэхніках, ці то граюць на музычных інструментах.

Як расказаў галоўны рэдактар «Гомельскай праўды» Сяргей Бяспалы, гэта не першы зварот да тэмы народных беларускіх традыцый. Летась каляндар быў прысвечаны гісторыі народных свят, у будучыні таксама плануецца расказваць пра Беларусь у маляўнічых выявах. А каб усім было зразумела, што такое, напрыклад, кош, бойка, біцьцы або калаўрот, тлумачэнне даецца на абедзвюх дзяржаўных мовах.

— Мы думаем, што будзем працягваць друкаваць календары на такія тэмы, — адзначае рэдактар выдавецкага аддзела прадпрыемства «Рэдакцыя газеты «Гомельская праўда» Алена Аленчанка. — Магчыма, налета гэта будуць народныя касцюмы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.29 | 16.57 | 7.28 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.39 | 7.13 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.46 | 7.27 |
| Гомель — | 9.07 | 16.52 | 7.45 |
| Гродна — | 9.42 | 17.13 | 7.31 |
| Брэст — | 9.34 | 17.22 | 7.48 |

**Месяц**

*Поўня 25 снежня*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

***Пр.** Зоі, Марка, Міхаіла.*
***К.** Ларысы, Багуслава, Віктара, Паўла.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Новы год — гэта калі тата спрабуе пераканаць сваіх дзяцей у тым, што ён Дзед Мароз, а сваю жонку — што ён не Дзед Мароз.**

— У халадзільніку нічога не чапай. Гэта на Новы год.
— Дык там і няма нічога.
— Там надзеі на светлую будучыню і шашлычны кетчуп.

**«Дарагі Дзядуля Мароз! Можа, давай у гэтым годзе грашыма, а?»**

— Усё, першага студзеня іду ў спартзалу!
— Яна першага студзеня не працуе.
— Непарадак, і ў гэтым годзе таксама не працавала. Так я ніколі не пачну займацца спортам!

ПРОДАЕМ
СЕТКА-РАБИЦА от производителя – 155 000 рублей;
ТЕПЛИЦА 3 410 000 рублей;
СТОЛБЫ 91 500 рублей;
ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ
БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 12 960 000 рублей;
АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 1 350 000 рублей
ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней
Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.
УНП 391802438

**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 5 студзеня 2016 года.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 5104.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12